ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 20 (2651) • Пятніца, 18 мая 1973 года • Цана 8 кап.

Гэтымі днямі, калі ў Маскве праходзіць IV з'езд мастакоў нашай краіны, кожны творца—жывапісец, скульптар, графік, майстар дэкаратыўна-прыкладнога жанру з яшчэ большай энергіяй дбае пра тое, як апраўдаць вялікае давер'е Камуністычнай партыі, усяго савецкага народа, як у новых буйных творах найбольш поўна і глыбока адлюстраваць вобраз сучасніка, будаўніка новага грамадства, чалавека камуністычнага заўтра.

Тэма рабочага класа — галоўная тэма савецкага мастацтва. Яму — класу-стваральніку і барацьбіту—прысвячаюць свае лепшыя работы і мастакі Савецкай Беларусі.

М. Моўчан. Сталяары (з серыі «Трактаразаводцы»).

●

В. Ткачук. Апалубшчыкі (з серыі «На будаўніцтве Лукомльскай ДРЭС»).



ПЛЕНУМ
ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА
КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

У Мінску 15—16 мая 1973 года праходзіў X пленум Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі.

На пленум запрошаны сакратары абкомаў КПБ, якія ведаюць пытаннямі арганізацыйна-партыйнай і ідэалагічнай работы, першыя сакратары гаркомаў і райкомаў партыі, кіраўнікі міністэрстваў і рэспубліканскіх ведамстваў, загадчыкі аддзелаў арганізацыйна-партыйнай работы абкомаў КПБ, сакратары ЦК ЛКСМБ, першыя сакратары абкомаў камсамола, рэктары вну, група сакратароў партыйных камітэтаў аб'яднанняў, прадпрыемстваў, вышэйшых навучальных устаноў.

15 мая пленум ЦК КПБ разгледзеў вынікі красавіцкага (1973 г.) Пленума ЦК КПСС па пытанню «Аб міжнароднай дзейнасці ЦК КПСС па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда партыі» і задачы партыйных арганізацый рэспублікі.

З прамовай па гэтаму пытанню выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў.

Па абмеркаванаму пытанню прынята пастанова.

Пленум ЦК КП Беларусі аднадушна адобрыў пастанову Пленума ЦК КПСС, прынятую 27 красавіка 1973 г., палажэнні, ацэнкі і задачы, змешчаныя ў дакладзе таварыша Л. І. Брэжнева «Аб міжнароднай дзейнасці ЦК КПСС па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда партыі».

Пленум ЦК КП Беларусі запэўніў ЦК КПСС і яго Палітбюро, што камуністы, усе працоўныя рэспублікі, натхнёныя рашэннямі красавіцкага Пленума ЦК КПСС, аддадуць усю сілу сваёй ідэйнай перакананасці, веды і творчую энергію барацьбе за далейшы росквіт нашай шматнацыянальнай сацыялістычнай Радзімы і далейшае ўмацаванне яе міжнародных пазіцый.

Удзельнікі пленума ЦК КПБ з вялікім уздымам прынялі і накіравалі прывітальнае пісьмо Генеральнаму сакратару Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза таварышу Леаніду Ільічу Брэжневу, сардэчна павіншаваўшы яго з прысуджэннем міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі».

16 мая пленум абмеркаваў пытанне «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню партыйнага кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі рэспублікі ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС».

З дакладам выступіў другі сакратар ЦК КП Беларусі А. Н. Аксёнаў.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

ВІНШУЕМ!

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Аб прысваенні
тав. ПАНЧАНКУ П. Е.
Ганаровага звання народнага паэта Беларускай ССР

За вялікія заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры прысвоіць тав. **Панчанку** Пімену Емяльянавічу ганаровае званне народнага паэта Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Ф. СУРГАНАЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

14 мая 1973 года,
гор. Мінск.

За шматгадовую плённую работу ў органах культуры і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў дырэктара Дзяржаўнага музея Беларускай ССР Ніну Ігнатаўну Анціпенка Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У Цэнтральным Камітэце КП Беларусі

АБ МЕРАХ ПА ДАЛЕЙШАМУ РАЗВІЦЦЮ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ

ЦК КП Беларусі прыняў пастанову «Аб мерах па далейшаму развіццю выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы».

У пастанове ЦК КПБ адзначаецца, што за апошнія гады выяўленчае мастацтва Беларусі дасягнула пэўных поспехаў. Майстры жывапісу, скульптуры і графікі стварылі шэраг значных твораў рэвалюцыйнай і высокаграмадзянскай тэматыкі, якія адлюстроўваюць самаадданую барацьбу працоўных за сацыялізм, за ўмацаванне магутнасці вялікай Савецкай краіны. З'явілася нямала твораў, якія дапамагаюць правільнаму ідэйна-эстэтычнаму выхаванню працоўных. Выраслі здольныя кадры маладых жывапісцаў, скульптараў і графікаў, майстроў прыкладнога мастацтва. Умацоўваюцца сувязі мастакоў з жыццём, аб чым наглядна сведчаць паказаныя ў апошнія гады шматлікія выстаўкі.

Аднак вынікаючыя з рашэнняў XXIV з'езда КПСС задачы далейшага павышэння ролі літаратуры і мастацтва ў камуністычным выхаванні савецкіх людзей патрабуюць ад майстроў выяўленчага мастацтва рэспублікі яшчэ больш актыўнай работы па стварэнню твораў, значных па думцы, яркіх па форме і мастацкаму ўвасабленню, якія б адпавядалі высокім духоўным запатрабаванням працоўных. Зладжанасць і дакладнасць у рабоце павінны характарызаваць дзейнасць праўлення Саюза мастакоў БССР і яго творчых фарміраванняў. Больш увагі і дапамогі майстрам пэндзля і разца патрабуецца з боку партыйных і савецкіх органаў.

У пастанове намечаны канкрэтныя меры па далейшаму развіццю выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы, значнаму павышэнню яго ролі ў ідэйна-эстэтычным выхаванні працоўных.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі даручыў Саюзу мастакоў БССР сумесна з партыйнай арганізацыяй прыняць меры да паляпшэння выхаваўчай работы сярод мастакоў, павышэння іх адказнасці за сваю творчасць перад народам. Увага майстроў усіх жанраў выяўленчага мастацтва павінна быць накіравана на адлюстраванне самых актуальных праблем камуністычнага будаўніцтва. Мастакі Беларусі закліканы ярчэй раскрываць гераічную працу і духоўнае багацце нашага сучасніка, усёй сваёй творчасцю ўсталёўваць ідэі марксізму-ленінізму, мацаваць брацкую дружбу савецкіх народаў, славіць веліч здзяйснення ў подзвігаў у імя нашай сацыялістычнай Радзімы, выкрываць імперыялізм, мараль і норавы буржуазнага грамадства.

Саюзу мастакоў БССР прапанавана карэнным чынам палепшыць ідэйна-творчае і вытворчае кіраўніцтва прадпрыемствамі Мастацкага фонду БССР, дзейнасцю мастацкіх саветаў прадпрыемстваў фонду.

У пастанове ЦК КПБ падкрэслена неабходнасць усебаковага творчага абмеркавання прымаемых да выканання манументальных і іншых буйных мастацкіх работ кампетэнтнымі і прадстаўнічымі мастацкімі саветамі з удзелам спецыялістаў сумежных галін і грамадскасці. Забаронена збудаванне помнікаў і стварэнне іншых манументальных твораў з недаўгавечных матэрыялаў.

У пастанове вызначаны меры па ўзмацненню творчай дапамогі мастакам прамысловасці і майстрам народных мастацкіх промыслаў, па ўмацаванню кваліфікаванымі кадрамі мастацка-вытворчых прадпрыемстваў рэспублікі. Намечана ў бліжэйшыя гады адкрыць у Наваполацку, Барысаве, Бабруйску, Салігорску, Пінску, Баранавічах, Оршы і Маладэчна салоны-магазіны па продажу твораў выяўленчага і мастацка-прыкладнога мастацтва.

Пастановай ЦК КП Беларусі прадугледжана паляпшэнне выставачнай дзейнасці ў рэспубліцы, паслядоўнае ажыццяўленне задачы рэгулярнага паказу лепшых работ савецкіх мастакоў у сельскіх раёнах, а таксама ў парках культуры і адпачынку, буйных фабрычна-заводскіх клубах, у саўгасах і калгасах.

Міністэрству культуры БССР даручана ажыццявіць меры па ўдасканаленню практыкі дзяржаўных заказаў на стварэнне новых твораў выяўленчага мастацтва, канцэнтруючы сілы мастакоў на самых актуальных і найбольш значных тэматычных напрамках.

Вялікая ўвага ў пастанове звернута на далейшае паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы і бытавых умоў мастакоў.

З мэтай павышэння ідэйна-эстэтычнага ўзроўню афармлення гарадоў і населеных пунктаў выканкомам абласных, гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных прапанавана стварыць камісіі па манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву з прадстаўнікоў мясцовых органаў культуры, архітэктараў, мастакоў і работнікаў сумежных відаў мастацтваў.

Дзяржаўнаму камітэту Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю даручана стварыць у выдавецтве «Беларусь» рэдакцыю, якая займалася б выпускам літаратуры па выяўленчаму мастацтву, у тым ліку манаграфій, альбомаў, каталогаў, буклетаў, плакатаў, паштовак і г. д., павысіць якасць паліграфічнага выканання кніжнай прадукцыі па выяўленчаму мастацтву.

Пачынаючы з 1974 года прадугледжаны штогадовы выпуск зборніка «Выяўленчае мастацтва Беларусі», які будзе асвятляць пытанні гісторыі і тэорыі выяўленчага мастацтва, актуальныя праблемы мастацкага жыцця рэспублікі.

Міністэрству культуры БССР, Белсаўпрофу, ЦК ЛКСМБ, аблвыканкомам, Міністэрству асветы БССР і Дзяржаўнаму камітэту Савета Міністраў БССР па прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі прапанавана распрацаваць і ажыццявіць мерапрыемствы па паляпшэнню работы з самадзейнымі мастакамі, па стварэнню студый выяўленчага мастацтва ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах рэспублікі.

ДЗЁННІК ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Вялікая група беларускіх літаратараў выехала ўчора ў Мазыр. Анатоль Грачанікаў, Ніл Гілевіч, Іван Чыгрынаў, Анатоль Вярцінскі, Яўген Каршукоў, Браніслаў Спрынчан, Леанід Прокша, Леанід Гаўрылкін азнаёмяцца з новабудоўляй пяцігодкі — Мазырскім нафтабудам, сустрэнуцца з рабочымі, наведаюць бібліятэкі.

Тут адбудзецца вялікі літаратурны вечар, які пройдзе пад дэвізам «Пісьменнік і пяцігодка». Удзельнікі сустрэчы пачытаюць свае новыя творы, раскажуць пра творчыя планы, падзеляцца ўражаннямі аб новабудоўлі.

●

Мастацкі савет Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР праслухаў у клавіры музыку новага балета Яўгена Глебава «Ціль Уленшпігель» (лібрэта А. Дадзішкіліяні па матывах вядомага рамана Шарля дэ Кастэра).

У абмеркаванні прынялі ўдзел беларускія кампазітары і музыказнаўцы. Аднадушна была выказана думка, што музыка новага балета—яшчэ адна ступень у творчасці таленавітага беларускага кампазітара.

Садружнасць Я. Глебава з беларускім тэатрам оперы і балета пачалася з яго першага балета «Мара» і працягваецца ўжо шмат гадоў. Плённым аказалася супрацоўніцтва кампазітара з заслужаным дзеячом мастацтваў БССР А. Дадзішкіліяні. Нацыянальныя балеты Я. Глебава «Альпійская балада» і «Выбранніца» адзначаны прэміямі ўсесаюзнага і рэспубліканскага конкурсаў.

Балет «Ціль Уленшпігель» уключаны ў перспектыўны план тэатра. Зараз кампазітар працуе над яго партытурай.

Оперу «Пінская шляхта» паводле камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча піша Г. Вагнер. Творы для тэатра ствараюць і маладыя кампазітары. С. Картэс заканчвае оперу «Джардана Бруна». Д. Смольскі працуе над балетам «Данка». А. Янчанка распачаў работу над балетам, прысвечаным Кастусю Каліноўскаму.

●

Закончыліся здымкі новага поўнаметражнага дакументальнага фільма Беларускага тэлебачання «Жывая ніць». Аўтар сцэнарыя Г. Колас, рэжысёр У. Яфрэмаў, аператар М. Юрэвіч, музыка Ш. Калаша.

Героі стужкі — рабочыя і інжынеры, лабаранты і тэхнікі Магілёўскага завода штучнага валакна.

— Раскрыць складаны духоўны свет чалавека, адлюстраваць чалавечыя характары ва ўсёй шматграннасці, паказаць узаемаадносіны людзей на вытворчасці, — такая задача стаяла перад творчым калектывам, — сказаў нашаму карэспандэнту рэжысёр фільма У. Яфрэмаў. — Нашы героі не толькі добрыя работнікі, яны — выдатныя людзі: чулыя, шчырыя, добразычлівыя.

Складаная і нялёгкая работа над фільмам закончана. Цяпер слова за тымі, для каго ён ствараўся, — за гледачом.

●

У ВІЦЕБСКУ ПАЧАЛІСЯ ГАСТРОЛІ СМАЛЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА. ІХ АДКРЫВАЕ КАМЕДЫЯ В. РОЗАВА «СІТУАЦЫЯ».

Са смаленскім жа гледачом сустрэйся калектыў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.

Творчы абмен двух тэатраў стаў традыцыйным. Віцябляне памятаюць гастролі смаленскіх артыстаў, якія адбыліся два гады назад. Сёлетні рэпертуар, з якім прыехалі смаляне ў Беларусь, амаль поўнасцю абноўлены. Віцебскі глядач убачыць спектаклі: «Гаспадыня гасцініцы» К. Гальдоні, «Жанчына за зялёнымі дзвярыма» Р. Ібрагімбекава, «У добры час» В. Розава і іншыя. Акрамя Віцебска, смаленскія артысты пабываюць у іншых гарадах вобласці.

РАДАСЦІ І ТУРБОТЫ СТАРШЫНІ КАДЛУБОВІЧА

М. ЗАМСКІ

Калгас імя Дзяржынскага. 3366 гектараў сельгасугоддзяў, у тым ліку 2225— ворнай зямлі. Двароў —623. Кошт асноўных сродкаў вытворчасці —2.543. 200 рублёў. Агульны даход —1.819.381 рубель. Чысты прыбытак —576.305 рублёў.

(З калгаснай справаздачы за 1972 год).

У ГОДЗЕ, здаецца, пяцьдзесят сёмым галоўны аграном калгаса імя Дзяржынскага Аляксандр Браніслававіч Бабіцкі атрымаў дзіўнаваты і нечаканы ліст з Рыгі. Пісаў Энгельгарт, з тых самых, некалі вядомых у Расіі Энгельгартаў — буйных памешчыкаў, палітыкаў і вучоных.

Былога старшыню Дзяржаўнай думы, які пасля рэвалюцыі пакалясіў эмігрантам па свеце і ў канцы трыццатых гадоў асеў у Рызе, прымусіў сесці за ліст да Бабіцкага артыкул апошняга ў газеце «Правда» аб шляхах павышэння ўрадлівасці глебы. Аказалася, што паміж думскімі справамі былы барон займаўся яшчэ сельскай гаспадаркай, і яго маёнтак у Магілёўскай губерні быў па тым часе, як цяпер кажуць, высокарэнтабельным.

Энгельгарт падрабязна расказваў, колькі было ў яго зямлі, цягла, кароў, авечак, колькі ўносіў угнаенняў, які меў ураджай. У канцы ліста ён даваў аграному шэраг практычных парад па севазвароту, кампаставанню і ўнясенню ўгнаенняў, травасеянню і г. д.

Помню, Браніслававіч (так звалі ў калгасе агранома), яшчэ раз перачытаўшы ўголас пісьмо ў нас, у раённай рэдакцыі, заўважыў:

— Дзіўна, паўвеку прайшло, а помніць чалавек усіх сваіх авечак. Мо, старэча, і зараз у снах бачыць сябе памешчыкам? Дзіўна, дальбог, дзіўна. А наконт парад, дык што ж...

Тут Бабіцкі ўзлез на любімага канька. Быў ён зацятым прыхільнікам травапольнай сістэмы і мог пра яе гаварыць гадзінамі.

Калгас імя Дзяржынскага не толькі сеяў шмат канюшыны, але займаўся яе насенняводствам, меў з гэтага немалую карысць, бо па канюшыннае насенне сюды прыязджалі «купцы» з усёй рэспублікі.

Не забыць мне, мабыць, ніколі, як аднойчы з-за гэтай самай канюшыны схапіліся загрудкі аграном са старшынёй. Я прыйшоў на самы скандал і спачатку не мог зразумець, што да чаго. Пасля ўжо Браніслававіч расказаў. Аказалася, напярэдадні прыбег да яго брыгадзір і, выцягнуўшы з кішэні пук ссохлых галовак насеннікаў канюшыны, з якіх пачынала ўжо сыпацца ядранае насенне, папрасіў:

— Давайце хутчэй, Браніслававіч, камбайн з падборшчыкам. Не ўбяром заўтра, асыплецца гэткае золата.

Бабіцкі загадаў перакінуць камбайн. Хтосьці расказаў пра гэта старшыні. Цяпер той старшыня нябожчык ужо, і нядобра гаварыць благое пра нябожчыка, ды і зрабіў ён за свой век нямала для калгаса, але з песні слова не выкінеш — быў старшыня чалавекам ганарыстым і ўпартым, чужую ініцыятыву ўспрымаў як знявагу. Прыбег ён да канторы, як падсмалены. Тут, на двары, у прысутнасці дзесятка калгаснікаў пачаў сварыцца з аграномам.

У шасцідзесятым годзе, калі пачалася кампанія супраць травапольных севазваротаў, давялося Бабіцкаму перажыць нямала цяжкіх дзён. На сходах, у газетах прозвішча яго іначай не ўпаміналася, як у пары з мянушкай — травапольшчык. І калі прыйшоў загад заараць шматгадовыя травы, Браніслававіч паклаў старшыні заяву аб звальненні. Не мог чалавек сябе пераламаць.

Узялі ў калгас іншага агранома. Такога, што ўсякі загад кідаўся выконваць з першага слова. Сказалі б садзіць на гэтай зямлі бананы, садзіў бы...

З вясны 1962 года я не быў у тых мясцінах. І калі зараз, праз адзінаццаць гадоў, прыехаў сюды, адразу пацікавіўся, ці жывы-здаровы Бабіцкі. Сказалі, што даўно на пенсіі, а са здароўем так сабе...

І вось сядзім мы ў невялікім пакоі аграномавай кватэры і ўспамінаем, успамінаем... Браніслававіч, да слова, не вельмі змяніўся. Такі ж прамы, высокі, касцісты. Тыя ж іранічныя, колеру ільняной кветкі вочы, гучны голас. Праўда, толькі сівы зусім стаў, ні чарнінкі ў валасах.

Паспрабаваў падняцца з канапы, зморшчыўся ад болю, схапіўся рукой за паясніцу. Нягнуткімі нагамі прайшоўся па пакоі:

— Не ходзяць, браце, ногі мае...

Слухаю і робіцца мне сумна. Успамінаю, як гойсаў некалі аграном па палях. Калі на кані, калі і пехатою. Так, усё ў чалавека да пары...

Захацелася зрабіць яму прыемнае. Кажу, што ў калгасе шануюць былога агранома, удзячны яму за парады. Твар Бабіцкага святлее.

— Ну, якія там парады. У іх з канюшынай пару год нешта не ладзілася. Пасеюць, а ўсходы — каліва даганяе каліва. Прыйшлі да мяне, я ж (звузіў вочы) стары травапольшчык. Так, маўляў, і так, Браніслававіч, падкажыце. Распытваю, што за поле, як рыхтуюць насенне, сеюць. Аказваецца, без баронак сеялі. З-за гэтага яно, насенне, зверху заставалася. Каб яшчэ дажджы, дык мо прарасло б, а то, як на тое ліха, вёсны сухія выдаліся... Зрабілі, як параіў. Дык такая, паверыш, канюшына вырасла, што летась на адным полі ячмень пад сябе падабрала.

Кожны сапраўдны чалавек пакідае пасля сябе трывалы след. След, пакінуты Бабіцкім, бачны і сёння. У калгасе даюць свой плён уведзеныя ім севазвароты. І кампосты, што кожную зіму з краю ў край засцілаюць арцельныя палеткі, складаюць і зараз асобым, ачаговым спосабам, які ў свой час прапанаваў ён, Бабіцкі. І поўныя кармушкі канюшыннага сена (пры мне хлапчына-скотнік, узяўшы з кармушкі жменю канюшыны, ад якой ішоў густы мядовы дух, паднёс яе да твару, шумна ўцягнуў носам паветра і, смеючыся вачыма, вымавіў: «Эх, сам бы з'еў, ды каровам трэба») — таксама рэха яго, былога агранома, турбот.

Я пра ўсё гэта нагадаў таму, што, ўзышоўшы на новую прыступку, мы часам забываем пра тых, хто гэтую прыступку ладзіў... Вось чаму першыя старонкі свайго расказа пра калгас я прысвяціў Аляксандру Браніслававічу Бабіцкаму.

ЛЯЖЫЦЬ на далоні пшанічнае зернетка. Маленечкае, здаецца, зусім без вагі. А кінь зернетка ў зямлю і адбудзецца ў ім цуд, такі знаёмы і звычайны, і ўсё ж такі сапраўды цуд. Праклюнецца зернетка, пусціць зялёны парастак і праз колькі часу выкіне колас. Толькі які ён будзе той колас — пуставаты ці важкі?

Вось праблема, над якой б'ецца чалавецтва тысячы гадоў. Расшчапіў чалавек атам, вынайшаў лазер і электронна-вылічальную машыну, а звычайнае зернетка не вельмі даецца ў рукі. Ні ў якой з навук не было, мабыць, такой калатні думак, нідзе так не хапаліся за чубы, як у аграрнай. Нідзе не было зроблена столькі «адкрыццяў», якія выдаваліся за панацэю ад усіх бядот, як тут. Жывыя ў нашай памяці і монакультуры, і абавязковыя квадратна-гнездавыя пасадкі бульбы, і цудадзейныя роставыя рэчывы з нафты і г. д. Толькі не зрушылі яны возу з месца. Але ж зараз нешта зрушыла? Калгас імя Дзяржынскага сёння збірае ў два з паловай разы больш збожжа, у два — бульбы, у столькі ж—гародніны, чым 8—10 гадоў назад.

Зразумела, павялічыць ураджай з пяці цэнтнераў да дзесяці — невялікае дзіва. Бо пяць цэнтнераў, гэта і не ўраджай — гора адно. Але скокнуць з 15 да 35 цэнтнераў, прама скажам — здорава! Тое самае з бульбай. Летась сабралі яе па 203 цэнтнеры супраць 107 у 1961 годзе.

...З мясцовым старшынёй Леанідам Іванавічам Кадлубовічам стаім на ўскрайку ладнага палетка, на якім ідзе сяўба яравой пшаніцы.

Толькі што агрэгат заправіўся насеннем і цяпер паціху пыліць у процілеглы край поля. Кідаю ў зямлю сваё зернетка і я. Успамінаю, што некалі не раз быў на гэтым полі. Чым яно сёння не такое? Такая ж пульхная, добра ўскалыхнутая цёмна-карычневая ралля (у калгасе скрозь суглінкі). Не рукамі — трактарамі сеялі і тады. Чаму ж маё зернетка сёлета дасць у два-тры разы больш важкі колас? А мо сапраўды нечага не ведаў шаноўны Аляксандр Браніслававіч Бабіцкі? Мо дарма лічылі яго адным з лепшых аграномаў на Міншчыне?

Увечары таго ж дня сустрэўся я з Іванам Забіяшавічам Нупрыкам. Іван Забіяшавіч, фігура, можна сказаць, легендарная, і пра яго варта расказаць падрабязней. У калгасе ён з дня арганізацыі — недзе з дваццаць дзевятага ці трыццатага года. Брыгадзірам быў яшчэ да вайны, у 1940 годзе нават удзельнічаў ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Калі пачалася вайна, атрымалася, што Нупрык застаўся ў калгасе за галоўнага і з прыходам акупантаў так распарадзіўся калгаснай маёмасцю (пахаваў па людзях), што гітлераўцам засталася дуля з макам.

Асабліва славілася імя Івана Забіяшавіча ў шасцідзесятых гадах. Медаляў з выстаўкі ў яго — не пералічыць. На нейкае свята, помню, сустрэў, дык вочы заплюшчыў ад бляску, што ішоў ад Нупрыкавых грудзей.

Росту Іван Забіяшавіч вышэй сярэдняга, хударлявы, твар смуглявы, цыганаваты, на буйным носе нязменныя круглыя акуляры. Норавам ён ціхі, але, як некалі казалі ў калгасе, «прынцыпіяльны».

Бывала, таго-сяго брыгадзіра цанілі толькі за глотку — у каго мацнейшая, той, значыцца, за справу бярэцца лепш. Але ніколі ніхто не чуў, каб на каго ўзвысіў голас Нупрык. Усё паціху, усё па згодзе. А была ягоная брыгада лепшай у раёне. У тыя, ой, нялёгкія гады, збіраў Іван Забіяшавіч па 14—15 цэнтнераў збожжа, ды 150—160 бульбы. Па тым часе — дай бог!

Некалькі гадоў назад выйшаў Нупрык на пенсію, але калгаса не кінуў, папрасіўся ўчотчыкам-нарміроўшчыкам у трактарную брыгаду.

— Дык, кажаш, не тая зямля стала ў калгасе? — Іван Забіяшавіч здымае акуляры і доўга выцірае іх насоўкай. — Зямліца тая і людзі тыя самыя. Ды стратэгія змянілася, адносіны змяніліся. Помню, гадоў некалькі назад — я яшчэ брыгадзірам быў, — разнеслася чутка, што на станцыю прывезлі аміячную салетру. Па разнарадцы калгасу нешта тон дзесяць прыпала. А што яны, дзесяць тон, на дзве тысячы гектараў зямлі? Дык быў у мяне крыху знаёмы кладаўшчык на той станцыі. Дамовіўся я з ім (за паўлітра, вядома), што дасць нам сабраць паскробкі. Уначы, каб іншыя не апярэдзілі, паехалі мы на станцыю пяццю параконкамі ды тоны з дзве той салетры напалам са смеццем ухапілі. Колькі радасці было! А зараз? Зараз калгас гэтых угнаенняў сотнямі тон атрымлівае. А аміячнай вады? Колькі яе выліваецца пад пасевы, дык і не злічыш. Ці дзіва, што зямля па-іншаму радзіць пачала. Цяпер паглядзім на справу з другога боку. — Нупрык падсунуў да сябе лічыльнікі і адбіў дзве касцяшкі. — Чым мы раней вывозілі на палі ўгнаенні? Коньмі. Паспрабаваў аднойчы папрасіць у старшыні трактар, дык ён так вызверыўся, — не рады быў, што і гаворку пачаў.

— Або ўзяць тую ж бульбу, — працягваў Іван Забіяшавіч. — Усё рабілі коньмі. Коньмі садзілі, коньмі абганялі, коньмі капалі. Як пачыналася ўборка, дык цягнулася без канца. А колькі бульбы заставалася ў зямлі — не паспявалі перакапаць з-за ранніх прымаразкаў. А зараз знайдзі каня і на бульбяным палетку! Не тое, што капаць, — варыць бульбу развучыліся рукамі. Вунь, зірні (Нупрык паказаў у акно, за якім бачны быў стан машынна-трактарнай брыгады) на тыя дзве жоўценькія машыны. Здагадайся, на што яны?

— Не ведаю,—шчыра прызнаўся я.

— Вось і я не мог уцяміць спачатку. Думаў, — усміхнуўся, — нейкая атамная ўстаноўка. Аказалася, што яшчэ мудрэйшая, дальбог. Бульбу перапрацоўвае. Падвязуць да яе бульбачку проста з поля, як ёсць — з зямлёй, з граззю. Машына гэту бульбу адмывае да чыстага, становіцца кожная бульбіна, што тое яечка. Потым варыць яе, таўчэ, затым тую таўчанку закладвае ў абліцаваную траншэю. Там яе закрываюць плёнкай і прысыпаюць зямлёй. Захоўваецца тая бульбяная каша колькі хочаш. Трэба — узяў. Леташняй восенню такога шорэ нарыхтавалі для ферм больш за 700 тон. Я нядаўна для цікавасці паспы-

[Працяг на 14-й стар.].

СПАДЧЫНА ФАЛЬКЛАРЫСТА

ІМЯ П. ШЭЙНА ў гісторыі беларускай дарэвалюцыйнай фалькларыстыкі стаіць побач з імёнамі такіх буйных збіральнікаў і публікатараў вуснай народнай творчасці, як Е. Раманаў, У. Дабравольскі, М. Нікіфароўскі і М. Федароўскі. Яго фундаментальная праца ў трох тамах і чатырох кнігах «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края» (1887—1902) і зборнік «Белорусские народные песни» (1874) не страцілі сваёй навуковай каштоўнасці і сёння.

Аднак да апошняга часу ў нас не было ні навуковай біяграфіі Шэйна, ні аб'ектыўнай ацэнкі яго багатай фальклорна-этнаграфічнай спадчыны.

Манаграфічнае даследаванне ленінградскага вучонага М. Новікава аб жыцці і дзейнасці Шэйна запаўняе важную старонку ў гісторыі не толькі беларускай, але і рускай фалькларыстыкі, бо Шэйн унёс таксама вялікі ўклад у збіранне і публікацыю рускай народнай творчасці. М. Новікаў упершыню склаў поўную бібліяграфію прац Шэйна і літаратуры аб ім. Вялікай заслугай даследчыка з'яўляецца тое, што ён плённа выкарыстаў багаты архіў Шэйна, які захоўваецца ў Ленінградзе ў АН СССР, у выніку чаго змог падаць усебакова творчае аблічча збіральніка, паказаць яго светапогляд, грамадскія і палітычныя пазіцыі, літаратурныя і навуковыя погляды, метады і прынцыпы збіральніцкай практыкі, гісторыю стварэння і надрукавання зборнікаў і г. д.

Даследчык крок за крокам прасочвае пачатак жыццёвага шляху Шэйна, выяўляе акалічнасці, якія абумовілі выбар ім менавіта фальклорна-этнаграфічнай дзейнасці. Асаблівы ўплыў на маладога Шэйна, адзначае М. Новікаў, аказаў Ф. Мілер — паэт, перакладчык Гётэ, Шылера, Гейнэ і інш. Мілер захапляўся вуснай народнай творчасцю і паводле фальклорных матываў напісаў шэраг твораў. Праз Мілера Шэйн зблізіўся з некаторымі маскоўскімі літаратарамі, што групаваліся вакол вядомага ў свой час паэта Ф. Глінкі (дарэчы, аўтара папулярных рускіх народных песень «Вот мчится тройка удалая» і «Не слышно шуму городского...»). Тут і сфарміраваліся эстэтычныя і грамадскія погляды Шэйна. Гэтыя «густы і звычкі,— піша Новікаў,— уласцівыя арыстакратычна-панскаму асяроддзю, і ўносілі ў яго ацэнку прыгожага ў літаратуры і мастацтве не грамадскія, а чыста асабістыя суб'ектыўныя моманты».

Мы лічым, што даследчык тут знайшоў адзін з «ключыкаў», які дапамагае нам правільна зразумець не толькі погляды Шэйна наогул, але і ўбачыць вытокі прынцыпаў, якімі кіраваўся збіральнік пры адборы матэрыялаў для сваіх фальклорна-этнаграфічных зборнікаў.

Падоўгу жывучы ў памешчыцкіх сем'ях у якасці выхавальніка панскіх дзяцей і маючы магчымасці пазнаёміцца з жыццём сялян, Шэйн глядзеў на працоўнага чалавека вачыма пана, не здольны быў «адчуць увесь цяжар прыгоннай залежнасці і падпявольнай працы». Вёска яму малявалася «шчаслівай аркадыяй». Гэта і абумовіла тую лінію, якой кіраваўся Шэйн у сваёй далейшай дзейнасці.

Супрацоўнічаючы ў часопісе «Развлечение» ў канцы 50-х гадоў, Шэйн, як заўважае Новікаў, у сваіх рэцэнзіях на новыя творы мастацкай літаратуры адштурхоўваецца ад норм дваранскай эстэтыкі, працягвае знаходзіць «сапраўдную паэзію» толькі ў тых творах, ад якіх, па яго выказванню, «вее духам душэўнай раскошы і прымірэння». І тое, што ў вялікага рускага крытыка В. Бялінскага выклікала рэзка адмоўную ацэнку (напрыклад, паэзія Э. Губера), Шэйну здавалася сімпатычным. Дробны разначынец, густа замешаны на дваранскай заквасцы, Шэйн зблізіўся з асяроддзем маскоўскіх вучоных, літаратараў і пісьменнікаў — В. Бадзянскім, А. Хамяковым, С. Аксакавым, М. Пагодзіным, М. Максімовічам, М. Паўлавым, М. Бергам, С. Шавыровым — з людзьмі відныімі, але далёкімі ад рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху.

У святле сказанага робіцца зразумела, чаму такі махровы манархіст і шавініст, як папячыцель Віленскай вучэбнай акругі І. Карнілаў, запрасіў у 1865 годзе Шэйна заняць месца выкладчыка нямецкай мовы ў Віцебскай гімназіі.

Менавіта ў віцебскі перыяд жыцця Шэйна ў гротаўскіх «Чтениях» у Маскве пачалося друкаванне яго шматгадовай працы — «Русские народные песни» (праз два гады яна была выдадзена асобнай кнігай). Асабістыя перакананні складальніка, падкрэслівае Новікаў, наклалі сваю адзнаку на песенны зборнік, у выніку сюды не трапілі творы з вострай класавай тэматыкай, з матывамі сацыяльнай барацьбы і пратэсту.

Маючы па ўвазе гэтыя аспекты дзейнасці фальклярыста, мы паўней зразумеем, хто ў асобе Шэйна прыступіў у Паўночна-Заходнім краі да шырокага збірання і друкавання народнай творчасці беларусаў. І калі да ўсяго гэтага дадаць уласныя прызнанні Шэйна пра тое, што ён распачаў сваю работу, не ведаючы беларускай мовы і таго, што ўжо былі выдадзены да яго фальклорныя зборнікі Гільтэбранта, Насовіча, Дзмітрыева і Бяссонава, то стане зразумела, што нават пры самых добрых намерах збіральніка таілася ў яго рабоце вялікая небяспека маральных і навуковых страт.

У Віцебску Шэйн стварае сетку карэспандэнтаў. Яна пераважна складалася са студэнтаў старэйшых класаў гімназіі, дзе збіральнік выкладаў рускую мову і літаратуру. У выніку неўзабаве ў руках Шэйна аказалася багатая калекцыя беларускіх народных песень, якую пазней ён надрукаваў асобным зборнікам.

Дарэвалюцыйныя рэцэнзенты свядома ці несвядома не адзначылі, што ў зборніку «Беларускія народныя песні» асабліва выразна выявіліся антыдэмакратычныя настроі збіральніка. Беларускага селяніна Шэйн лічыў «пакорлівым, маўклівым, загнаным і безнадзейна аблытаным усемагчымымі абрадамі і прымхамі».

Самым буйным зборнікам Шэйна з'яўляюцца «Материалы...». Гэта каштоўная крыніца звестак па самых розных галінах навукі — этнаграфіі, фальклярыстыцы, мовазнаўству, гісторыі, сацыялогіі і г. д. Але на падставе дакладнага аналізу — зверкі рукапісаў, дасланых карэспандэнтамі, і рэдактарскай праўкі, зробленай складальнікам, М. Новікаў дакладна ўстанавіў, што Шэйн як складальнік абыходзіўся з фальклорнымі творамі ў вышэйшай ступені адвольна, надчас не грэбаваў і фальсіфікацыяй.

Новікаў услед за акадэмікам Я. Карскім папярэджвае, што шэйнаўскія «Материалы...» у навуковых мэтах трэба выкарыстоўваць «умела і асцярожна», строга крытычна.

Для нас, хто зараз працуе над 30-томнікам беларускага фальклору, гэта добрая і своечасовая парада.

Апошні раздзел манаграфіі прысвечаны карэспандэнтам Шэйна. Збіральнік амаль нічога не расказаў пра сваю армію (звыш 500 чалавек!) верных і адданых памочнікаў. Гэта дзякуючы іх бескарыслівым і самаадданым намаганням па збору вуснай народнай творчасці і былі створаны манументальныя працы Шэйна.

Даследаванне Новікава вылучаецца выключнай навуковай добрасумленнасцю. І ўсё ж пры чытанні манаграфіі ўзнікае ўражанне, што недзе за межамі даследавання засталося нямала цікавых звестак.

На нашу думку, было б вельмі карысна, калі б была выдадзена асобнай кнігай уся эпісталярная спадчына Шэйна. Манаграфія ж Новікава пра Г. Шэйна — прыкметны ўклад у савецкую фальклярыстычную навуку.

Іван ЦІШЧАНКА.

М. Новікаў. «Павел Васільевіч Шэйн». Мінск, Выдавецтва «Вышэйшая школа», 1972.

КРОК У СТАЛАСЦЬ

Лагарыфмы і рыфмы яго захаплялі аднолькава. У абласной газеце, бадай, не было ніводнай літаратурнай старонкі, дзе б не друкаваліся вершы студэнта фізіка-матэматычнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута Віктара Ракава. Пасля заканчэння інстытута ён некаторы час выкладаў фізіку і матэматыку ў сельскай школе. У 1968 годзе В. Ракаў выдаў сваю першую кніжку «Вернасць». Працаваў тады малады паэт у Шклоўскай раённай газеце.

Кожная камандзіроўка ў калгас ці саўгас — гэта новая сустрэча з людзьмі, спатканне з роднымі прасторамі. І паэт пісаў пра гэта артыкулы, нарысы, вершы, ёміста выказваючы ў іх свае пачуцці і думкі.

Сапраўды, для вершаў В. Ракава ёмістасць думкі ў пэўнай меры якасць уласцівая. Пагартаем яго новую кніжку вершаў «Акно ў зялёны сад», якая выйшла летась, зазірнем разам з ім у яго акно:

...У твар дыхне світанне пругкай хвалай,
Свежа, і бадзёра, і чутно,
Як гамоняць цягніні у далях.

«Акно» В. Ракава, пэўна, не па першым паверсе, бо бачыць паэт з яго даволі далёка, бачыць нямала і перш за ўсё нешта раней не заўважанае, калі параўнаць яго новую кнігу з першым паэтычным зборнікам «Вернасць».

Лепшыя вершы В. Ракава строгія, дысцыплінаваныя, роўныя, а таксама шматзначныя. Ён піша пра сваё «зялёнае Прысожжа», пра родныя краявіды, маці, маладосць. Такія вершы, вядома, ёсць у кожнага паэта-лірыка, але голас В. Ракава гучыць своеасабліва, гаворыць ён пеяк па-свойму. Узяць хоць бы гэтыя радкі:

Як толькі крыгаход канчаецца,—
На лугавінах за палеткамі
Ці то ў трывозе б'ецца чаіца,
Ці, можа, песня ў яе гэткая.

І далей:

Не ныла б сэрца, як прыеду я
У край, дзе ўзрос, дзе юнь пітаецца:
Сную матуля непаседаю—
Як тая чаіца...
Як тая чаіца...

Вобраз маці атрымаўся яркім і абаяльным. Майстэрства адчуваецца ў вершах «Васілёк», «Дворышчаў прывычныя прыкметы»... Паэту дорага ўсё, што звязана са святым імем маці-Радзімы:

Мне б той крыніцы пакланіцца,
Каб знаў, дзе б'юць яе ключы,
Што шчодра так дала напіцца
Любві да родных далячынь.

Асаблівай увагі заслугоўваюць радкі, якія адрасуе паэт вёсцы. Яны вабяць сваёй лірычнасцю, напеўнасцю.

В. Ракаў усё больш і больш імкнецца да сюжэтнага верша і асабліва ў творах, напісаных на тэму вайны. Гэта — «Песня пакалечаных бяроз...», «Неданошаныя кашулі», «Не паспеў прыгледзецца...» і іншыя, у якіх малююцца жахлівыя сцэны ваеннай пары.

Добрае слова хочацца сказаць пра лірычную паэму В. Ракава «Я — «Рубін»! Прыём!..». Яна — аптымістычная, жыццесцвярджальная. Галоўны герой паэмы — малады лётчык Валодзя Уараў. Аўтар надзяляе яго вялікай душэўнай прыгажосцю, маральнай чысцінёй, бясстрашшам, гераізмам.

Паэт прымушае хвалявацца, непакоіцца і радавацца. Дзейныя асобы паэмы трапляюць у самыя вострыя сітуацыі. Як і характары, так і паводзіны іх неаднолькавыя. Адны — моцныя духам, мужныя сэрцам. Хоць і не заўсёды ў жыцці такіх людзей, як сцвярджае В. Ракаў, бываюць удачы, хоць за імі па пятах ходзіць рызыка — яны заўсёды застаюцца людзьмі. І, наадварот, часовае мяшчанскае шчасце нікога з іх не прываблівае .

Псіхалагічныя канфлікты ў паэме напружаныя, даведзеныя да драматызму. Герой паэмы думае і разважае па-дзяржаўнаму, чыста сваіх інтарэсаў для яго не існуе. Гэта думка гучыць асабліва выразна. Яна мае глыбокі грамадзянскі і сацыяльна-палітычны сэнс.

Мова паэмы жывая, вобразная. Адчуваецца, што аўтар шмат папрацаваў над гэтым творам.

Вядома, можна было б пагаварыць і пра недахопы, іх таксама не пазбег В. Ракаў у новай кнізе. Некаторыя яго вершы нагадваюць па зместу папярэднія. Вось прыклад. І ў першай і ў другой кнігах ёсць вершы пад назвай «Дзяды». Яны амаль нічым не адрозніваюцца. Толькі ў адным варыянце В. Ракаў называе старых палітыкамі, у другім — мудрацамі...

Увогуле ж, зборнік В. Ракава «Акно ў зялёны сад» сведчыць, што паэтычны голас яго мацнее, што яро шукае новыя, сапраўдныя радкі.

Рыгор ЯУСЕЕЎ.

В. Ракаў. «Акно ў зялёны сад». Мінск. «Мастацкая літаратура», 1972.

КАБ НЕ ЗАВЯЛА

НОВАЯ КНІЖКА Міколы Маляўкі — «Лотаць» падкупляе лірычнасцю назвы. Лотаць — і адразу прыгадваецца сонечны луг, бязмежная прастора святла, неба, і недзе на блакітным беразе азярца гэтая прыгожая кветка, якая грэла не адно чалавечае сэрца, якая хвалявала, абуджала ў душы самыя тонкія і шчырыя пачуцці.

Знаёмлюся з кніжкай, перачытваю вершы, удумваюся ў радкі, імкнуся зразумець: куды, у які свет выведзе мяне лірычны герой паэта? Прыходжу да пэўнай думкі, ведаючы два папярэднія зборнікі Міколы Маляўкі «Едуць маразы» і «Жалеза», якія славілі цвёрдасць і духоўную чысціню чалавека працы, неслі ў сабе веру ў людзей, дабрату, шчырасць,— збіўся паэт з узятага раней кірунку, магчыма, не хапіла дыхання на гэты «наступны» рубеж, таму што нешта згублена ў вершах, як падалося, нешта страчана. Няма таго напружання, той упартасці, таго гарту...

І ўсё ж... «Лотаць» — жывая душа паэта, якая ўбірае ў сябе і святло, і неабсяжную прастору, і вялікі клопат за людзей, за іх надзённыя справы. «Лотаць» — жыццё, паэт асэнсоўвае яго, часам па-новаму, з вышыні сталасці, глядзіць на свет, спасцігаючы яго складанасці, пераглядваючы свой душэўны запас. Магчыма, таму для яго «бывае і боль дарагі», таму ён і «вачам сваім не верыць, а рэчы пробуе на зуб», таму ёсць у яго «спакоі выток неспакою другіх...». Па-ранейшаму галоўнае для Міколы Маляўкі — клопат аб чалавеку, раскрыццё светапогляду сучасніка. І вельмі цёпла, па-юнацку праніклёна піша ён у раздзеле «Жывіца» пра свае працоўныя будні, пра будні свайго аднагодка. Паэт шчыра прызнаецца ў вершы «Пярэдні край»:

Хаваюцца птушкі, алені,
А мы не здаёмся, стаім
На эстакадзе маленькай —
Пярэднім краі сваім.

Раздзел «Жывіца» ўдаўся аўтару. Ён нібыта з'яўляецца працягам яго другой кніжкі, працягам аднойчы абранай тэмы чалавечай працы. Тут паэт пазбаўлены псеўдаканкрэтнасці. І гэта добра. Напружанасцю, запалам вылучаюцца вершы «Лаўрэаты», «Жывіца», «Я ветру сустрэчнаму рады», «Часцей з'яўляецца патрэба...».

Лірычны герой паэта знайшоў сваё месца, знайшоў яго на лесасплавах, сярод лясных баракаў, сярод «зялёнага шуму», які грэе сэрца паэта, таму што ён «дасюль з цішынёю ў саюзе не быў».

Знаёмімся з другім раздзелам кнігі — «Лякарства». У ім ёсць добрыя па сваёй шчырасці, цеплыні, любві радкі да роднай зямлі, да незабыўных мясцін дзяцінства. Варта адзначыць вершы «Каласок», «З родных ніў і лясоў», «Дажджы», «Блакітнае святло — у чорным лісці»...

У гэтым жа раздзеле паэт узнімае тэму непераможнасці нашага народа, яго сілы і моцы.

І сёння продкаў вешны голас
Жыве ў былінах, фарбах, гліне:
«Хто прыйдзе к нам з мячом у госці,
Той першым ад мяча загіне!» —

гаворыць паэт у вершы «Продкі». Ён надае асаблівы сэнс наведванню маладымі Вечнага агню («Маладыя ля Вечнага агню») і з затоеным болем просіць зямлю:

Непрыкметна назад
Павярні па арбіце —
Ад бамбёжак,
Галодных бланад,
Брацкіх магіл у жыце.
(«Я Зямлю папрасіў»).

М. Маляўка. «Лотаць». Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.

УСІМ СМЯРЦЯМ НАЗЛО

Гадоў шэсць назад мне трапілася ў рукі невялічкая кніжачка пад назвай «Мёртвыя застаюцца жывымі». Прозвішча аўтара, змешчанай у ёй аднайменнай аповесці яшчэ нічога не гаварыла мне як чытачу. Аднак адчувалася, што Уладзімір Фядотаў валодае пэўным мастацкім уменнем абагульняць жыццёвыя факты, з'явы, выбіраць з іх самыя асноўныя. І яшчэ прыемна было, што аўтар ведаў жыццё не па кніжках: ён сам падлеткам прайшоўся па нялёгкіх дарогах вайны. На жаль, сваёй першай кніжкі аўтар не ўбачыў. Пра гэта, праўда, я даведаўся пазней. Усяго за некалькі дзён да выхаду з друку кнігі не стала Фядотава, журналіста, чалавека мужнага і сумленнага. Засталіся толькі шчырыя, прачулыя радкі, якія пісаліся болем сэрца.

Сёння, калі знаёмішся з новым творам пісьменніка — аповесцю «Сорак дзён», якую ён закончыў за тыдзень да сваёй смерці, міжволі адчуваеш, што яна — аўтабіяграфічная. У вобразе хворага журналіста лёгка ўгадваецца сам аўтар. Гэта ён быў расстраляны паліцаямі і выпадкова застаўся жывым. Гэта ён пакутаваў доўгія гады пасля вайны, але працягваў жыць усім смярцям назло.

У аповесці «Сорак дзён» аптымізм Фядотава-пісьменніка яшчэ больш узмоцнены. Сітуацыя — амаль трагічная: шэсць чалавек замест адпачынку праводзяць доўгія сорак дзён у лячэбнай палаце. Кожны з іх разумее, што ягонае жыццё вісіць, як кажуць, на валаску. Але прыслухаемся да размоў Чухніна, які памёр праз некалькі дзён; затаіўшы дыханне, прасочым за расказамі аб франтавым жыцці Рубана, і адчуем, што гэта вельмі і вельмі цудоўныя людзі.

Аптымізм кожнага з іх не беспадстаўны, хоць кожны разумее трагічнасць свайго становішча. Але, заўважым, трагічнасць, ды не трагізм. Гэтыя людзі жывуць. Няхай пакуль яны абмежаваны сценамі пакоя (адна палата на ўсіх), але ўнутраны свет — шырокі, цудоўны. У думках кожны далёка адсюль. Цікавыя яны вядуць размовы аб самім жыцці, аб яго надзённых праблемах. Бы ў калейдаскопе, ажываюць успаміны кожнага, і неяк адразу святлеюць позіркі, загараюцца сэрцы. За звычайнымі на першы погляд біяграфіямі раскрываюцца моцныя натуры.

Пісьменнік валодае добрым уменнем сінтэзаваць першапачатковыя ўражанні. З асобных назіранняў, з успамінаў суседзяў па палаце ўзнікаюць цікавыя вобразы. Горда гучыць аўтарскае прызнанне: «Але, мабыць, тым і моцны чалавек, што яго цікавіць не смерць, а жыццё. Любоў да жыцця не можа забіць ніякі боль».

Безумоўная аўтарская ўдача — вобраз Паўзухіна. Ён — чалавек вельмі і вельмі супярэчлівага характару, складанага лёсу. Аўтар паступова раскрывае нам яго душу. Вось даведваемся, як гераічна вёў сябе ён у першыя дні вайны, і глядзім на яго як на героя. Але ж аказваецца, што праз некалькі дзён той жа Паўзухін застрэліў маладзенькага афіцэра, бо западозрыў яго ў здрадзе, хоць на гэта і не было падстаў. І мы Паўзухіна ўжо ненавідзім. Ды неяк даруем яму і гэта, калі становіцца вядома, што Паўзухін ніколі не вылечыцца, бо хварэе белакроўем. Пісьменнік і тут не адыходзіць ад жыццёвай праўды, паказваючы складанасць чалавечых характараў, непаўторнасць жыццёвых лёсаў. За ўсімі гэтымі перыпетыямі — само жыццё з яго радасцямі і клопатамі, з трывогамі і спадзяваннямі. У. Фядотаў паказвае яго без спрашчэння, але разам з тым і без прыхарошвання.

Апошнія радкі гэтай невялічкай аповесці таксама аб жыцці, аб яго прадаўжэнні: «...А жыццё ішло сваім парадкам. Блакітным было мірнае неба, свяціла сонца, ласкава лашчылася аб берагі мора... І ўсяму гэтаму не было аніякай справы ні да шостай палаты, ні да шасці хворых, у чыіх параненых сэрцах скрозь дзесяцігоддзі адклікалася крываваe рэха вайны». Уладзімір Фядотаў пасля сябе пакінуў добры след. І хоць уклад яго ў літаратуру сціплы, аповесці яго застануцца ў сэрцах шматлікіх чытачоў.

Р. ПРАТАСЕВІЧ,
ваеннаслужачы.

Ул. Фядотаў. «Сорак дзён». Аповесць. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1973.

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура»: «Памяць» Б. Сачанкі (мастак А. Салькоў), «Васілінка з Царскай Веткі» А. Ус (мастак Ю. Пучынскі), «Па талым снезе» В. Карамазава (мастак Г. Грак).

ПРА РЫФМЫ

Заўвагі на палях

КАЛІСЬЦІ Пушкін прадракаў, што з часам паэты будуць пісаць белыя вершы, бо рыфмаў у мове малавата. Ды гэта ж Аляксандр Сяргеевіч казаў, што «Лета шалуньюю рифму гонят». А ці ж нам векаваць маладымі? Сталасць прыходзіць неспадзявана. Не паспееш аглянуцца, а ўжо новыя вершы перабіраюцца ў пазалочаныя томікі выбраных твораў... Няма часу сядзець і мудрагеліць над новымі рыфмамі. Ці варта, кажучы мовай сучаснасці, праграміраваць свой інтэлект незлічонай колькасцю звонкіх канчаткаў для пявучых вершаваных радкоў? Возьмем для прыкладу першы том выбраных твораў Сяргея Грахоўскага (Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1973). Паэт скупымі прыгаршчамі рыфмаў, не баючыся паўтораў, змог скалыхнуць душу і сэрца чытача.

Так пачыналася дарога
У новы дзень, у новы **свет,**
Хоць я тады зусім нічога
Яшчэ не ўмеў рабіць як **след.**
Стар. 18.

І ўжо праз некалькі строф паэт гаворыць аб выніках падарожжа:

Так пачыналася дарога
У новы дзень, у новы **свет.**
Я не цураўся анічога,
Каб на зямлі пакінуць **след.**
Стар. 19.

У іншых гэта падарожжа было нялёгкім:

І дзень і ноч
Не ўстые дарога
Ад босых ног
І ад гаручых слёз—
За следам след,
Ад роднага парога
За следам **след,**
За возам воз.
Стар. 54.

Але ж і іншыя падарожнікі, як піша паэт, дасягалі сваёй мэты:

Усе мае сучаснікі і продкі
Пераўначвалі і узвышалі **свет**
І пакідалі доўгі ці кароткі,
Але заўжды жывы і ясны **след.**
Стар. 68.

Іншы раз на некалькі хвілін паэт аглядаўся на пройдзены шлях і не зусім упэўнена паглядаў наперад:

Вецер колкаю іглицай
Засцілае белы **свет,**
Толькі б з тропу мне не збіцца,
Не згубіць адзіны **след.**
Стар. 163.

А дарога наперадзе была страшнай і непрыветнай:

Сыкае сухімі языкамі,
Засцілае снегам белы **свет,**
Шчэрыцца халоднымі іклыкамі,
Следам замятае свежы **след.**
Стар. 171.

Але ўсё ж чалавек дасягае сваёй мэты, паэт сцвярджальна і пераканаўча заяўляе:

Па-мойму, не,
Па-мойму, ў **свет**
Вядзе заўжды ягоны **след.**
Стар. 180.

Яшчэ многа разоў карыстаецца паэт рыфмай «свет—след» і доказна, паэтычна падкрэслівае яе невычарпальныя магчымасці.

Каля ста ўзораў рыфмы «век—чалавек», «трывогі—дарогі», «дарогі—ногі» можна сустрэць у першым томе твораў Сяргея Грахоўскага. І гэта звонкая рыфма не прыглушае меладычнасці і музычнасці рытму, не зацямняе яснасці думкі.

І не лянуйся, бо не праца
Укараціла бацькаў **век.**
Пачнеш вучыцца і старацца,
Глядзіш—і выйдзе **чалавек.**
Стар. 18.

Гэта рыфма можа перадаць думку і тых, хто не дакрануўся да кнігі:

Расхлістаны, бадзяўся па марозе
Мурзаты трохгадовы **чалавек**
І думаў, што жывуць усе ў дарозе
І што ваююць людзі цэлы **век.**
Стар. 57.

Вайна і дарога стамляла і губіла чалавека, але ж:

Жыла, звінела песня з веку ў **век**
У сцёку, ў халады і на прадвесні,
Бо ў радасці і ў горы **чалавек**
Ужо і дня не мог пражыць без песні.
Стар. 88.

І не толькі песня, а настойлівая праца прыносіла духоўнае і матэрыяльнае задавальненне чалавеку:

Ганчарны круг без перадышкі
Гудзе, імчыцца з веку ў **век,**
І кожны дзень з яго гладышкі
Здымае добры **чалавек.**
Стар. 142.

Рыфма, як бачыце, акаймавала вялікую філасофскую думку, што не толькі багі могуць ляпіць гаршкі.

Часамі аўтар кідаецца ў роздум аб лёсе чалавека:

Кароткі век у **чалавека,**
А ўсё ж такі завецца век.
Адзін задоўга да **паўвека**
Ужо сядзіць сярод калек.
Стар. 182.

Іншы раз, тут трэба аддаць даніну праўдзе, жыццё зацямняецца непрадбачанымі хмаркамі:

Па плошчы галубы снавалі,
Ішоў панары **чалавек,**
І дзіўна, як суіснавалі
Касмічны і мінулы **век.**
Стар. 268.

Гэта ж рыфма пры неабходнасці можа быць і ўзнёслай:

Хай свята дружбы лепшым будзе святам,
Хай векам дружбы наш завецца **век,**
Хай другу друг заўсёды будзе братам
І другам—чалавеку **чалавек.**
Стар. 355.

Паэт Сяргей Грахоўскі часта бывае ў дарозе, таму няма нічога дзіўнага, што рыфмы «дарогі—трывогі» таксама густа ўсеялі том паэзіі.

І сэрца не заные без **трывогі,**
Без дабраты не знойдзеш уначы
Крутое незнаёмае **дарогі,**
Каб чалавеку ў горы памагчы.
Стар. 24.

За навальніцамі—спакой і ціша,
За радасцямі—халадок **трывог.**
З нас кожны ўсё жыццё паэму піша
На скрыжаваннях сцежак і **дарог.**
Стар. 53.

Усіх адна цікуе непазбежнасць —
Дарога карацейшая з **дарог,**
Дзе забяспечаны спакой і незалежнасць
Без мітусні, без гора і **трывог.**
Стар. 77.

І яшчэ больш чатырох дзесяткаў разоў паўтарае гэту рыфму паэт... Яе жывучасць, меладычнасць і вастрыня моцна ашчарэпліваюць змест, проста, а разам з тым мудра перадаюць глыбокую думку і пацвярджаюць, што паэту не патрэбна карпатліва збіраць разнастайныя рыфмы. Трыма—чатырма званамі добры аматар можа вызваніць заклік і трывогу, боль і роздум, плач і шчасце. Таму ці варта праграміраваць сваю памяць незлічонай колькасцю рыфмаў і гэтым замарудкваць свой поступ у імклівым развіцці паэзіі?

Станіслаў ШУШКЕВІЧ.

ЛОТАЦЬ...

Такім чынам, мы зноў вяртаемся да раней вызначанага... Тэма роднай зямлі, тэма мірнага існавання — усё тая ж жыццёвая рэчаіснасць, гэтыя канкрэтныя, хвалюючыя кожнага рэчы... Яны ўдаюцца паэту, не выбіваюцца з яго «асноўнай» песні. Але ці заўсёды гэтая песня дастаткова энергічная, гучная, напоўненая вялікім жыццёвым зместам? На жаль, не.

Мы сустракаемся ў вершах не толькі з «перапевамі» даўно знаёмых тэм, але ж і з неарыгінальным іх вырашэннем. Вельмі ўжо часта нагадвае аўтар чытачу пра дзяцінства (несалодкае, як і ў большасці яго аднагодкаў), пахі, водары родных мясцін... Але ці не занадта паэт ужо захапляецца тым, што некалі пакінуў усё гэта? Кожны чалавек з'яўляецца гаспадаром свайго лёсу, сам выбірае свой жыццёвы шлях і ці патрэбна тут залішняе шкадаванне? Ці не варта было больш глыбей заглянуць у жыццё сучаснай роднай вёскі, заўважыць, якія змены адбыліся ў ёй? Можа тады б не было такой сумнай, песімістычнай «споведзі» («Залатая рыбка»):

Усё жыццё — знаходкі, страты,
І мы не бачым, як штодзень
Бяднее свет стракаты
На рукі,
Фарбы,
Светацень...

Ці ж павінен паэту «свет» здавацца «бедным», тым больш «на рукі», калі лепшыя вершы зборніка прысвечаны якраз гэтым гарачым, працоўным рукам? Такія радкі насцярожваюць, таму што цяжка пагадзіцца і з наступным вершам Міколы Маляўкі «Есць дар здзіўляцца ў нашых душах, ды трацім мы яго самохаць». Такое прызнанне, што аўтар траціць «дар здзіўляцца» — не ў ягоную карысць, мякка кажучы. Каму ж, як не яму адкрываць цікавае ў свеце, дзівіцца кожнай праяве яго, кожнаму ўсходу сонца, тым цудоўным зменам, якія адбываюцца на нашай зямлі, таму прагрэсу, які рухае наша жыццё наперад!...

Сустракаецца ў вершах і неахайнасць адбору паэтычных сродкаў, часамі паэт губляе належны густ. Дарэчы будзе прыгадаць тут верш «Кот»:

...Ізноў адлівае суседка
Кату сырадою з вядзерца.
Жанчына выходзіць у сенцы,
А я дапіваю астатні...

Трэці раздзел кнігі Мікола Маляўка назваў «Мацярык». Гэта—«таямніца таямніц» паэта. Тут ён датыкаецца да самых дарагіх пачуццяў свайго лірычнага героя, узнімае тэму кахання.

Уражваюць сваёй непасрэднай настраёвасцю вершы «Плотачка», «Пярсцёнак», «Вясёлка». І хоць, часам, паэт не да канца «выліваецца» ў вершах, яшчэ штосьці прытойвае, нібыта баіцца «заспяваць» у поўны голас, саромеецца свайго пачуцця, радкі вершаў «Ты паўтарыся яшчэ раз», «Мацярык»—кранаюць. Але менавіта ў гэтым раздзеле, як мне здаецца, не зусім да месца вершы «Дыялог», «Мікіта», «Ліверная каўбаса». Яны не адпавядаюць ні настрою, ні асноўнаму зместу кніжкі.

У цэлым жа зборнік вершаў пакідае ўражанне дваістасці: з аднаго боку, аўтар імкнецца пашырыць тэматыку, паглыбіцца ў змест, пазбавіцца традыцыйнасці, з другога ж, настолькі загрузае ў аднастайнасці паэтычнага радка, настолькі звужае сваё светаўспрыманне, што часам толькі і застаюцца адны бляклыя ўспаміны, якія «слёзна» апяваюцца ў вершах...

Думаецца, каб да адбору вершаў і аўтар, і рэдактар паставіліся больш патрабавальна, то кніжка ўспрымалася б значна лепш.

Р. БАРАВІКОВА.

Пятрусь МАКАЛЬ

ТАБЕ, БАЦЬКОЎСКАЯ ЗЯМЛЯ

Агнём хрышчоны, кулямі апеты,
Цябе, мой край, пазнаю і здаля:
Лісток кляновы на баку планеты,
Любоў і боль — бацькоўская зямля.
Будзь блаславёны кожны твой куток,
Прастор былінны ад Дзвіны да Сожа,
І Белавеж, і Нарач, як глыток,
Што наталіць тугу па моры можа.
І цытадэль над Бугам, дзе ў сінечы
Нясе паданні дымная вада
Аб тым, як тут налегла нам на плечы
Вялікая айчынная бяда.
І купка ўдоў-сасёнак на пагорку,
Куды мой бацька;дзіўны чалавек,
Стаміўшыся шукаць у небе зорку,
Як у падполле, адышоў навек.
І бель садоў, што слепіць вочы ўночы,
І бусел, што клякоча над гняздом...
Зямля, куды пясчынкаю аднойчы
І я вярнуўся, як у родны дом.
Даруй, што я дагэтуль не паспеў
Табе прызнацца, каб усе пачулі.
І ці сыны клянуцца нараспеў
У пачуцці да ўласнае матулі?
Хоць быў з табой і ў шчасці, і ў журбе,
Я не ўзлятаў на той таропкай хвалі,
Дзе, як наперагонкі, рыфмавалі
Сваю любоў грыбную да цябе.
Хіба аздобіш родную зямлю
Зіхотным словам, як партрэт аправай?
Сваёю кожнай чалавечай справай
Хачу сказаць табе сваё «люблю».

МІНЫ

Амерыканскім мінёрам у В'етнаме.

Якія ў вас на тварах міны,
Які агонь душу пячэ,
Калі здымаеце вы міны,
Што ўчора ставілі яшчэ?
Згубіў ужо свае правы
Пірацтва вопыт непатрэбны —
Здымайце сорам той ганебны,
Якім сябе пакрылі вы.
Тут смерць, што дрэмле ў глыбіні,
Бабахнуць можа ў міг адзіны.
Як кажуць, пры благой гульні
Не зробіце вясёлай міны...
Заслон варожасці і зла,
Які вы ўзводзілі старанна,
Паў ад народнага тарана —
Вы бачыце, чыя ўзяла?
Праз джунглі грому і метала
Дарогай горкіх ран і страт
У час даходзіў, што б ні стала,
Да друга друг, да брата брат.
Хто там употайкі яшчэ,
Люляючы вайны ўспаміны,
На сцежках згоды ставіць міны,
Сіло для новай змовы тчэ?
Давайце поле душ праполем
Ад зла былога спакваля,
Каб непраходным мінным полем
Не стала заўтра ўся зямля.
Хай адступае небяспека
На трасах сушы і вады,
Каб чалавек да чалавека
Ішоў бязбоязна заўжды!

●

Я свой былы спакой раскалышу,
Я спакушу сябе прыходам свята.
Хай прымушае трапятаць душу
Чаканне свята,
як чаканне свата.
Будзь блаславёны шчодры той парыў,
Разбег таго шчаслівага азарту,
Калі здаецца ўсё, што ты стварыў,
Не больш, як пачатковы крок да старту.
Трыумфу шчасця непазбежны цуд
Ужо змятае з небасхілу хмары.
Не, на яго я не малюся тут —
Ляплю па ўзору чалавечай мары.
Маёй удачы птушка не ўцячэ,
І я пакутам палявання рады.
Усе мае ўрачыстыя парады
Наперадзе, наперадзе яшчэ.
Хіба не нам гадуюць свята будні?
Каб наталіць тугу па вышыні,
Ты па-зямному пакланіся студні,
Вядром з яе сузор'е зачарпні.
І лёс людзей, і рэчышча падзей
Акрэслівай натхнёна і чаканна
Сваім святлом, як добры чарадзей.
Высокае напружанне чакання.

РЭДАКЦЫЯ атрымала ліст ад вучня 7-га «В» класа 35-й сярэдняй школы г. Гомеля Міхася Арцёмава. Ён піша:

«Я нядаўна прачытаў кнігу Алеся Шашкова «Навальніца спее ў цішыні». Кніга мне вельмі спадабалася, гэта — аповесць пра Вялікую Айчынную вайну, пра сумесныя дзеянні разведчыкаў Савецкай Арміі і беларускіх партызан.

З захапленнем чытаеш пра гераічныя подзвігі беларускіх партызан, камсамольцаў. Вельмі спадабаўся мне партызанскі разведчык Мікола Скакун, які змагаўся і загінуў як сапраўдны герой.

Кніга заканчваецца тым, што разведчыкам і партызанам удалося ажыццявіць адказную і рызыкоўную аперацыю па перапраўцы грошай і каштоўнасцей на Вялікую Зямлю.

Вельмі хочацца даведацца пра далейшы лёс герояў рамана, капітана Крамнёва і іншых. Прашу перадаць пісьменніку просьбу маю і маіх сяброў-чытачоў Гомельскай абласной бібліятэкі, расказаць на старонках вашай газеты, ці не мяркуе ён напісаць працяг той кнігі, якая нам так падабаецца».

Рэдакцыя адрасавала просьбу юных чытачоў Алесю Шашкову. Пісьменнік перадаў рэдакцыі ўрывак з другой кнігі рамана. Яна будзе называцца «Ноч на Высокай выспе». Прапануем увазе чытачоў урывак з другой кнігі рамана Алеся Шашкова.

Алесь ШАШКОЎ

ВЫСОКАЯ

...РАБОЧЫ СТОЛ, стрэльба і вуда даўно прывучылі Васіля да адзіноты. Ён мог тыднямі не выходзіць з кватэры, забываючыся пра ўсё на свеце. Мог некалькі дзён запар блукаць па лесе ці сядзець у лодцы, спаць там, дзе яго сустракала ноч. Адзінота ніколі не прыгнятала яго, ён прымаў яе, як радасны і прыемны дар.

А вось сёння, апынуўшыся на выспе, што згубілася ў нетрах Ціхаланьскіх лясоў, у надзейным, трывалым бліндажы,—засумаваў. І нават не сум, а цяжкая туга раптам агарнула яго сэрца.

Што ўстрывожыла, што вывела яго з раўнавагі? Шкадаванне, што не пашанцавала паляцець разам з сябрамі? Ці, можа, думка пра тое, што не ўдасца адшукаць партызан, выбрацца з гэтых бяскрайніх лясоў? Не, ні тое, ні другое яго не трывожыла. З сябрамі ён сустрэнецца потым, а партызан адшукае, бо прыкладна ведае, дзе яны будуць.

Вярэдзіла сэрца нешта зусім іншае. Яно, гэта нешта, узнікала ў самай глыбіні душы і, нарастаючы, усё цяжэй і цяжэй навальвалася на сэрца, прымушала яго балюча і прыкра ныць.

Сашчапіўшы за спіной рукі, Крамнёў цяжка ступаў па «адсеку», думаў, але былі тыя думкі бязладныя, уроскід. Яны нагадвалі шматгалосы гоман, якім поўніцца цесны пасажырскі вагон у час шумнай хапатлівай пасадкі.

Нарэшце, яму надакучыла хадзіць, абрыдла разблытваць думкі, і ён, адшукаўшы ў цемры лесвіцу, падняўся наверх, на выспу.

Была ўжо ноч. Поўня, белая і чыстая, як адпаліраваная медная міска, стаяла проста над выспай.

Прыслухоўваючыся да цішыні, да трывожнага стуку ўласнага сэрца, Крамнёў асцярожна пераходзіў ад адной варонкі да другой. Ён яшчэ не разумеў, чаго шукае, але ўпарта ішоў усё далей і далей, напружана прыглядаючыся і прыслухоўваючыся.

І раптам спыніўся. Перад ім зеўрала глыбокая яма, з якой тырчалі пасечаныя асколкамі бярвенні.

«Зямлянка радыстка!...» Крамнёў уздрыгнуў. Ён бачыў глыбокую яму, вывернутыя, пасечаныя асколкамі бярвенні, залітыя густым мёртвым святлом. Нясмела ступіў на край ямы, зірнуў уніз.

І тут, у адно нейкае імгненне, Васіль зразумеў, адкуль узялася тая туга, той невыказны сум. Яна тут, маладая радыстка, яго першае каханне. Вось пад гэтым, знявечаным бомбай бярвеннем. Каля маленькага акенца стаяў яе столік. На ім—радыёстанцыя. А вунь ля той сцяны, што насупраць уваходу, быў ложак. Не ложак, а звычайныя нары, але як былі яны па-жаноцку дагледжаныя, прыбраныя!..

Дзе напаткала Соню смерць? У час адпачынку? Ці за рабочым сталом, калі яна перадавала шыфроўку ў Цэнтр пра тое, што брыгада акружана? І няўжо яна так і застанецца тут, у гэтым разбітым бліндажы, пад гэтым ламаччам? Не! Ён зараз жа возьме рыдлёўку і раскідае гэта пасечанае асколкамі бярвенне. А потым пахавае яе на беразе ракі пад маладымі бярозамі, якія так падабаліся Соні заўсёды...

Месяц яшчэ не схаваўся—пачало ўзыходзіць сонца. Чыстае, дбайна вымытае халоднай расою, яно нейкі час краёчкам вока пазірала з-за лесу на выспу, на чалавека, які ўпарта валтузіўся з тоўстымі бярвеннямі.

Нарэшце, Крамнёў адкінуў адно бервяно ўбок: пад яго нагамі зеўраў чорны правал. Ён змахнуў з ілба густы пот і—ступіў уніз. Цікаўнае

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Споўнілася 50 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Віктара Трыхманенкі. З гэтага выпадку праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Віктар Фёдаравіч!

Горача вітаем Вас і шлем свае віншаванні ў дзень Вашага пацідзесяцігоддзя. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны Вы сталі ў рады Савецкай Арміі, былі лётчыкам-знішчальнікам.

Пасля вайны дэмабілізаваліся, але з 1950 года Вы зноў верна нясеце вайсковую службу, з'яўляецеся ўласным карэспандэнтам газеты «Красная звезда» па Беларускай ваеннай акрузе.

У 1955 годзе ў часопісе «Советский воин» было надрукавана Ваша першае апавяданне «Талант». З таго часу Вы стварылі нямала цікавых твораў, якія прыхільна сустрэты чытачамі і крытыкай. У Вашых апавяданнях і аповесцях моцна гучыць вайсковая тэма. Вамі створаны запамінальныя вобразы і характары савецкіх лётчыкаў, услаўлены іх гераічныя подзвігі ў барацьбе з фашызмам, расказана, як у мірны час яны нясуць службу, павышаюць баявую і палітычную падрыхтоўку.

Мы рады адзначыць, што да свайго юбілею Вы прыйшлі ў творчым росквіце, поўныя сіл і дзярзанняў.

Жадаем Вам, дарагі Віктар Фёдаравіч, плённай працы на ніве журналістыкі і ў літаратуры, актыўнай грамадскай дзейнасці, добрага здароўя, шчасця».

20 мая пісьменніку Анатолю Кузьмічову спаўняецца 50 гадоў. Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Анатоль Пятровіч!

У дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя прыміце ад нас, Вашых калег па пяру, шчырае сардэчнае віншаванне.

Вы вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны, у якой прынялі актыўны ўдзел, і з добрым жыццёвым набыткам пачалі працаваць у літаратуры. Спачатку пісалі нарысы, вершы, апавяданні, якія прысвячалі паказу воінскага подзвігу салдата, жыццю нашага сучасніка.

Пасля пачалі асвойваць жанр драматургіі, напісалі п'есы «В нашем полку», «Возвращение», «Орлиный перевал», якія з поспехам ішлі на сцэнах многіх тэатраў краіны.

Вас ведаюць чытачы і як цікавага і здольнага празаіка. У сваіх аповесцях і раманах — «Юго-Запад», «Тревога», «Смена караулов», «Одиннадцатый класс» — Вы стварылі запамінальныя вобразы салдат і афіцэраў Савецкай Арміі, расказалі пра іх лёс, загартоўну характараў як у час вайны, так і ў мірны

перыяд, паказалі вытокі мужнасці савецкіх людзей у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Прыемна адзначыць, што Вы актыўна працуеце і ў галіне перакладу твораў пісьменнікаў братніх рэспублік на рускую мову.

Жадаем Вам, дарагі Анатоль Пятровіч, далейшага росквіту Вашага таленту, новых кніг, добрага здароўя, шчасця!»

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтых віншаванняў і жадае юбілярам новых творчых поспехаў.

ВЫСПА

сонца зразу ж нырнула следам за ім, і Крамнёў убачыў тую, дзеля якой гатовы быў на ўсё...

Яна ляжала на спіне, раскінуўшы рукі. Густыя залацістыя валасы яе рассыпаліся на падлозе, вочы былі заплюшчаны, нібы іх толькі што патрывожыла нясцерпна яркае сонца. А над ёю, упёршыся адным канцом у сцяну, другім—у падлогу, вісела цяжкое жоўтае бервяно. Пад цяжарам абвалу яно крыху сагнулася, але—устаяла.

«Соня... Родная...»—Крамнёў дрыготкай рукой крануўся валасоў радысткі і—адхіснуўся. Усё тое ж цікаўнае сонца нечакана асвяціла твар дзяўчыны, яе аголеную шыю, і Васіль выразна ўбачыў, як б'ецца-пульсуе пад матава-белай дзявочай скурай тонкая, празрыста-сіняя жылка.

Не радасць, нейкі дзікі жах ахапіў Крамнёва. Скамянеўшы, ён глядзеў на гэтую жывую, трапяткую жылку і адчуваў, як сэрца яго шалёна калоціцца, што яшчэ момант, і яно не вытрымае...

«Божа, не ашукай!—упершыню ў сваім жыцці маліўся ён.—Не ашукай...»

А тонкая жылка на шыі дзяўчыны білася больш упэўнена і вясёлае сонца ўжо ва ўсю ўдарыла пад развaліны бліндажа! Яно нібыта расчэсвала залатыя дзявочыя валасы, песціла яе твар, і ён, сагрэты цяплом і пяшчотай, святлеў, ружавеў, ажываў!

Ён асцярожна нахіліўся бліжэй да радысткі, нясмела крануўся яе рукі. Рука была цёплая, мяккая.

Не памятаючы сябе ад радасці, Крамнёў падняў на рукі радыстку і кінуўся прэч з бліндажа. Ён азіраўся, нібы баяўся, што вось-вось нехта выскачыць з тае чорнай магілы, кінецца наўздагон...

Апрытомнеўшы, Соня са страхам і здзіўленнем глядзела на яго шырока раскрытымі вачыма, а ён ішоў і ішоў, аж пакуль не апынуўся на беразе Лані, пад тымі ж маладымі бярозамі, дзе ўжо збіраўся пахаваць Соню...

●

Вайна, як і ўсякая катастрофа, што раптоўна кідае ў свой вадаварот мільёны і мільёны людзей, багатая на выпадкі, якія па сваёй неверагоднасці могуць спрачацца з самай смелай фантастыкай. З вышыні тысяч метраў падае на зямлю падбіты самалёт, а цяжка паранены лётчык, які не змог пакінуць кабіну, застаецца жывы...

Так, тысячы самых неверагодных выпадкаў парадзіла вайна. І ўсё ж... усё ж Крамнёў доўга не мог зразумець, як уратавалася яна, Соня Кавалёва? Бомба ўпала побач з бліндажом, раскідала ўсе чатыры накаты, пагнула рэйкі, раструшчыла шматпудовыя валуны, а радыстка, слабая дзяўчына, кволае сэрца якой сцерагла толькі салдацкая гімнасцёрка, ляжыць вось на зялёнай траве, пад зялёнымі бярозамі, не кранутая ніводным асколкам! Што гэта? Дзіва? Сон?

Крамнёў паклаў сваю гарачую руку на Сонін лоб. Соня ўзяла яе ў свае рукі і ціха прыціснула іх да грудзей. І ён выразна адчуў, як роўна і моцна б'ецца маладое ўпартае сэрца.

— Ну, Соня, жыць табе тысячу год,— спрабуючы ўсміхнуцца, гаворыць капітан, а вочы яго туманяць слёзы.

Соня прыціскае яго руку мацней, доўга глядзіць на бярозкі, што абступілі яе карагодам, глядзіць на высокае неба і раптам прыўзнімаецца. Па яе вачах, па трымценню ўсяго яе цела Крамнёў бачыць, што ёй цяжка, што ў яе кружыцца галава. Ён цягнецца, каб падтрымаць яе, але Соня імгненна хапаецца рукамі за тонкі ствол бярозкі і ўстае на ногі. Ногі яе дрыжаць, як у маленькай, толькі што народжанай лані, а неспакойныя вочы нешта хапатліва шукаюць. Нарэшце яны знаходзяць яго, Крамнёва, і Крамнёў бачыць у іх цёмнай глыбіні бязмежную радасць і стомленасць, невымяральную прагу жыцця.

— Што ты робіш?!—кідаецца ён да Соні і беражна падхоплівае яе, паднімае на рукі.—Хіба так можна?

Ён ідзе назад, на выспу, да свайго бліндажа. Соні патрэбен спакой. Зараз ён напоіць яе гарачым чаем і пакладзе спаць. Ёй трэба спакой. Цяпло і спакой. Асцярожна кладзе яе на нары, накрывае салдацкай шэрай коўдрай, доўга сядзіць побач, напружана ўглядаючыся ў такі знаёмы твар дзяўчыны. Кожная рыска на ім, гэтым антычным, як жартавалі ў інстытуце, твары набыла нейкае ледзь улоўнае адценне. На чыстым высокім лбе прарэзалася глыбокая складка, густыя цёмныя бровы хваравіта сышліся... Некалі пульхныя, ярка-ружовыя вусны пабялелі, нервова ўздрыгвалі. Крамнёву здавалася, што зараз радыстка ўсхліпне, заплача горкім, здушаным плачам.

Дакрануўшыся рукою да яе цёплых валасоў, ён ціхенька ўстаў і выйшаў з «адсека».

Ішоў ён наўпрост, абы куды, а калі спыніўся, то зноў убачыў перад сабою тую ж глыбокую чорную яму, якая ледзь-ледзь не стала для Соні магілай. Доўга глядзеў на бярвенне, разварочанае выбухам бомбы і яго, Крамнёва, рукамі, глядзеў уважліва, засяроджана, нібы нешта хацеў прачытаць на парэпанай, скляванай асколкамі, кары.

Потым Крамнёў пачаў спускацца ў разбураны бліндаж. Там, пад абломкамі дрэва і каменя, ляжалі Соніны рэчы, стаяла радыёстанцыя. Усё гэта трэба знайсці і забраць. Асабліва радыёстанцыю.

...Радыёстанцыя была раструшчана бервяном, раструшчана разам са столікам, на якім стаяла. Затое многія іншыя рэчы аказаліся цэлыя. Пад забуранымі нарамі ляжаў ранец. На сцяне, над нарамі, вісеў аўтамат і запасны дыск у чахле.

Крамнёў начапіў на спіну ранец і аўтамат, акуратна згарнуў Соніну пасцель, перавязаў яе кавалкам тэлефоннага провада.

Калі ён вярнуўся ў бліндаж, Соня ўжо не спала. Яна сядзела на нарах і спалохана азіралася.

— Ну, дзе ты быў!—з адчаем і дакорам усклікнула яна, убачыўшы на парозе Крамнёва.—Куды ты так доўга хадзіў?!

— Ды вось, прынёс твае рэчы,—спакойна адказаў Крамнёў.—А ты што, спалохалася, што пакіну адну?

— Канечне, спалохалася! Прачнулася, а тут—ні душы. Я ледзь не закрычала... Сядзь, пасядзі са мною.

Крамнёў кінуў на нары хатуль, паклаў на стол аўтамат. Соня ціха прыхілілася да яго пляча. Цела яе дробна дрыжэла.

— Супакойся,—асцярожна абняў яе плечы Васіль.—Цяпер баяцца няма чаго. Мы тут з табою адны, як Рабінзон з Пятніцай на тым бязлюдным востраве...

— Я так... Трасе нешта...—Соня золка перасмыкнула плячыма, хапатліва схавала ў рукавы гімнасцёркі бледныя рукі, зноў асцярожна абвяла вачыма прасторны «адсек». У кожным яе руху, у кожным позірку адчувалася якаясьці няўпэўненасць, нейкі глыбокі страх, які яна хацела і не магла падавіць.

— Ты мусіць галодны?—раптам прамовіла Соня, зірнуўшы ў вочы Крамнёву.—Паглядзі ў маім рэчмяшку. Там тое-сёе павінна быць.

Васіль развязаў ранец і весела свіснуў:

— С-соня! Ды тут жа ў цябе цэлы склад пэфэзэс! Тры банкі кансерваў, кавалак сала. А сухароў, сухароў колькі!

— Гэта нашы разведчыкі... Кожны дзень штонебудзь прыносілі... Цукар ёсць?

— Ёсць, ёсць! Нават соль ёсць. Бягу за вадой!

Пасля абеду Соня адразу ж уладкавалася на нары. Чай не сагрэў яе. Балела галава, раз-пораз халодныя мурашкі прабягалі па целе, а ў вялікіх цёмных вачах мігцеў неспакойны бляск.

Васіль паклаў руку на гарачы Сонін лоб, нахмурыўся.

— Відаць, прастудзілася, — вінавата прызналася Соня, глыбей забіраючыся пад коўдру.— У грудзях—нібы хто лёду насыпаў. А рукам чамусьці горача...

Яна заплюшчыла вочы, крыху памаўчала, ціха дадала:

— І ў вушах звініць. Тонка-тонка, і ўсё на адной агіднай, пранізлівай ноце... Чаму?

Крамнёў уздыхнуў. Усё гэта яму было знаёма. Усё гэта ён пазнаў, перажыў сам. Тады, яшчэ ў сорак першым, на канапляным полі, а потым, у пуні, на леташнім сене, дзе ляжаў паранены і кантужаны выбухам цяжкога снарада.

— Засні. Гэта...

Крамнёў асёкся. Прыгожы Сонін твар імгненна пабялеў, стаў попельна-шэры, а на лбе выступілі кропелькі поту.

— Соня, што з табою?!—схапіў ён рукі дзяўчыны.

— Н-нічога, так... Пройдзе... — Яна прагна глытнула паветра, яшчэ мацней заплюшчыла вочы.

— Даць вады?

— Не трэба. Прайшло...—Соня глыбока ўздыхнула, ціха вызваліла рукі, паклаўшы іх на грудзі. Доўга ляжала нерухома, потым рэзка села, прыпала шчакой да грудзей Крамнёва і горача, задыхаючыся, зашаптала:

— Вася! Як страшна быць пахаваным жывым! Як страшна! Прачнулася, а кругом—чорна. І так ціха! Я яшчэ ніколі не чула такой цішыні, я нават не ўяўляла, што яна... такая... ёсць. Разрывае вушы! Ты ўяўляеш? Цішыня разрывае вушы! Аж стыне кроў, зусім няма чым дыхаць. Я хацела закрычаць, паклікаць каго на дапамогу, і —не пачула ўласнага голасу. Цішыня раздушыла яго!

— Не трэба, Соня...

— А больш я нічога і не помню. Цішыня раздушыла і мяне. А калі я ачомалася зноў, то ўбачыла цябе. І прастору. Столькі прасторы, што ад радасці ледзь-ледзь не разарвалася сэрца.

Яна прыціснула да сваіх гарачых вуснаў рукі Васіля і пачала прагна іх цалаваць.

— Прашу цябе, не трэба!—асцярожна вызваляючы рукі, паўтараў Крамнёў.—Засні. І ўбачыш, што ўсё пройдзе, стане лепш. Засні!..

— Добра. Я зараз. Толькі...—Яна зноў асцярожна азірнулася, зірнула на цяжкое рыжае бярвенне накату, што нізка вісела над ёю, ціха прашаптала:—толькі не тут. Пасцялі мне там, наверсе, пад якім-небудзь дрэвам.

— Ды ты што? На нарах жа цяплей. Ночы яшчэ халодныя.

— Прашу, пасцялі. Баюся я. Вось гэтых бярвенняў баюся. Так і здаецца...

— Ну добра, добра, хадзем.

Ён пасцяліў ёй на крутым беразе Чорнага возера, пад разгалістым дубам...

— Не хвалюйся, на выспе ціха,—супакоіў яе Васіль і асцярожна спытаў:—Ты не помніш, дзе твае карты?

— Якія карты?

— Палявыя. Карты-дзвюхвёрсткі. Яны ў цябе былі?

— А-а! Яны ў маёй сумцы.

— А дзе сумка?

— А ты хіба яе не прынёс? Яна вісела на сцяне, над нарамі.

— Не бачыў. Ну, ды ладна, пашукаю.

Вярнуўся ён гадзіны праз дзве, запэцканы глінай і смалою, мокры ад поту, але, здаецца, весела-ўзбуджаны.

— Знайшоў!—яшчэ здалёк крыкнуў ён Соні.—І ведаеш, дзе была? Аж пад лесвіцай, каля самага выхаду з бліндажа.

— Рацыя?! Цэлая?!—падхапілася Соня.

— Ды не. Сумка. І глянь, як прашыла яе асколкам! Навылёт. Але карты нічога, карыстацца можна.

— А...

— Рацыя?—Вясёлая ўсмешка ў вачах Крамнёва патухла, на твар лёг халодны цень. Ён выпусціў з рук ражкі коўдры, і проста на траву пасыпаліся нейкія бясформенныя рознакаляровыя абломкі.

— Гэта... усё?

— Усё. Бачыш, адна пацяруха. Прымусіць гаварыць гэта ламачча не зможа і сам Крэнкель. Ды ты... чаго ты?—заўважыўшы слёзы ў Соніных вачах, раптам зазлаваў Крамнёў.—Кінь. Падумаеш, трагедыя. Дагонім свой штаб, звяжуся з Цэнтрам, і будзе табе новая тарахцелка. А цяпер скажы дзякуй, што хоць карты знайшліся.

Крамнёў кінуў коўдру, усеўся пад дубам.

Раструшчаная радыёстанцыя засмуціла і яго не менш, чым радыстку. Яшчэ раз накіроўваючыся ў Сонін бліндаж, ён дзесьці ў самым куточку душы хаваў надзею, што рацыю і сапраўды ўдасца наладзіць, удасца ажывіць яе хоць на некалькі мінут. Тады ён адразу ж звяжацца з Цэнтрам, папросіць самалёт і адправіць хворую Соню на Вялікую зямлю. А можа, калі будзе такі загад, паляціць туды і сам.

А цяпер? Каб Соні хоць трохі ачуняць і акрэпнуць, прывесці ў парадак нервы (кантузія, відаць, несур'ёзная), трэба не менш, як тыдзень. За гэты тыдзень апусцее ранец. А тады? Галодны і хворы чалавек дзвесце кіламетраў не пройдзе, ды яшчэ скрозь лясы і балоты! А вёскі наўкол пагарэлі, нідзе не знойдзеш ні прытулку, ні кавалка хлеба.

Крамнёў скамечыў коўдру, зрабіў з яе нешта накшталт падушкі і расцягнуўся на мяккай цёплай траве. Мінулая ноч, шалёная ноч без сну, канчаткова знясілела яго. Трэба было заснуць, заснуць хоць на гадзіну. Але сну не было. Кудысьці ціха плыла зямля, плыла разам з ім, разам з разгалістым дубам, разам з глыбокім сінім небам і белымі-белымі хмаркамі, маленькімі і рэдкімі, як шрапнельныя разрывы. Бяздонная сіняя далеч клікала ў свае бязмежныя прасторы жывое і мёртвае, абяцала спакой і спачын. І пахлі тыя прасторы жывіцай-смалою, чаромхай і ландышам...

ЭКРАН ВУЧЫЦЬ, ЭКРАН ДАПАМАГАЕ

Занятак у тэлевізійнай «Школе майстэрства». Злева направа: галоўны механік будаўнічага ўпраўлення № 60 трэста № 12 (г. Магілёў) І. П. Саўчанка, начальнік гэтага ўпраўлення А. Р. Мінікес, вядучы тэлеперадачы — старшы рэдактар галоўнай рэдакцыі эканомікі прамысловасці, будаўніцтва і сувязі Л. П. Бандарэнка і начальнік упраўлення механізацыі Міністэрства прамысловага будаўніцтва БССР М. П. Фурс.

ПАМЯТАЮ, як рыхтавалася ў эфір першая перадача рэспубліканскай тэлестудыі для слухачоў з цыкла «Школа майстэрства»...

Іван Платонавіч Саўчанка — рухавы і энергічны. Яго хударлявы, мангольскага тыпу твар, разумныя, крыху прыжмураныя вочы свецяцца добразычлівай усмешкай, калі ён пачынае гаварыць пра сваіх таварышаў, паплечнікаў, аб'яднаных адным запалам — любоўю да пошуку, да пазнання нязведанага.

У суровую студзеньскую сцюжу Іван Платонавіч разам з намі, работнікамі тэлебачання, ездзіў з аднаго канца Магілёва ў другі, гаварыў пры гэтым: «Ну, гэтую навінку вы абавязкова павінны паглядзець!» І ў выразе яго твару, у тым, якім тонам гаварыў ён, адчувалася: сапраўды варта.

Азарт, апантанасць Івана Платонавіча перадаваліся ўсёй здымачнай групе. Таму, пяглядзячы на пранізлівы вецер, і кінааператар, і яго асістэнт, і рэжысёр працавалі з задавальненнем. Тады і быў зняты кінаролік, які апавядае аб працы магілёўскіх наватараў.

А праз некаторы час галоўны механік магілёўскага будаўнічага ўпраўлення № 60 трэста № 12 Іван Платонавіч Саўчанка і начальнік гэтага ўпраўлення Аляксандр Рыгоравіч Мінікес прыехалі ў Мінск.

Хваляваліся, як усе, выступаючы па тэлебачанні. Гаварылі, што ў іх нічога не атрымаецца. Але атрымалася. Калі ў эфіры з'яўляюцца людзі, глыбока ўлюбёныя ў сваю справу, захопленыя ёю, яны забываюць, што іх слухае шматлікая аўдыторыя.

Удзел у перадачы прымалі таксама будаўнікі, якія жывуць у інтэрнаце па вуліцы Пугачоўскай, дзе былі ўстаноўлены тэлевізійныя камеры. Акрамя таго, у ёй удзельнічалі і брэстчане. Яны задавалі пытанні, цікавіліся, калі будуць укаранёны тыя або іншыя навінкі.

А пасля перадачы Іван Платонавіч і Аляксандр Рыгоравіч дзяліліся першым тэлевізійным вопытам: «Калі пачыналі задаваць пытанні, было лягчэй. Звяртаешся да чалавека».

З таго часу ў эфіры выйшла дваццаць тры перадачы «Школа майстэрства» для будаўнікоў. Па форме і зместу яны нагадвалі першую. Праўда, не заўсёды ў гэтых перадачах глыбока абагульняўся вопыт перадавых прадпрыемстваў, калектываў. Тым не менш яны не засталіся па-за ўвагай гледача.

Вось што піша ў рэдакцыю вучаніца ГПТВ № 92 (г. Мсціслаўль) Еўдакія Мішчук: «Праглядаючы вашы перадачы аб укараненні перадавых метадаў працы ў будаўніцтве, я ўсё больш думаю аб тым, якая ганаровая спецыяльнасць будаўніка. Таму і вырашыла стаць будаўніком».

Расказваючы аб укараненні перадавых метадаў працы ў будаўніцтве, рэдакцыя ў першую чаргу імкнулася расказаць аб людзях, наватарах вытворчасці.

Пры «школе» быў арганізаваны конкурс на лепшую рацыяналізатарскую прапанову па ўдасканаленню арганізацыі працы на будаўнічых пляцоўках. У яе адрас паступіла 31 рацыяналізатарская прапанова. Шэсць з іх журы, якое ўзначальваў загадчык аддзела будаўніцтва Савета Міністраў БССР М. А. Паўлаў, рэкамендавала да ўкаранення ў будаўнічых арганізацыях Беларусі.

Наш час — час бурнага тэхнічнага прагрэсу. І, зразумела, тэлебачанне не можа прайсці міма тых змен, якія адбываюцца ў прамысловасці.

Гэтыя пытанні ўзнімаюцца ў перадачы «Гарызонты тэхнічнага прагрэсу». Звычайна гэта рэпартажы з цэхаў, лабараторый, спецыяльных канструктарскіх бюро.

Выпускі гэтыя насілі ў асноўным інфармацыйны характар, расказвалі аб навінках навукі і тэхнікі.

А як больш актыўна паказаць вытворчасць?

І вось нарадзілася новая задума — конкурс на лепшую распрацоўку сродкаў комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі. Праводзіўся ён разам з Беларускім рэспубліканскім праўленнем НТТ «Машпрам» і рэдакцыяй часопіса «Промышленность Белоруссии».

Цяпер з'явілася новая перадача: «Адстаючыя прадпрыемствы — на кантроль». Рэдакцыя беларускага тэлебачання ўзяла шэфства над чатырма калектывамі — Маладзечанскім мэблевым вытворчым аб'яднаннем, Мінскім станкабудаўнічым заводам імя С. М. Кірава, сёмым будаўнічым трэстам і заводам жалезабетонных вырабаў № 8 горада Мінска.

У эфір выходзілі тройчы. І ўжо можна зрабіць некаторыя вывады. Трэба прызнаць: пакуль што рэдакцыя не змагла яшчэ дабіцца эканамічнага аналізу прычын адставання прадпрыемстваў. Не малую ролю тут, мусіць, адыгрывае тое, што да размовы не прыцягваюцца вядучыя эканамісты рэспублікі.

Вытворчыя пытанні асвятляюцца таксама ў выпусках «Пяцігодка, год трэці, рашаючы», «Аб часе і аб сабе» (расказы аб сямі днях з жыцця калектыву). Яны таксама закранаюць праблемы, якія хвалююць работнікаў вытворчасці...

Дык якімі ж павінны быць перадачы на вытворчую тэму? Цяпер для ўсіх зразумела: перш за ўсё яны павінны быць актуальнымі, злабадзённымі, аргументаванымі, з глыбокім аналізам працэсаў, якія адбываюцца ў жыцці таго ці іншага працоўнага калектыву. І, несумненна, ні ў якім разе нельга забываць аб больш актыўным уздзеянні на гледача, не забываючы пра выхаваўчую ролю тэлевізійнага экрана.

Анатоль СТАЎРОЎ,
старшы інжынер трэста «Аргтэхбуд» Міністэрства прамысловага будаўніцтва БССР.

МАГІЯ НАЗВЫ І ЧАРГОВАЯ ПРЭМ'ЕРА

«КВАДРАТУРА КРУГА» В. КАТАЕВА Ў ГРОДЗЕНСКІМ АБЛАСНЫМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ

Гэтая п'еса вытрымала 629 прадстаўленняў у Маскоўскім Мастацкім тэатры ў 20-я гады, абышла ў свой час сцэны Еўропы і Амерыкі.

Засталася магія назвы. Рэха колішняга поспеху — таксама магія. І вось цяпер «Квадратура круга» зноў перастала быць толькі ўспамінам. Яе ставяць. Ў маскоўскім тэатры імя А. С. Пушкіна. У іншых тэатрах. У нашым Гродзенскім.

І прычынай, мабыць, не толькі «магія» былой папулярнасці твора В. Катаева, але і сам вадэвільны канфлікт. Для шлюбу мала агульных інтарэсаў і «агульнай ідэйнай платформы». Знаёмства «даўжынёю ў суткі» не такі ўжо сталы фундамент для сямейнага шчасця. Аб гэтым з добрай і мудрай усмешкай гаворыць В. Катаеў.

А пра што і ці з мудрай усмешкай гавораць гродзенцы?

...На сцэне — вадэвіль. Усё павінна вырашацца па законах жанру, дзе пакуты герояў не выйдуць за межы камедыйнага, дзе канфлікт-непаразуменне павінен разгарнуцца так, каб маральны вынік яго быў загадзя вядомы. А непаразуменне вось у чым: маладыя пары селяцца ў пакоі, дзе раней кватаравалі толькі двое з чацвярых — Абрам і Вася. На працягу дзеяння п'есы высвятляецца, што новае жыццё ўносіць свае карэктывы нават у погляды герояў. Вось гэтыя папраўкі максімалізму юных — мала агульных інтарэсаў і «агульнай ідэйнай платформы», каханне існуе, аказваецца, на іншым перакрыжаванні. Тоня, жонка Абрама, кахае Васю, Вася, муж Людмілачкі, кахае Тоню, Абрам і Людмілачка, у сваю чаргу, кахаюць адзін аднаго. Героі пакуту-

ВЫДАТКІ ПОШУКУ ЦІ

ЦЯПЕР даволі часта чуеш самыя процілеглыя выказванні наконт «Песняроў». Частка публікі, асабліва маладыя аматары эстрады, хваляць ансамбль, называючы яго арыгінальным прапагандыстам беларускай народнай песні і творчасці кампазітараў-прафесіяналаў. У падтрымку сваёй думкі яны называюць пераважна патэфонныя пласцінкі і магнітафонныя запісы. Больш сталыя слухачы і музыканты-прафесіяналы, бывае, сцвярджаюць, што «Песняры» пасля першых поспехаў сталі выступаць з меншай адказнасцю і часамі нават псуюць народную песню адкрыта «моднай» манерай яе выканання. Спрэчкі, мабыць, не выпадковыя, бо штодзённае канцэртнае жыццё, на нашу думку, дае падставы і для захаплення ансамблем, і для крытычных заўваг у яго адрас.

Радуе тое, што «Песняры» ў аснову свайго рэпертуару ўзялі народныя песні і творчасць беларускіх кампазітараў. Але ў мастацтве поспех залежыць ад суладдзя таго, «што» ты выконваеш, з «як» — з якасцю і ўзроўнем.

Нядаўна я двойчы наведаў канцэрты «Песняроў» і зноў пераканаўся — слухачы цёпла прымаюць гэты ансамбль. На першым канцэрце публікі было надзвычай многа, былі заняты не толькі ўсе месцы, але і праходы паміж радамі крэслаў. Літаральна «на ўра» прымалася большасць нумароў праграмы, частку якіх выканаўцам даводзілася «бісіраваць». Другі канцэрт быў абанементным — для рабочых і служачых завода імя Леніна. Слухачоў было менш, «бісаў» яны не патрабавалі ды і прымалі ўсю праграму значна спакайней.

У ансамбля цікавы і даволі нечаканы склад інструментаў: электрагітары і электраарган суседнічаюць з чыста «сімфанічнымі» — скрыпкай, флейтай, фартэпіяна; з джазавых тут саксафон, труба, вялікая група самых разнастайных ударных; ёсць і беларускія — ліра, дудачкі, бубен. Цяпер у дадатак з'явіўся і клавесін. Усё гэта дае магчымасць рабіць інструментоўкі самымі разнастайнымі, цікавымі, надаваць ім выразны беларускі нацыянальны каларыт.

«Песняры» шырока карыстаюцца гэтымі магчымасцямі. Частка аркестровак сапраўды цікавая, мае пэўную нацыянальную афарбоўку. Праўда, не з усімі апрацоўкамі беларускіх народных мелодый можна цалкам пагадзіцца.

Возьмем для прыкладу нумар, што з'яўляецца своеасаблівай «візітнай карткай», якой «Песняры» звычайна пачынаюць канцэрты. На сцэну выходзяць тры выканаўцы: два з лірамі і адзін з дудачкай. Гучыць прывабная мелодыя беларускай народнай песні, а на сцэну ў гэты час па чарзе выходзяць астатнія ўдзельнікі ансамбля, кожны з якіх нібы далучае свой інструмент да агульнага гучання. Музыка набывае лысанантныя гармоніі, рытм становіцца ўсё хутчэйшым, і адчуваеш, як губляецца характар народнай мелодыі, у залу нясуцца гукі ці то твіста, ці то шэйка. Узмацняецца і сіла гучання, пакуль не набывае сапраўды громападобнага эфекту. Такі прынцып апрацоўкі і такая манера выканання і выклікаюць у большасці з нас незадаволенасць, нават пратэст.

У абодвух канцэртах гучала нямала беларускіх народных песень — «Купалінка», «І туды гара, і сюды гара», «Стаіць вярба», «Як я ехаў да яе», «Ой, не кукуй, зязюленька» і іншыя.

Некаторыя з іх апрацаваны даволі ўдала. Скажам, мілагучна пачынаюць песню «Стаіць вярба» дзве ліры і гітара-сола. Тыя ж інструменты і заканчваюць яе. Але сярэдняя частка, апрацаваная для выканання ўсім складам інструментаў, занадта шумная; яна вытрымана ў стылі навамодных заходніх танцаў і амаль перакрэслівае ўсё хараство народнай мелодыі.

Слухаем яшчэ адну песню «Забалела ды мая галованька». Яна пачалася раскрыццём асноўнай тэмы, потым перайшла ў музыку з вострым і ламаным рытмам, што прывяло да суцэльнага сола ўдарных інструментаў. Выканаўца так старанна лупцаваў па барабанах, талерках і іншых інструментах, што ў паветры стаяў адно грукат. А хуткасць тэмпаў узрастала, дасягаючы нейкай гукавой фантасмагорыі. Навошта гэта? Да таго ж, каб «узмацніць эфект», святло на сцэне пагасла, і толькі пад нагамі ўдарніка час ад часу ўспыхвала яркая лямпачка, ад якой на заднік сцэны кідаліся рэзкія пачварныя цені выканаўцаў. Урэшце рэшт нібы «ўшчэнт знясілены» саліст зрабіў выгляд, што губляе прытомнасць, і, сутаргава ўздрыгваючы, працягваў сваё «сола».

Такі «музычны нумар» наогул не падыходзіць для філарманічнага канцэрта, ён хутчэй прыдатны для выканання музычнымі эксцэнтрыкамі.

Яшчэ прыклад — песня «Ой, не кукуй, зязюленька». Яна вылучаецца сваёй досыць празрыстай інструментоўкай і параўнальна ціхім выкананнем. Затое ўведзеная ў яе сольная партыя (мастацкі свіст) застаецца толькі... свістам. На маю думку, ён зусім чужы беларускай народнай песні і пераўтварае яе выкананне ў танны эстрадны нумар.

Сапраўды бездакорна гучыць твор самадзейнага кампазітара В. Зянькевіча на словы Янкі Купалы «Чорныя вочы». Асаблівую прывабнасць песні з яркай запамінальнай мелодыяй надаў клавесін, удала скарыстаны ў аркестравым суправаджэнні.

Не менш добра былі выкананы дзве песні І. Лучанка на словы Я. Купалы — «Спадчына» і «Каханне». Абедзве яны надзвычай меладычныя, напісаны з добрым мастацкім густам. Пры іх выкананні ансамбль паказвае лепшыя якасці сваёй вакальнай тэхнікі і майстэрства: выразны гук, злітнасць галасоў, лаканізм у манеры артыстычных паводзін на сцэне.

Сцэна са спектакля «Квадратура круга» ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры.

юць у межах жанру, высвятляюць, этычныя іх учынкі ці неэтычныя, трапляюць у смешныя і незвычайныя становішчы, нарэшце, з дапамогай гэткага артадаксальнага рэзанёра Флавія (артыст Ю. Іваноў) усё становіцца на свае месцы.

Рэжысёр спектакля М. Прыёмка не прапануе асаблівых рэжысёрскіх навацый, каб атрымалася так званае арыгінальнае прачытанне п'есы. Ён вырашае спектакль добрасумленна, у асноўным прачытваючы тэкст і цалкам давяраючы акцёрам.

Пачынаецца спектакль прадстаўленнем персанажаў вадэвіля — пад вясёлую музыку адбываецца марш-знаёмства. Знаёмства прыемнае — героі сапраўды маладыя, сапраўды прывабныя. Лёгкі, рухавы Вася (В. Мышко), строгая, прыгожая Тоня (Л. Волкава), шчыра сумленны Абрам (В. Смачнеў), пульхная, беленькая, вочкі-вішанькі Людмілачка (Л. Кучарэнка). Пачатак дае падставы спадзявацца, што знаёмства з гродзенскай «Квадратурай круга» будзе цікавым.

Аднак у самым пачатку першай дзеі адчуваеш нейкую затрымку. Уступ настройвае на іскрысты, імклівы тэмп вадэвіля, а дзея пачынаецца з разважлівых інтанацый, нібы нам збіраюцца паказаць псіхалагічную драму.

Першая дзея, праўда, толькі завязка, экспазіцыя. Гэта — старт спектакля. Але ж у вадэвілі апраўданы, мусіць, бурны старт, як на спрынтэрскіх дыстанцыях. Абрам (В. Смачнеў) чамусьці ўваходзіць у вадэвіль сур'ёзна. Ён першы ўзважвае сітуацыі, амаль псіхалагізуючы іх. Артыст іграе старанна, толькі з зусім чужой вадэвілю саліднасцю. Гэта і не ў рэчышчы жанру п'есы ўвогуле, і супярэчыць узрушана-дынамічнаму стылю ігры партнёра — В. Мышко (Вася). Не кантактуецца ігра В. Смачнева са стылем паводзін уяўна ўзрадаванай мажлівасці акунуцца ў стыхію камедыі Л. Кучарэнка (Людмілачка).

Мне падалося, што В. Мышко і Л. Кучарэнка абралі тую экцэнтрычную манеру выканання, якая, паводле слоў Серафімы Бірман, тоіць у сабе многае: «Вострахарактарны акцёр заўсёды ходзіць па дроце, імгненне — і зваліцца ў бязглуздзіцу і безгустоўшчыну». Выканаўцы ролей Васі і Людмілачкі не баяцца рызыкаваць, але часам губляюць каштоўную раўнавагу, пачуццё меры.

Спытаем — які ж быў бы вадэвіль, калі б у ім ніхто не бегаў, не куляўся, не мітусіўся, не трапляў бы ў незвычайныя становішчы? І В. Мышко знаходзіць шмат прыватных дэталей, спрабуе абыграць кожную сітуацыю, мусіць, больш чым хто іншы ў спектаклі імкнецца выявіць спалучэнне іранічнага і рамантычнага. Акцёр ён рухавы, лёгкі, гледачы апладзіруюць яму, і артыст, узбуджаны абставінамі, у якія трапляе яго герой, і асабістым настроем, усё ж галоўным чынам прыслухоўваецца да рэакцыі залы, пачынае эфектна «падаваць» свайго героя, узмацняючы кожны рух і кожны гук. Гэта — не па-катаеўску!

Захапленне знешне камедыйнай яркасцю ролі Л. Кучарэнка дае ўхіл больш адчувальны.

Недзе ў сярэдзіне другой дзеі актрыса знаходзіць нешта вельмі лірычнае, цёплае для сваёй гераіні. Яна добрая, вясёлая, зразумела, чаму добрасумленны актывіст Абрам закахаўся ў гэту пяшчотна-ўважлівую Людмілачку. Справа не так у катлетах, што яна яму падае, як у гэтай жаночай цеплыні, весялосці, гарэзлівым какецтве. Але паступова актрыса адчувае, што гэта какецтва асабліва падабаецца гледачу ў зале, і пачынае рабіць сваю Людмілачку ўсё больш бойкай, нарэшце, вульгарнай. Яна «спявае» гэтакае нэпманаўскае, адэскае — «интир-э-сно», робіць неверагодна рызыкоўныя праходы з вельмі ж двухсэнсоўнымі рухамі і танцуе, як кафэшантанная «дива». Навошта дэманстрацыя гэтага арсеналу прыёмаў? Яны прыдатныя для нейкай іншай ролі ў іншай п'есе, не катаеўскай.

Раптам і ў віцiйствaванні Емяльяна Чарназёмнага з'яўляюцца новаўвядзенні — рэплікі з папраўкамі тэксту В. Катаева. Напрыклад, замест дастаткова экспрэсіўнага «змыліся» — «сучаснае»: «рвуць когці», хаця аўтар не абдзяліў гэтага персанажа на мову: ёсць што рабіць акцёру. Выканаўца ролі Ю. Нікіцін з асалодай вядзе ролю, смакуе кожнае слова свайго персанажа. Праўда, не рызыкуе, аддае перавагу выпрабаванаму тыпажу, які спадабаецца публіцы: багема, гуляка, «непрызнаны геній».

Паўторым: цэнтр цяжару спектакля — на акцёрах, у якіх ёсць — маладосць, ёсць — шчырасць, ёсць — імкненне да майстэрства. Ёсць і ў рэжысёра маладосць. Ад гэтага, магчыма, ад маладосці (гэта шосты самастойна пастаўлены спектакль М. Прыёмка) і такі празмерны давер да акцёра, такая ўсёдаравальная свабода ў іх — маўляў, хай пакажуць сябе і ўсё, што ўмеюць.

...Спектакль стаіць у афішы гродзенцаў. Прыцягвае магіяй назвы. Даступнасцю жанру. Спробай успомніць славутае.

Ідуць глядзець славутую п'есу. А бачаць чарговую прэм'еру... І амаль у кожнага з'яўляецца пачуццё незадаволенасці.

А. СЯМЁНАВА.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага паказаў прэм'еру спектакля «Тры мінуты Марціна Гроў» па п'есе Г. Баравіка. Паставіў спектакль рэжысёр А. Кузняцоў, мастацкае афармленне заслужанага дзеяча мастацтваў Казахскай ССР В. Галубовіча, мастак па касцюмах Г. Юсіс.

На здымку — сцэна са спектакля. У ролі Полы — артыстка А. Панова, Марціна Гроў — заслужаны артыст БССР Ю. Сідараў.

САМАЗАСПАКАЕННЕ?

Выдатна ў вакальных адносінах прагучала песня савецкага кампазітара А. Мачаварыяні «Барабаны». У гэтым тэхнічна-складаным творы «Песняры» дэманструюць не толькі адмысловае майстэрства, але і ўмельства беражліва захоўваць лірычную плынь арыгінала.

Адным словам, ёсць у рэпертуары «Песняроў» і дасканала зробленыя нумары. Ёсць і спрэчнае.

Скажам, песню маладога беларускага кампазітара Ст. Іванова на тэкст М. Танка «Аве Марыя», на маю думку, уключаць у праграму канцэрта было не варта. Характар яе музыкі не адпавядае пранікнёным вершам паэта. Яна знарок лёгкаважкая, з элементамі штучнай меладэкламацыі. Слухаеш «Аве Марыя» — і міжволі прыгадваеш цудоўную музычную фрэску на гэты тэкст А. Фляркоўскага: вось прыклад глыбокага адчування кампазітарам хараства паэтычнага слова!

Стала ўжо непісаным правілам, што кіраўнік таго ці іншага музычнага ансамбля звычайна піша музыку для яго. У гэтым няма нічога заганнага. Да таго ж кіраўнік лепш за ўсіх ведае выканаўчыя магчымасці і творчыя імкненні свайго калектыву. Толькі і тут крытэрыем павінна быць якасць.

Кіраўнік «Песняроў» Ул. Мулявін быў прадстаўлены ў праграмах канцэртаў і апрацоўкамі народных песень, і пяццю ўласнымі творамі. Гэта песні — «Завушніцы» на словы М. Танка, «Александрына» на тэкст П. Броўкі, «Балада пра чатырох заложнікаў» на словы А. Куляшова, «Белая Русь ты мая» на тэкст М. Скарынкіна і «Крык птушкі» на словы Ю. Рабчынскага. Мне падалося, што «Завушніцы» — добрая лірычная песня з запамінальнай прывабнай мелодыяй. Вельмі ўдалая ў вакальных адносінах «Александрына», у якой аўтар расквеціў мелодыю песні віртуознымі акордамі гітары (дарэчы, яе партыю натхнёна выконвае аўтар).

Мабыць, крытычныя заўвагі пра некаторыя нумары цяперашняй праграмы ансамбль успрыме правільна — як спробу выказаць пажаданне, накіраванае на паляпшэнне дзейнасці папулярнага канцэртнага калектыву.

Чамусьці ў апошні час паэты лічаць модным і нават абавязковым называць Беларусь Белай Руссю. Атрымліваецца нейкі «новы штамп». Але на верш Ул. Карызны з такой назвай з'явілася добрая песня Ю. Семянякі, на словы М. Ясеня напісаў цудоўную музыку Д. Смольскі. Толькі песня Ул. Мулявіна на тэкст М. Скарынкіна «Белая Русь ты мая» ў выкананні «Песняроў» выклікае непаразуменне не зусім ясным па думцы прыцевам. Дарэчы, і музыка яе нецікавая, бляклая, што мы адчуваем, нягледзячы на ўсю стараннасць выканаўцаў «падаць» яе эфектна.

«Крык птушкі» наогул выклікае пачуццё ўнутранага пратэсту. Аўтар падмяніў тут музыку нейкім наборам экстатычных гучанняў, якімі Ул. Мулявін, відаць, хацеў падкрэсліць «драматызм» твору. Песня пакідае прыкрае ўражанне. Напал пачуццяў тут знешне такі, што ў глядзельнай зале немагчыма разабраць ніводнага слова, а чуваць толькі крык, які нічым не нагадвае «крык птушкі». Хутчэй гэта звярыны роў. Ні аб якім музычным развіцці песні гаворкі быць не можа: уся яна ад пачатку да канца вытрымана ў адным надзвычай напружаным галасавым выкліку.

Наогул трэба сказаць, што празмерна многа нумароў выконваецца «Песнярамі» вельмі ж гучна. На сцэне стаяць два велізарныя дынамікі, накіраваныя ў глядзельную залу і злучаныя з некалькімі мікрафонамі. Яны працуюць на поўную магутнасць, павялічваюць пабочныя шумы ці выхопліваюць асобныя музычныя фразы, калі выканаўца блізка падыходзіць да мікрафона. Нават гук гітары, якой віртуозна валодае Ул. Мулявін, часам нагадвае «неўрастэнію інструмента». Ці варта рабіць «гаспадаром» музычных вечароў гукарэжысёра? Ён круціць на пульце мікшары з такім азартам, што пасля канцэрта выходзіш літаральна аглушаны.

Думаецца, што калі прывесці да ладу ўсю гэтую магутную гукавую тэхніку, канцэрты калектыву будуць слухацца з большай цікавасцю і плёнам. Хочацца пажадаць выканаўцам іграць і спяваць натуральна, «па загадзе сэрца», не забывацца на нюансіроўку.

Неабходна ўважліва перагледзець праграму канцэртаў і адмовіцца ад яўна малакаштоўных нумароў. Пэўна, варта, як след прадумаць і ўсе апрацоўкі беларускіх народных песень, каб зрабіць іх больш адпаведнымі нацыянальным музычным традыцыям. Дарэчы, пажадана, каб не было манаполіі на гэтыя апрацоўкі ў кіраўніка ансамбля, каб аўтарскі актыў «Песняроў» быў шырэйшы і яны сябравалі б з беларускімі кампазітарамі.

Сваёй славай «Песняры» абавязаны ў першую чаргу народнай песні. Даваць сабе палёгку артысты не маюць права. Задача ў іх высакародная — актыўна і мэтанакіравана прапагандаваць здабыткі фальклорнай творчасці і сучаснай песні. Рабіць стаўку на знешні эфект, як гэта ні парадаксальна, азначае адно: калектыў супакойваецца на дасягнутым і жыве старым капіталам.

Д. ЖУРАЎЛЁЎ.

АКРЫЛЕНЫЯ ЎВАГАЙ НАРОДА, КЛОПАТАМІ ПАРТЫІ

15—18 мая 1973 года — дні работы IV з'езда мастакоў СССР. Творцы выяўленчага мастацтва аглядаюцца на зробленае, акрэсліваюць чарговыя планы, якія вынікаюць з рашэнняў XXIV з'езда КПСС, з тых задач, якія народ і партыя ставяць перад мастацтвам сацыялістычнага рэалізму на сучасным этапе творчага працэсу ў нашай краіне. З якімі вынікамі падышлі да ўсесаюзнага з'езду мастакі нашай рэспублікі, з якімі планамі на бліжэйшы час паехалі на ўсесаюзны форум прадстаўнікі Саюза мастакоў БССР,— гаворыцца ў артыкуле, які прапануем увазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва».

Віктар ПРАТАСЕНЯ

старшыня прэзідыума праўлення Саюза мастакоў БССР.

САВЕЦКІ народ, народ-наватар,— галоўны герой твораў савецкіх мастакоў. Ён натхнёна ажыццяўляе вялікія планы будаўніцтва камуністычнага грамадства ў нашай краіне.

Не так даўно савецкія людзі ўрачыста адзначылі залатую дату ўтварэння СССР. Гэтае ўсенароднае свята было і святам савецкага шматнацыянальнага мастацтва, у тым ліку—выяўленчага. Мастакі нашай краіны з новай сілай прадэманстравалі інтэнсіўны рост і адзінства ўсяго савецкага выяўленчага мастацтва, сацыялістычнага па зместу, разнастайнага па нацыянальных формах, інтэрнацыяналісцкага па духу.

Прысвечаныя 50-годдзю СССР шматлікія абласныя, рэспубліканскія і ўсесаюзныя выстаўкі твораў выяўленчага мастацтва з'явіліся яркім сведчаннем няўхільнага росту мастацтва сацыялістычнага рэалізму.

Цяпер, калі мастакі савецкай краіны збіраюцца ў Маскве на свой усесаюзны форум, мы яшчэ і яшчэ звяртаемся да даклада «Аб пяцідзесяцігоддзі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», з якім выступіў на сумесным урачыстым пасяджэнні ЦК КПСС, Вярхоўнага Савета Саюза ССР і Вярхоўнага Савета РСФСР Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў. У гэтым дакладзе выказана паслядоўная і ясная праграма далейшага развіцця культуры і мастацтва савецкага народа.

Мастакі Савецкай Беларусі, як і мастакі ўсіх братніх рэспублік краіны, заклапочаны тым, каб стварыць палотны, якія сцвярджаюць савецкую рэчаіснасць, раскрываюць вобразы перадавога чалавека працы, веліч здзяйснення ў імя савецкага народа. У дыяпазоне мастакоўскіх клопатаў і стварэнне прыгожых вырабаў масавай вытворчасці, і далейшае пашырэнне выставачнай дзейнасці, і паляпшэнне выдавецкай справы, і развіццё праграмы мастацкага выхавання, умацаванне сувязей з мастацкай самадзейнасцю.

За апошнія гады Саюз мастакоў БССР значна папоўніўся маладымі здольнымі кадрамі — жывапісцамі, графікамі, скульптарамі, майстрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. І гэта з'яўляецца зарукаю далейшага паспяховага развіцця выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы.

Калектыў Саюза мастакоў БССР бачыць прызванне ў тым, каб сваёй творчасцю дапамагаць савецкаму народу ў яго вялікай барацьбе за выкананне велічных планаў будаўніцтва ў нашай краіне. Нашы клопаты і думкі непарыўна звязаны з тым, што 1973 год, як падкрэслена ў дакладзе Л. І. Брэжнева, мае асаблівае значэнне—гэта трэці, у многім рашаючы лёс усёй пяцігодкі год. Менавіта ў гэтым годзе адбыўся наш рэспубліканскі з'езд мастакоў і адбываецца ўсесаюзны IV з'езд мастакоў СССР.

Кожны наш з'езд—гэта справаздача перад народам аб тым, што мы зрабілі, і распрацоўка планаў на будучыню. Галоўны наш клопат цяпер—рашуча выступаць супраць дробнатэм'я і стылізатарства, шукаць новыя шляхі ўзаемасувязей сацыялістычных культур, ствараць грамадска значныя натхнёныя творы, прасякнутыя сапраўдным прафесійным майстэрствам.

З году ў год умацоўваюцца сувязі мастакоў Савецкай Беларусі з жыццём народа. Прыкметны сёння той рэальны ўклад, які наша выяўленчае мастацтва ўносіць у адзіную інтэрнацыянальную культуру нашай роднай краіны.

Мы, мастакі, акрылёны ўвагай народа і клопатамі роднай Камуністычнай партыі. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі прыняў пастанову «Аб мерах па далейшаму развіццю выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы». Гэтая пастанова прасякнута клопатамі аб тым, каб выяўленчае мастацтва нашай рэспублікі квітнела, каб яно паспяхова служыла інтарэсам савецкага чалавека—нашага сучасніка, каб яно акрылялa чалавека. Гэтая пастанова прасякнута і патрабавальнасцю да нас, мастакоў Савецкай Беларусі. Так, у пастанове, у прыватнасці, падкрэслена: «...вынікаючыя з рашэнняў XXIV з'езда КПСС задачы далейшага павышэння ролі літаратуры і мастацтва ў камуністычным выхаванні савецкіх людзей патрабуюць ад майстроў выяўленчага мастацтва рэспублікі яшчэ больш актыўнай работы па стварэнню твораў, значных па думцы, яркіх па форме і мастацкаму ўвасабленню, якія б адпавядалі высокім духоўным запатрабаванням працоўных. Зладжанасць і дакладнасць у рабоце павінны характарызаваць дзейнасць праўлення Саюза мастакоў БССР і яго творчых фарміраванняў. Больш увагі і дапамогі майстрам пэндзля і разца патрабуецца з боку партыйных і савецкіх органаў».

Пастанова ЦК КПБ, якая намячае шэраг канкрэтных мер па далейшаму развіццю выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы, з вялікім задавальненнем успрынята намі. Яна накіроўвае нас на яшчэ большую патрабавальнасць да сябе. Яна канкрэтна вызначае асноўныя кірункі нашай дзейнасці.

Час патрабуе яшчэ больш цеснага саюза працы і мастацтва. Менавіта ў гэтым кірунку сканцэнтравана асноўная ўвага новага складу праўлення Саюза мастакоў БССР. Характарызаваць работу Саюза мастакоў БССР за параўнальна невялікі перыяд пасля IX з'езда мастакоў рэспублікі — значыць гаварыць пра пачынанні, скіраваныя на садзеянне ідэйна-творчаму росту мастакоў, на адлюстраванне багацця нашай савецкай рэчаіснасці.

Адной з форм арганізатарскай работы, падпарадкаванай актывізацыі творчасці мастакоў, з'яўляецца фарміраванне творчых брыгад мастакоў для выездаў на прамысловыя прадпрыемствы, у калгасы і саўгасы рэспублікі, у воінскія часці і ў пагранічныя войскі дзеля збору матэрыялаў да сваіх будучых твораў, а таксама дзеля аказання шэфскай дапамогі на месцах — правядзення кансультацый, чытання дакладаў і лекцый па пытаннях мастацтва, арганізацыі выставак і г. д.

Несумненна, што ў працэсе жывой практыкі дзейнасць брыгад будзе ўдасканальвацца і будуць нараджацца новыя формы ўмацавання сувязей мастацтва з жыццём народа.

З пачуццём вялікай адказнасці перад народам і партыяй рыхтуюць майстры выяўленчага мастацтва свае творы да прадстаячых мастацкіх выставак. Усяго ў 1973 годзе будзе арганізавана больш 15 абласных, рэспубліканскіх і замежных выставак выяўленчага мастацтва нашай рэспублікі. Мяркуем, што беларускія мастакі прымуць удзел больш чым у пяці ўсесаюзных мастацкіх выстаўках.

Найбольш значныя з выставак гэтага года, у якіх прымуць удзел нашы майстры, гэта—«Беларусь сацыялістычная», выстаўка новых узораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва для масавай і серыйнай вытворчасці, выстаўка твораў групы беларускіх мастакоў у Маскве, выстаўкі твораў выяўленчага мастацтва нашай рэспублікі ў Запарожжы, Львове, Польскай Народнай Рэспубліцы, Народнай Рэспубліцы Балгарыі, у Італіі і г. д.

Летам 1973 года будзе ўведзены ў строй новы выставачны павільён Саюза мастакоў БССР. Да адкрыцця гэтага павільёна будзе наладжана вялікая рэтраспектыўная выстаўка твораў жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Сёння на стварэнне новых твораў да новых выставак ужо заключана больш 170 дагавораў з мастакамі. Многія з мастакоў натхнёна працуюць над новымі творамі. Так, напрыклад, мастакі А. Шыбнёў, З. Азгур, Л. Гумілеўскі, К. Касмачоў працуюць над творамі, прысвечанымі У. І. Леніну. М. Савіцкі і М. Данцыг працуюць над палотнамі, прысвечанымі сучаснай тэме, а В. Цвірко і В. Грамыка—над эпічнымі пейзажамі. Гісторыка-рэвалюцыйнай тэме прысвячаюць свае новыя работы Я. Зайцаў, П. Крохалеў, А. Малішэўскі. Новыя серыі графічных лістоў распрацоўваюць А. Паслядовіч і А. Кашкурэвіч. Ды хіба пералічыш усе цікавыя і змястоўныя задумы.

Нямала прадстаіць зрабіць Саюзу мастакоў БССР і ў галіне эстэтычнага выхавання школьнікаў і моладзі. Дастаткова сказаць, што гэтаму пытанню неўзабаве будзе прысвечаны спецыяльны пленум праўлення Саюза мастакоў рэспублікі.

Шмат праблем ставіць перад намі творчасць мастакоў у прамысловасці і работа прадпрыемстваў Мастацкага фонду БССР, работа студый выяўленчага мастацтва і далейшае ўмацаванне ролі крытыкі і мастацтвазнаўства ў нашым творчым працэсе. Гэтыя і многія іншыя праблемы, якія стаяць перад намі, у той ці іншай форме будуць закранацца на ўсесаюзным з'ездзе. Так што гэты з'езд для нас з'явіцца важнай вяхой у нашым творчым жыцці.

Радасна адчуваць, што ў нас багата клопатаў, што ўсе гэтыя клопаты—творчыя, што нас акрыляе вялікая ўвага савецкага народа да нашай творчасці, што нас акрыляюць клопаты роднай Камуністычнай партыі. Радасна, што сёння мастакі ўсіх пакаленняў мабілізуюць свае творчыя сілы, натхненне, талент, усе веды і вопыт на выкананне высокіх і ганаровых задач, пастаўленых перад савецкім мастацтвам партыяй і народам.

НАШЫ МАЙСТРЫ ЖЫВАПІСУ

ШЧАСЛІВАЙ ТВОРЧАЙ ДАРОГІ

Вось цяпер, калі перада мною ляжыць белы аркуш паперы і я збіраюся расказаць пра свайго сябра Абрама Іосіфавіча Кроля, якому гэтымі днямі спаўняецца шэсцьдзесят, мне адразу ўспамінаецца эскіз да яго работы «Забастоўка грузчыкаў». Грузчыкі, якія адмовіліся грузіць у вагоны нарабаванае акупантамі збожжа, нібыта ажылі перада мною. Я бачу іх магутныя натруджаныя рукі, якім не жыць без справы, але якія цяпер адпачываюць, гатовыя ў любы момант сціснуцца ў кулакі для барацьбы з ворагамі. Урэзалася ў памяць смелая і выразная кампазіцыя карціны... На жаль, мы не можам яе ўбачыць. Яна загінула дзесьці ў вайну...

А. Кроль — выпускнік Віцебскага мастацкага тэхнікума, атрымаў выдатную прафесійную падрыхтоўку. Настаўнікі навучылі яго высокай грамадзянскасці, улюбёнасці ў справу, якой служыш, працавітасці.

Пасля заканчэння графічнага аддзялення тэхнікума Абрам Іосіфавіч працаваў у Беларускім дзяржаўным выдавецтве ў Мінску. Ён з захапленнем афармляў зборнікі вершаў тады яшчэ маладых паэтаў Петруся Броўкі і Аркадзя Куляшова, празаіка Эдуарда Самуйлёнка.

Аднак маладога мастака захапляе жывапіс і неўзабаве ён пачынае працаваць над жывапіснымі кампазіцыямі. Работы «Забастоўка грузчыкаў» і «Радзіма кліча» — адны з першых, якія атрымалі прызнанне і адабрэнне таварышаў па мастацтву і гледачоў.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, А. Кроль змяніў пэндзаль на зброю, змагаўся за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Пасля вайны мастак працягвае працаваць над гісторыка-рэвалюцыйнай тэмай, якая па-ранейшаму яго хвалявала. Ён піша своеасаблівую трылогію «Перад вобыскам», «Пасля Курлоўскага расстрэлу», «Абвяшчэнне Савецкай улады ў Беларусі», у якой расказвае аб пачатку рэвалюцыі, яе перамозе.

З тонкім мастацкім пачуццём ён перадаў трывожнасць моманту ў палатне «Перад вобыскам». Дзеянне карціны «Пасля Курлоўскага расстрэлу» мастак перанёс у бальнічную палату. Да параненых прыйшлі іх паплечнікі — рабочыя, рэвалюцыянеры. У гэтай кампазіцыі, напісанай лёгка і свабодна ў высакароднай маляўнічай гаме, А. Кроль дае глыбокую псіхалагічную характарыстыку персанажам.

Трэцяя карціна трылогіі — «Абвяшчэнне Савецкай улады ў Беларусі» хвалюе сваім пафасам, урачыстасцю моманту.

Натуральна, што ў пасляваенныя гады з'яўляецца ў мастака і шэраг работ, прысвечаных гераізму савецкага чалавека на вайне: «Баявое заданне», «Мінскі кацёл» і інш.

Шмат часу і натхнення аддае А. Кроль рабоце над вобразам народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Эмацыянальнасцю гучання, завершанасцю кампазіцыі выдзяляецца карціна «Янка Купала і Цётка ў Пецярбургу».

Уражвае і другая работа А. Кроля, прысвечаная паэту, — «Дума пра Радзіму». Зіма. Гранітная набярэжная Нявы. Прытуліўшыся да парапета, глыбока задумаўшыся, стаіць паэт. Знаёмыя рысы твару... У вачах—трывога. Халодны каларыт карціны прымушае і нас хвалявацца разам з паэтам.

Заслугоўваюць увагі пейзажы А. Кроля. Яны прасякнуты паэзіяй, лірыкай, пачуццём захаплення перад дзіўнай непаўторнай беларускай прыродай. Спачатку здаецца, што яны напісаны лёгка. Але гэта толькі здаецца. Сапраўды ж, за імі вялікая праца і вялікая душа мастака. Асабліва ўдаюцца мастаку зімовыя пейзажы. Нейкім шостым пачуццём схоплівае ён танчэйшыя адценні інею, заснежаных далячынь, дзіўнае ззянне лёду... Пейзажы «Белая цішыня», «Снег ідзе», «Прастора», «Цені на лёдзе», «Вёска зімой» і іншыя дазваляюць гаварыць аб вялікай маляўнічай культуры мастака.

Творы А. Кроля шырока вядомы. Яны экспанаваліся на выстаўках у Мінску і Маскве, у іншых гарадах краіны і за рубяжом. Усюды яны карысталіся поспехам, прыцягвалі ўвагу гледачоў.

Абрам Іосіфавіч Кроль, цікавы мастак, уступіў у пару сталасці. Няхай жа яна будзе доўгай і творча ўдалай.

Ул. САКАЛОЎ.

ДУША НЕПАЎТОРНЫХ ІМГНЕННЯЎ

НІБЫ ВІХОР, нясецца ў вогненнай тарантэле жанчына — служанка з бессмяротнага балета С. Пракоф'ева «Рамэо і Джульета» ў пастаноўцы выдатнага савецкага харэографа Л. Лаўроўскага.

Танцуе... Не, не танцуе — застыла ў дынамічнай позе балерына, вядомы беларускі харэограф Ніна Міхайлаўна Стуколкіна.

Застылае імгненне...

Гэтыя скульптуры, выкананыя А. Янсан-Манізер, можна сустрэць у музеях Ленінградскага харэаграфічнага вучылішча і вучылішча тэатральнага мастацтва імя Бахрушына ў Маскве і ў кватэры скульптара.

У прасторнай кватэры цішыня.

Сёння Алена Аляксандраўна Янсан-Манізер, наш гід, шчодра раскрыла перад намі дзверы ў свет служыцеляў культу багіні танца Тэрпсіхоры.

Танец фламенка з балета «Лаўрэнсія».

А. Янсан-Манізер успамінае, як у далёкія гады, захопленая мастацтвам любіміцы Ленінграда — балерыны Ніны Міхайлаўны Стуколкінай, імкнулася ажывіць гліну, удыхнуць у яе музычнасць, рэдкую пластычнасць і натхнёнасць артыстки.

Алена Аляксандраўна пачала ляпіць служанку з «Рамэо і Джульеты» ў выкананні Стуколкінай перад самай вайною, але закончыць не паспела. У жорсткія дні блакады горада сястра скульптара беражліва захоўвала работу. Знясіленая жанчына змочвала рыззё, каб прыкрыць скульптуру, не даць гліне засохнуць. І так усе 900 дзён блакады! І захавала!

Пасля вайны Алена Аляксандраўна закончыла скульптуру. Вось яна перад намі — застылая і жывая...

А вось Стуколкіна ў ролі гордай іспанкі ў фламенка з балета «Лаўрэнсія». Скульптар «ухапіла» галоўнае ў гэтым характары — буйны тэмперамент, нястрымнае імкненне да свабоды, горды непераможны дух...

Пакарае пранізаная негай і гарачай страсцю фігура грацыёзнай персіянкі — Стуколкіна ў «Хаваншчыне». Побач — дачка поўдня Мерседэс з «Дон-Кіхота». У постаці балерыны, якую «захавала» для нас скульптар — бясконцы рух, бязмежнае захапленне жыццём, прыгажосць і грацыя...

У скульптурнай паэме А. Янсан-Манізер назаўсёды засталася вялікая душа і талент балерыны.

У. ПАНОЎ.

Мерседэс у балеце «Дон Кіхот».

ПРЫЗНАННЕ ТАЛЕНТУ

Народны мастак Беларусі Міхаіл Савіцкі ўдастоены звання лаўрэата Міжнароднай выстаўкі рэалістычнага жывапісу ў Сафіі.

Міжнароднае журы адзначыла прэміяй карціну мастака «Партызанская мадонна». Імя М. Савіцкага названа ў ліку дзесяці іншых лаўрэатаў міжнароднага агляду.

Тэма гераізму ў Вялікай Айчыннай вайне займае асаблівае месца ў творчасці мастака. Яна адлюстравана ў яго лепшых палотнах: «Партызаны», «Пакараныя смерцю», «Віцебскія вароты» і іншых. З творамі М. Савіцкага знаёмы гледачы многіх краін свету, дзе праходзілі выстаўкі беларускага жывапісу.

Карціна «Партызанская мадонна» экспануецца ў пастаяннай экспазіцыі Траццякоўскай галерэі.

Прысуджэнне міжнароднай прэміі — прызнанне вялікага таленту беларускага жывапісца.

ФАНТАЗІЯ. ТАЛЕНТ. ГУСТ.

ДЛЯ СУЧАСНАГА чалавека грамадскі інтэр'ер стаў неад'емнай часткай быту. Мы ўспрымаем яго іншы раз, нават не задумваючыся, як нешта зусім натуральнае. А між тым інтэр'ер грамадскага памяшкання — кафэ, магазіна, рэстарана, танцавальнай залы, хочам мы таго ці не, уплывае на нас. На наш густ, на наша пачуццё прыгожага. Ён з'яўляецца адным з мноства фактараў, якія фармуюць наш эстэтычны ідэал. І таму, пытанне які ён — інтэр'ер грамадскага памяшкання, якую эмацыянальную нагрузку нясе ў сабе, наколькі адпавядае катэгорыям прыгажосці і зручнасці — пытанне важнае і надзённае.

Жадаеце пераканацца ў гэтым? Зойдзем у сталічны рэстаран «Папараць-кветка» і ў магазін «Кветкі», што на Ленінскім праспекце ў Мінску...

Рэстаран «Папараць-кветка». Збудаваны яшчэ ў 1932 годзе, стары рэстаран памаладзеў. Гэтым мы абавязаны групе супрацоўнікаў інстытута «Белгіпрагандаль» на чале з архітэктарам Г. Сысоевым.

У асноўным аўтарская задума ўдалася. Зразумела, што наведвальнікі — людзі з розным густам і поглядамі. Таму кожны ставіцца да новага інтэр'ера па-свойму. Але большасць сыходзіцца на адным: зроблена цікава, самабытна. І сапраўды, аўтары трапна выкарысталі ў інтэр'еры рэстарана народныя матывы.

Вялізную залу падзяляюць два шэрагі калон-прасценкаў, зробленых з белага пластыку. Калоны гэтыя маюць вокны розных памераў, у якіх — дзівосныя птушкі. Яны быццам сышлі з прыгожых беларускіх ручнікоў. Птушкі гэтыя ўвечары падсвечваюцца ліхтарамі розных колераў. На сцэне цікавы вітраж — маленькая частка пушчы з «сакрэтам». Калі іграе аркестр, уключаецца «колерная музыка», і вітраж пачынае іскрыцца і пераліваецца ўсімі фарбамі. Панелі, як у зале, так і ў холе, абшыты лакіраванымі дошкамі. Сталы і крэслы таксама драўляныя — знарок грубыя. Усё вырашана строга і проста, без лішняй мудрагелістасці. Хол прасторны і светлы, вельмі ўдала вырашана і лесвіца, хаця па сваім халаднавата-ўрачыстым стылі яна крыху «выбіваецца» з агульнага ладу рэстарана.

А вось магазіну «Кветкі» (архітэктар — Г. Губіш) не пашанцавала. Ці то фантазія «падвяла» аўтара, ці то наведвальнікі магазіна проста занадта прыдзірлівыя. Але факт застаецца фактам. Дырэктар магазіна толькі рукамі разводзіць: «Не падабаецца магазін пакупнікам»...

Чорныя сцены падсвечаны спецыяльнымі асвятляльнікамі, якія, відаць, па задуме архітэктара, павінны стварыць паўзмрок; люстэркі — астаткі былой раскошы, столь — здалёк нагадвае арматурную рашотку. Усё астатняе свабоднае месца на сценах занята пафарбаванымі ў шэра-белы колер дошкамі, за якімі гарыць змрочнае святло. Вокны таксама былі закрыты гэтымі дошкамі, але супрацоўнікі магазіна іх знялі — нават прапаваць было немагчыма.

Аўтар так «захапіўся» сваёй работай, што ў пагоні за «звышсучасным»... «забыўся» зрабіць прылаўкі і паліцы, на якіх павінен знаходзіцца тавар. Вось і вымушаны прадаўцы выстаўляць кветкі на сталах і падлозе. Гандлёвы вугал такім чынам займае паўмагазіна. А ўздоўж сцен вертыкальныя керамічныя трубы. Магчыма, тут архітэктар планаваў размясціць тавар? Магчыма. Але трубы стаяць уздоўж сцен, а кветкі ў кутку. Поўная дысгармонія!..

Кажуць, што дарыць кветкі, як і атрымліваць іх — радасць. І, відаць, магазін кветак павінен быць тым месцам, дзе нараджаецца гэта радасць. Але з магазінам «Кветкі» гэтага не адбылося.

Чаму?

З гэтым пытаннем я звярнуўся да Сяргея Пятровіча Каткова, які шмат год быў старшынёй афарміцельскага савета Мінскага мастацкага камбіната.

— На мой погляд, — сказаў ён, — адна з асноўных прычын няўдалых інтэр'ераў — адсутнасць узаемаразумення ў працы архітэктара і мастака. Як гэта ні дзіўна, але мастака запрашае не архітэктурная арганізацыя, якая вядзе распрацоўку, а непасрэдна заказчык. І запрашае не разам з дойлідам, а пасля таго, як той ужо скончыў сваю частку работы. Мастаку прапануюць на «вольнай» плошчы «прыляпіць» ці намаляваць нешта такое, што адпавядала б задуме архітэктара. У гэтым выпадку рэдка ўдаецца зрабіць нешта цікавае, самабытнае. Вельмі ж цяжка «дапісаць» твор, задуманы і пачаты іншым.

Відаць, настаў час ствараць творчыя групы, у якія ўваходзілі б і архітэктары і мастакі. Працаваць над афармленнем яны пачыналі б разам. І хай бы інтэр'ер нараджаўся ў спрэчках, у сумесных пошуках.

Вось паглядзіце — «Кветкі» рабіў архітэктар без мастака. Той жа архітэктар Г. Губіш (сумесна з П. Шварцманам) працаваў і над стварэннем інтэр'ера беларускага аддзялення АДН, але працаваў ужо **разам** з мастаком А. Зіменка. Вынік — выдатны. Магчыма, магазін проста аўтарская няўдача, але, што ні кажы, саюз мастака і архітэктара — гэта цудоўна. Дзе памыліцца адзін, паправіць другі. Бо абодва яны — мастакі ў шырокім сэнсе гэтага слова.

Аб неабходнасці творчай садружнасці паміж архітэктарам і мастаком сведчыць і вопыт стварэння інтэр'ера ў вялікай танцавальнай зале ў парку культуры і адпачынку імя Чэлюскінцаў (архітэктар П. Бяляеў, мастакі А. Валатовіч, В. Мігаль, В. Позняк). Аўтарам былі, як кажуць, даны ўсе карты ў руках: стварай, выдумляй, спрабуй. Але яны адмовіліся спрабаваць і выдумляць. Не, не падумайце, што тут няма ўсяго «неабходнага» для сучаснага інтэр'ера. Ёсць і сцены, абабітыя лакіраванымі дошкамі, і вялізнае пано (трэба сказаць — прыгожае), і крэслы з маленькімі столікамі... А вось інтэр'ера няма. Таму што інтэр'ер — гэта цэлы комплекс узаемазвязаных рэчаў. Яны могуць быць выраблены з розных матэрыялаў, створаны ў розных стылях, пафарбаваны ў розныя колеры. Бяздумны набор інтэр'ерных аксесуараў нічога не дае.

На Мінскім мастацкім камбінаце мне гаварылі, што ў танцавальнай зале мастакі толькі пісалі пано, усё астатняе рабіў архітэктар. Але наведвальніка ж гэта зусім не цікавіць — ён бачыць вынік агульнай працы.

Мы ставімся да інтэр'ера, як да мастацтва. Мы так і гаворым — «мастацтва інтэр'ера». Гаворым не таму, што сучасны інтэр'ер ствараюць мастакі, а таму, што ён патрабуе ад выканаўцаў тых жа адносін да працы, што і любы мастацкі твор.

Здаецца, наспела пара выпрацаваць пэўныя крытэрыі, з якімі трэба падыходзіць да твораў мастацтва інтэр'ера. Трэба азірнуцца на зробленае, падсумаваць здабыткі і прааналізаваць пралікі. Лепш за ўсё гэта можа зрабіць выстаўка. Выстаўкі работ мастакоў-афарміцеляў з поспехам прайшлі ў Ленінградзе і Львове, Вільнюсе і Кемерава, Навасібірску і Краснаярску. Вялікую карысць яна прынесла б і ў Мінску.

Мастацтва інтэр'ераў упэўнена ўвайшло ў наш быт. Перад афарміцелямі стаяць новыя творчыя праблемы. Яны павінны адрозніваць сапраўднае ў асваенні спадчыны ад падробак, клапаціцца аб узаемаадносінах формы і зместу, умець звязаць прызначэнне памяшкання, яго функцыю з патрабаваннямі тых, для каго яны ствараюцца.

В. ДОБКІН.

ТАКАЯ Ў ЯГО ПРАФЕСІЯ...

НЕ ТАК ДАЎНО некаторыя з жыхароў Мядзеля ўзбуджана заходзілі ў РДК і, адводзячы ўбок дырэктара Уладзіміра Якуціна, таямніча пыталіся: «Слухай, а пра мяне там гаварыць... будзеце?». Пачуўшы сцвярджальны адказ, пачыналі ўпрошваць: «Будзь чалавекам, выкінь мяне з вашых прышевак. Дужа вострыя яны ў вас атрымліваюцца».

Раённы дом культуры рыхтаваў чарговы тэматычны вечар. На гэты раз ён называўся «Агонь па алкаголіках» і, як заўсёды, быў пабудаваны на мясцовым матэрыяле. Вось чаму аб'ява каля дома культуры так усхвалявала тых, хто адчуваў, што трапіў па сатырычную ноту.

Выступалі пракурор, галоўны ўрач бальніцы, людзі, што прыйшлі ў клуб. Выступалі і ўдзельнікі самадзейнасці. Доўга ў той вечар свяцілі вокны раённага дома культуры...

Сюды заўсёды прыходзяць з ахвотай. Мядзель — невялічкі гарадок, тут усе ведаюць адзін аднаго. Дом культуры — гэта і адпачынак, і цікавы фільм, і магчымасць сустрэцца юнаку і дзяўчыне, каб разам правесці час. Асабліва любяць у Мядзелі тэматычныя вечары, што праводзяць у РДК, таму што кожны з іх будзе праблемы з выдумкай, з густам, з захапленнем. Менавіта так працуюць работнікі раённага дома культуры Софія Навумаўна Ходас, чалавек, фанатычна аддадзены культрабоце вось ужо дваццаць сём гадоў, Уладзімір Якуцін. Праўда, стаж работы Уладзіміра значна меншы — усяго пяць гадоў. Ды і па спецыяльнасці ён не культработнік, а дырыжор-харавік: закончыў Гродзенскае педагагічнае вучылішча. Увогуле, з дзяцінства Валодзя марыў пра музычную адукацыю, і нават лёс яго склаўся спрыяльна для таго, каб мара гэтая ажыццявілася. У Ратамскім дзіцячым доме, куды яго, пітага ў сям'і, накіравалі пасля гібелі бацькі, звярнулі ўвагу на музычныя здольнасці маленькага чарнявага хлапчука.

Валодзя думаў, што некалі яму давядзецца працаваць у самадзейнасці, і, прыехаўшы ў Мядзельскую музычную школу выкладчыкам, часта заглядваў у РДК. Меў добры голас, таму ў хуткім часе стаў вядучым салістам вакальнай групы. З'яднаў вакол сябе іншых спевакоў. Паступова стаў выступаць у канцэртах і як чытальнік, затым — вядучы.

І ўсё-такі, калі ў райкоме камсамола яму прапанавалі пайсці дырэктарам дома культуры, Уладзімір наадрэз адмовіўся: «Дысквалыфікуюся». Але жаданне паспрабаваць свае сілы на новым, нязведаным яшчэ ўчастку работы перамагло.

Пяць гадоў работы на пасадзе дырэктара РДК далі магчымасць Уладзіміру заявіць аб сабе як аб здольным арганізатару. Прынамсі, шмат у якіх конкурсах Мядзельскі раённы дом культуры атрымлівае прызавыя месцы. Апошні з гэтых конкурсаў — работа клубаў у зімовых умовах.

Зімою, калі маўклівыя заснежаныя палі нібы наступаюць на гарадок, дом культуры здаецца асабліва ўтульным. Кожны вечар тут збіраюцца паслухаць лекцыю, паглядзець кіно, а раніцай, як заўсёды, пачынаюцца рэпетыцыі. З чым асабліва нялёгка работнікам РДК — дык гэта з колькасцю самадзейных артыстаў. У Мядзелі — ледзь за тры тысячы жыхароў, аўтарытэт жа раённага дома культуры патрабуе такой самадзейнасці, якая б стала ўзорам для сельскіх клубаў. А гэта не заўсёды ўдаецца. Сёлетні справаздачны канцэрт прынёс Уладзіміру Якуціну нямала клопатаў, хаця і атрымаў нядрэнную ацэнку журы. Перш за ўсё таму, што рыхтаваць канцэрт давялося, бадай, што, аднаму: Софія Навумаўна захварэла, загадчык аддзела культуры быў у адпачынку. Па-другое, малады дырэктар сам адзначыў, колькі яшчэ трэба працаваць над тым, каб мастацкая самадзейнасць магла сапернічаць з тым, што паказваюць па аглядах іншыя раёны рэспублікі.

Уладзімір умее быць патрабавальным да сябе і невялікага калектыву, які ўзначальвае, умее быць рупным гаспадаром, хаця прызнаецца, што розныя гаспадарчыя і адміністрацыйныя клопаты забіраюць зашмат з той энергіі і заўзятасці, якую можна было б аддаць творчай рабоце. Каму з дырэктараў невядома, як нялёгка збіраць сродкі на спецрахунак. Спецрахунак — гэта магчымасць прыдбаць неабходнае для клуба, узнагародзіць актывістаў, вывезці па агляд самадзейных артыстаў... Вось чаму шмат хто з дырэктараў клубаў ідзе па самаму лёгкаму шляху — танцы, і на танцавальныя вечары прадаецца столькі білетаў, колькі можа ўмясціць у сабе зала. Адсюль — пастаянае напружанне ў выхадныя дні, розныя надзвычайныя здарэнні, нарэшце, нізкая культура такіх вечароў. Але ж ідуць на гэта свядома — маўляў, які эканамічны выйгрыш!

У Мядзельскім РДК на спецрахунку не пуста, хаця на танцавальных вечарах тут досыць прасторна і спакойна. Затое культработнікі рыхтуюць шмат канцэртаў, выступаюць з імі ў дамах адпачынку на Нарачы, у вёсках. Пры РДК адкрыты мастацкія майстэрні, дзе не толькі працуюць для дома культуры, але і прымаюць заказы на афармленне наглядная агітацыі ад калгасаў і ўстаноў раёна.

А самае цікавае ў РДК — гэта масавыя святы песні, якія штогод праводзяцца ўлетку.

Ля блакітна-зеленаватай Нарачы ўзвышаецца вялізны белы абеліск. Калі ўзыдзеш да яго па шырокіх каменных прыступках, адкрываецца неаглядная прастора азёраў, сенажацей, палёў. Прыгожы край Мядзельшчына. Унізе, дзе пачынаюцца прыступкі, ёсць шырокая пляцоўка. Там праходзяць канцэрты. З раніцы прыязджаюць сюды з усіх навакольных вёсак, і песні, што спявае зводны хор, ляцяць далёка, аж за Нарач... За песнямі ідуць танцы, вершы, прыпеўкі... Колькі сіл аддадзена аднаму такому дню, ведаюць толькі работнікі аддзела культуры і РДК. Валодзя звычайна выступае як запявала. І яму дастаецца больш чым каму. Але энтузіязму і спрыту ў яго хапае. Высокі, шыракаплечы, ён нагадвае спартсмена — ён і сапраўды раней шмат займаўся спортам. Цяпер цалкам аддае сябе рабоце і яшчэ аднаму, самаму любімаму занятку — песні. Ён піша музыку на словы мясцовых аўтараў. Ёсць у яго некалькі твораў і на вершы вядомага земляка — народнага паэта Беларусі Максіма Танка. Песні гэтыя лірычныя, мяккія, са сваёй індывідуальнасцю. А паколькі ён сам выконвае іх, то і інтанацыю знаходзіць своеасаблівую, непаўторную. Выступленні дырэктара Мядзельскага дома культуры заўсёды нарыстаюцца вялікім поспехам. І гэта невыпадкова — добрыя знешнія даныя, арыгінальныя творы, што выконвае малады спявак, нарэшце, яго голас і культура спеваў — усё гэта дае падставу спадзявацца, што аўдыторыя яго будзе з часам пашырацца.

Мядзельскі дом культуры — адзін з многіх ачагоў культуры нашай рэспублікі. Не сакрэт, што не ўсе з іх працуюць з поўнай аддачай, з запалам. Але, у асноўным, людзі, якія выбралі прафесіяй культработу — гэта энтузіясты сваёй справы, яны ніколі не ведаюць спакою. Заўсёды ў напружанні, у пошуках, таму, што культработа, як ніякая іншая, не ўкладваецца ў старыя, устойлівыя формы. Кожнае мерапрыемства — вечар, дыспут, лекцыя — своеасаблівы экзамен. І так — дзень за днём, год за годам. Уладзімір Якуцін належыць да тых, хто, пакутуючы ад няўдач, настойліва імкнецца пераадолець цяжкасці, знайсці свой стыль работы, сваю «жывінку». Такая ў яго прафесія...

В. ІПАТАВА.

СТАРЭЙШАГА звалі Фёдарам Анатольевічам, маладога — Юрам. Бацька і сын Гарноўскія вярталіся з поўдня, дзе адпачывалі.

Юра, падлетак у модным світэры, гартаў часопіс. Фёдар Анатольевіч моўчкі сядзеў на канапе, уставіўшыся цёмнымі акулярамі ў акно. Цягнуліся заснежаныя палі, праплывалі пералескі.

Юра зрэдку выходзіў даведацца, якую станцыю праехалі, і, вярнуўшыся, зноў браўся за часопіс.

За акном прамільгнуў паўустанак.

— Віленскі праехалі, — падняўшы галаву ад часопіса, заўважыў Юра.

— Не Віленскі, а Веленскі, — удакладніў бацька.

— Адкуль ты ведаеш? — засумняваўся Юра.

Фёдар Анатольевіч не адказаў.

Веленскі, Пухавічы, Талька, Асіповічы... Да вайны ён, Фёдар, часта ездзіў гэтай дарогай і таму добра ведаў усе тутэйшыя станцыі і паўустанні. Асабліва выразна ўсплываюць у памяці гэтыя мясціны, калі згадваецца ваенны час. Разбітыя пакгаўзы, чорныя, абгарэлыя вагоны, пакручаныя, раскіданыя вакол варонак рэйкі і шпалы.

Фёдар Гарноўскі рана, васьмігадовым хлопчыкам пазнаў жахі вайны, бачыў расстраляных і павешаных, адведаў голад і холад, разам з дарослымі перанёс у партызанскім лесе блакаду.

Здаецца, нічога гераічнага не зрабіў. Але калі ўспомніць, што яго жывым пахавалі, што ён аслеп, трапіў у дом інвалідаў і не скарыўся, то стане ясна, што мінулае яго жыццё — гэта складаны шлях.

Жыццё не запраграміруеш. Яно поўнае нечаканасцей. І калі чалавек слабы — ён адчайваецца, апускае рукі, не жыве, а існуе. Перамагаюць, кідаюць выклік хваробе, лёсу толькі моцныя духам людзі.

Фёдар Анатольевіч якраз з такіх вынослівых і вытрыманых, мужных людзей — ён дабіўся свайго: акрыяў і зноў, як воін, вярнуўся ў строй. Не дзень, не месяц, не год ішоў да сваёй мэты...

— Вось і праехалі родныя мясціны, — уздыхнуўшы, прагаварыў старэйшы Гарноўскі, як бы адказваючы на пытанне сына, адкуль ён ведае назвы станцый па гэтай чыгунцы.

І ўсё-такі Юра не зразумеў, перапытаў:

— Чаму родныя?

— А таму, што тут прайшло маё дзяцінства.

У Юры дзесьці ў глыбіні душы падсвядома варухнулася думка: «Дык я ж нарадзіўся ў Мінску...»

— Гэта пазней ужо я прыехаў і абжыўся ў гэтым горадзе, — быццам разгадаўшы, аб чым думае зараз Юра, адказаў бацька.

Ён адчуў, з якой цікавасцю слухае яго сын, і працягваў:

— У гэтых мясцінах мы партызанілі. Каля Веленскага і Талькі не адзін эшалон з нямецкімі тан-

---

МАЛЮНКІ РОДНАГА КРАЮ

НЕБЫВАЛЫ размах набывае народная мастацкая творчасць у наш час, становіцца больш актыўным працэс абнаўлення вырабаў. І нельга не заўважыць, што сёння змяняюцца формы, вобразнасць.

Менавіта пад уражаннем новых умоў шырэй раскрываецца талент івянецкіх ганчароў Івана Малчанава, Станіслава Адамовіча, Міхаіла Звярко, жлобінскіх інкрустатараў Веры і Міхаіла Дзегцярэнкаў, брэсцкай майстрыхі пляцення з саломкі Веры Гаўрылюк, івянецкай ткачыхі Марыі Сасунко і іншых. Творчай адметнасцю ў трактоўцы мастацкага вобраза, тэхніцы разьбы вызначаюцца работы Валянціна Альшэўскага — анамалістычная і жанравая пластыка, Дзмітрыя Сталярова, Анатоля Міхеенкі, Івана Астрамовіча («Гусляр» і «Юнацтва»), Міхаіла Івінскага, асабліва яго трыпціх «Беларускія партызаны».

Асобнае месца ў народнай творчасці апошніх гадоў займае тэматычная разьба: рамантыка-рэвалюцыйных гадоў, героіка грамадзянскай і Айчыннай войнаў, сюжэты з сучаснага жыцця. Гэтыя тэмы былі галоўнымі і на апошняй выстаўцы.

Многія беларускія рэзчыкі працуюць над стварэннем утылітарных вырабаў: гладышоў, чарпачкоў, лыжак, кухонных карытцаў (Паліна Гладыкава і Аляксандр Рабцаў). Бандарныя традыцыі працягваюць майстры вёскі Рыловічы Брэсцкай вобласці Аляксей Казак, Міхаіл Тынавец і Фёдар Казакевіч. Але створаныя імі сувенірныя кадушачкі невялікай ёмкасці з цягам часу прыкметна змяняюцца, іх форма становіцца ўсё больш вытанчанай, удала спалучаецца з розным арнаментальным дэкорам, а функцыянальныя дэталі рэчаў (кранікі, крышкі) становяцца і дэкаратыўнымі элементамі.

Экспазіцыя кожнай новай выстаўкі народнай творчасці чаруе тонкай гармоніяй колеру, высокай культурай рытмаў, кампазіцыяй ручнога ўзорнага ткацтва, якое нязменна дамінуе ў выставачных залах. Яркія і прыгожыя посцілкі — дываны Марыі Зык, Любы і Таццяны Жураўлевіч, Алены Яскельчык і іншых пераклікаюцца сугуччам колераў і арнаментыкай з ручнікамі майстрых вёскі Моталь Брэсцкай вобласці, вёскі Неглюбка Гомельскай вобласці. І нам здаецца, што ручныя ўзоры ткацтва былі такімі ж яркімі, прыгожымі заўсёды. Аднак гэта толькі на першы погляд.

За апошнія гады многае змянілася і тут. Ткачыхі ўводзяць у кампазіцыі ўсё новыя колеры, новыя элементы дэкора. На чорным фоне каймы посцілкі Ганны Мірановіч з Гомельскай вобласці раптам узнікае стылізаванае адлюстраванне стракоз чырвона-зялёнага колеру, а Зінаіда Кедыш з Міншчыны тчэ тонкі па колернай гармоніі мазаічны малюнак з мноства кветак. Ганна Пракопчык распрацоўвае ў тэхніцы ткацтва кампазицыю на сюжэты з сельскага жыцця. Вобразы, узятыя з народнага жыцця, пераплятаюцца са сцэнамі з казак у вышытым дыване Лілії Сідаровіч. Усё гэта новае можна разглядаць як далейшае развіццё ўсталяваных традыцый у народным ткацтве.

Асабліваю цікавасць уяўляе самадзейная мастацкая творчасць, якая нарадзілася ў гады Савецкай улады. Яе рост непарыўна знітаваны з агульным развіццём культуры народа. Мастакі-аматары ставяць перад сабою сур'ёзныя задачы, імкнучыся адлюстраваць у сваіх творах сучасную прыгажосць роднага краю, радасць працы, сімволіку гераізму. Гэта мы заўважаем у палотнах Анатоля Шыдлаўца «Вязальны цэх», Фёдара Хадасоўскага «Уборка льну ў калгасе імя Гастэлы», Георгія Калчына «Лепельшчына», Уладзіміра Цвірко «Бярозы» і іншых. Сярод іх шмат пейзажнай лірыкі. Усё, здаецца, будзённа: пейзаж... Так, але колькі тут настрою, пачуцця, разумення дэталей, рэчаіснасці жыцця! І як сведчанне народнай памяці ўспрымаюцца маляўнічыя карціны Ганны Гаўрыленка «На магіле сябра», Георгія Калчына «Абеліскі». Цікава, па-свойму ствараюць самадзейныя мастакі вобразы сучаснікаў.

Народная мастацкая творчасць шматгранная і, бадай, празмерна складаная, іншы раз супярэчлівая. З аднаго боку яна ўнаследуе векавыя традыцыі, з другога — адчувае моцнае ўздзеянне сучаснага прафесійнага мастацтва. У нейкай ступені гэта заканамерна. Форма — адкрыццё. Адкрыццё эпохі, свету. Мастакі заўсёды шукалі сімвалы свайго часу, імкнучыся сфармуляваць у пластыцы галоўныя паняцці эпохі. Гэта цалкам датычыць і майстроў народнага мастацтва, самадзейных мастакоў, асабліва цяпер, калі ва ўмовах новага быту, змены стылю, патрабуюцца новыя формы. І, як бачна, гэтыя новыя формы пасту-

БУКЕТ ЖЫВЫХ КВЕТАК

камі, боепрыпасамі, салдатамі спусціў пад адхон Анатоль Сцяпанавіч.

— А хто гэта такі — Анатоль Сцяпанавіч, можа мой дзед?

— Ага, твой дзед. Юра. Дык вось, значыць, слухай далей. Да вайны мы жылі ў Дубраўцы. Твой дзед, а мой бацька, працаваў памочнікам машыніста, маці — трактарысткай у Сінчанскай машынна-трактарнай станцыі. Бацька часта браў мяне з сабой у паездкі. Непрыкметна беглі шчаслівыя гады. І раптам — вайна! У нашу вёску ўварваліся фашысты. Марудна пацягнуліся дні ў варожым тыле. Потым бацька забраў нас у лес. Там, у партызанскім лагеры, маці

А неўзабаве ён і другія мужчыны атрада былі залічаны ў адну са стралковых рот Першага Беларускага фронту. Маці, Вольга Трафімаўна, таксама не вярнулася да мірнай працы — пайшла медсястрой у палявы шпіталь, які ўслед за фронтам рухаўся на захад. Вайна працягвалася...

Фёдар больш чатырох гадоў быў прыкаваны да ложка. Трагічная сакавіцкая ноч сорак чацвёртага года не прайшла бясследна. Запаленне, залатуха, слепата — хваробы ўсе разам наваліліся на хлопца. Нягледзячы на намаганні ўрачоў, вярнуць зрок Фёдару не ўдалося.

А потым была школа сляпых

А потым Фёдар Гарноўскі пайшоў працаваць на Мінскае вучэбна-вытворчае прадпрыемства, у шчотачны цэх. Там ён пазнаёміўся з Валодзем Ігнаценкам. Яны пасябравалі адразу, як толькі Фёдар прыйшоў на прадпрыемства. У Валодзі ўжо быў чацвёрты разрад, і ён лічыўся сапраўдным спецыялістам. І Фёдара больш за ўсё хіліла да яго тое, што гэты моцны, упэўнены ў сваіх сілах хлопец трымаецца з ім проста і нараўне. Валодзя Ігнаценка стаў яго нязменным сябрам і настаўнікам.

Фёдару хацелася хутчэй даказаць вопытнаму спецыялісту, што ён, навічок, не лыкам шыты, не дарэмна атрымлівае зарплату.

роценькай пататкі, што не так даўно чытаў на прадпрыемстве ў насценнай газеце «Перадавік»: «Фёдар Гарноўскі— перадавік вытворчасці, вопытны рабочы, чулы чалавек. За што ні возьмецца — хай гэта будзе прабіўка штыфтоў, нарэзка разьбы, гаек, кантактных пласцінак, ці загібка рознага роду клем, ён выконвае заданне з высокай адказнасцю, пры тым прадукцыю выпускае выдатнай якасці...»

У апошні час праявілася яго здольнасць упраўляць не адным, а многімі станкамі. Захварэў неяк рабочы, які працаваў на двухшпіндзельным станку. Замяніць яго ніхто не мог, а дэталі былі патрэбны неадкладна. Пра тое, што станок стаіць, паведамілі начальніку цэха Дзмітрыю Якаўлевічу Козелу.

— А чым заняты Фёдар Анатольевіч? — пацікавіўся той.

— Прабівае штыфты.

— Можна часова спыніць вытворчасць гэтай дэталі і паставіць Гарноўскага на двухшпіндзельны станок.

Так і зрабілі: новыя дэталі пайшлі на зборку і вытворчы працэс на прадпрыемстве не спыніўся.

Юра ўспомніў пра маці, уявіў на імгненне сваю кватэру. У кутку залы свеціцца блакітны экран тэлевізара, акуратна расстаўлены на кніжных паліцах томікі Пушкіна, Чэхава, Коласа, Купалы, тоўстыя кнігі па шрыфту Брайля. Бацька шмат чытае, захапляецца навінкамі тэхнічнай літаратуры.

Юра задумаўся і не заўважыў, як цягнік паступова прыціхнуў ход, спыніўся.

— Мінскі — гучна аб'явіў праваднік.

— Прыехалі, сынок, — на яго плячук лягла бацькава рука, і яны выйшлі з вагона.

Горад сустрэў іх калючым марозікам. Мінулі прывакзальную плошчу, спыніліся на тралейбусным прыпынку, і толькі тады Фёдар Анатольевіч схамянуўся, папрасіў сына:

— Ведаеш, Юра, давай пойдзем пешшу, да плошчы Перамогі.

Яшчэ здалёк Юра ўбачыў, як строга і ўрачыста на ёй узвышаўся абеліск. Нібы вартавыя, стаялі вакол маладыя дрэўцы. Паверхня граніту зіхацела мірыядамі срэбных зорачак. А на самым версе абеліска ў залацістых промнях сонца ярка ззяў ордэн Перамогі.

Фёдар спыніўся каля помніка, дастаў з чамаданчыка загорнуты ў цэлафанавую паперу букецік і, выцягнуўшы ўперад левую руку, асцярожна дакрануўся да гранітнай пліты. Потым павольна паклаў да абеліска кветкі.

— Ну, пойдзем, сынок, — нарэшце ціха сказаў Фёдар. — Мы яшчэ вернемся сюды.

Юра асцярожна ўзяў бацьку пад руку і павёў да тралейбуснага прыпынку. Ідучы поплеч, Юра адчуў, што яго крокі робяцца больш цвёрдымі.

В. ПАДАЛЯКА.

дакала дапамагаць фельчару. Мне таксама давалі даручэнні: хадзіў у разведку, распаўсюджваў лістоўкі, прыносіў у атрад медыкаменты. А потым...

Фёдар Анатольевіч змоўк, дрыжачымі ад хвалявання рукамі дастаў папяросу, закурыў. У яго памяці аднаўляліся падзеі трывожнага сорак чацвёртага года, калі партызанскі атрад імя Суворава апынуўся ў акружэнні.

— А потым,—глуха, як бы праз сілу, зноў загаварыў ён, — выклікае мяне камандзір, кажа: «Маланкай ляці, Федзя, у атрад Данілешкі, перадай, каб паспяшаліся на дапамогу. Ды асцерагайся, не забывай: вакол немцы».

Стрымгалоў кінуўся я выконваць даручэнне, мінуў знаёмую лінію — прасеку, выскачыў на ўзлесак Казінага Рога. Не паспеў перавесці дыханне, агледзецца, як збоку крыкнулі:

— Хальт!

Потым ударыла аўтаматная чарга, дзесьці непадалёку забарабаніў кулямёт. Мноства трасіруючых куль белымі ніткамі прашылі цемру. Я зразумеў, што марудзіць нельга, і крута заламаў у другі бок, у расяробы кустоў на беразе рэчкі. Быў якраз канец сакавіка, лёд пад нагамі не вытрымаў, затрашчаў, і я праваліўся ў ваду.

Астатняе сын ведаў, і Фёдар Анатольевіч змоўк. Юра зноў узяў у рукі часопіс, пачаў чытаць, а бацька ўжо настроіўся на адпаведную думку і працягваў разматваць клубок успамінаў.

На другі дзень пасля здарэння на рэчцы да партызан-«суворaўцаў» падышло падмацаванне: і яны пайшлі ў наступленне, прарвалі варожы ланцуг, выйшлі з акружэння. А Фёдар? Фёдар болей не вярнуўся ў атрад. Выпадкова натрапіўшы на знясіленага падлетка, яго падабралі людзі.

Голасна, як па нябожчыку, плакала маці. Моўчкі, па-мужчынску, пераносіў гора бацька, Анатоль Сцяпанавіч.

дзяцей у Гродна. Доўгі, як тунэль, калідор. Раніцай дзеці займалі свае месцы за партамі. Светлыя класы запаўняліся звонкімі галасамі і крыкамі вясёлых рабят. Сярод іх быў і Федзя Гарноўскі. Настаўнікі любілі яго за выдатную вучобу, дысцыпліну, сябры за вясёлы характар і вернасць таварыскай дружбе.

Ішлі гады. Федзя падрастаў. Вечарам ён спяваў у школьным хоры, прымаў удзел у спартыўных спаборніцтвах, навучыўся чытаць па шрыфту Брайля і цэлымі гадзінамі праседжваў у бібліятэцы над тоўстымі кнігамі. Не раз перачытаў «Як гартавалася сталь», «Аповесць аб сапраўдным чалавеку», «Рускі характар». Захапіўся мадэліраваннем. Недзе і цяпер яшчэ ў школьным гуртку «Нашы ўмельцы» захоўваюцца мадэлі самалёта і парахода, зробленыя яго рукамі.

А пра лёс сваіх бацькоў Фёдар нічога не ведаў. Дзе яны? Што з імі? — неадступна трывожыла думка. Настаўнікі і выхавацелі, як родныя, клапаціліся аб сіраце, вялі пошукі яго бацькоў. Аднойчы прынеслі чарговую пошту, і Галіна Савічна Харчанка, раскрыўшы канверт са службовым штэмпелем, прачытала: «Паведамляем вам, што Анатоль Сцяпанавіч і Вольга Трафімаўна Гарноўскія жывуць у горадзе...» Яна не дачытала ліст, хуценька выбегла ў калідор.

— Федзя, родненькі, — закрычала выхавацельніца, — бацькі твае знайшліся!

Цяжка ўявіць радасць і хваляванне Фёдара ў тыя мінуты. Потым усю ноч, да раніцы, не звёў вачэй. Думаў, чакаў... А назаўтра Ганна Савічна везла Федзю ў Мінск да бацькоў.

Сустрэча! Моцныя абдымкі, успаміны, слёзы... Радасці не было мяжы. Плакала маці, каціліся слёзы па маршчыністым твары бацькі, выцірала ражком хусткі вочы выхавацельніца.

Помніцца, даў Ігнаценка яму ў першы раз выканаць самую простую аперацыю. Узяўся Фёдар за справу і неўзабаве зрабіў першую шчотку. А Ігнаценка маўчыць. І толькі тады Фёдар зразумеў: брак. Не атрымалася і другая шчотка. І Фёдар адчаяўся, хацеў нават кінуць работу: падумалася, ніколі не асвоіць яму прафесію шліфавальшчыка.

Але далёка ззаду засталіся хвароба, роспач, школьныя гады, а наперадзе — незнаёмая прафесія, новыя цяжкасці, роздум, пошукі...

Ды Фёдар Гарноўскі ніколі не шукаў у жыцці лёгкіх дарог. А Ігнаценка не адступаўся: цярпліва вучыў навічка. Фёдар пачаў асвойваць адну аперацыю за другой, налаўчыўся «весці дэталі» на шліфавальным станку. Прадукцыя, што выходзіла з рук Гарноўскага, стала атрымліваць толькі высокую ацэнку. Таму што самым строгім майстрам і кантралёрам стала яго рабочае сумленне.

Тут, на вучэбна-вытворчым прадпрыемстве, Фёдар пазнаёміўся з Інай Андрэеўнай. Працавітая, разважлівая дзяўчына. Яны часта з работы вярталіся разам. І праз нейкі час сябры па рабоце пажадалі маладажонам шчасця ў сямейным жыцці. І шчасце не здраджвае ім: вось ужо пятнаццаць гадоў пастаянна спадарожнічае Гарноўскім.

А на прадпрыемстве пачалі ўступаць у строй усё новыя і новыя цэхі. Неяк Фёдар пачуў, што ў штамповачным не хапае рабочых. Падумаў, пагаварыў з жонкай і пайшоў працаваць слесарам-разьбанарэзчыкам.

Цэх тады рабіў першыя крокі. Многа рабілася ўручную. Але і тут, на новым месцы, Фёдар хутка стаў лепшым рабочым: дэталі, зробленыя яго рукамі, заўсёды прымаліся без адзінай заўвагі...

Юра зноў схіліўся над часопісам, але ён не чытаў — думаў пра бацьку, прыгадаў радкі з ка-

---

пова нараджаюцца, хаця, часам, і не заўсёды ўдала.

Вядучыя майстры народнай творчасці, абапіраючыся на ўсталяваныя мясцовыя традыцыі і ўспрымаючы іх не як строгі канон формы, а толькі як прынцып выяўлення пластычных і дэкаратыўных магчымасцей матэрыялу, дабіліся ў сваіх пошуках значных поспехаў.

Такія адносіны да ўнаследавання мінулага заўважаюцца ў творчасці Веры і Міхаіла Дзегцярэнкаў, калі яны распрацоўваюць новыя арнаментальныя ўзоры для інкрустацыі саломкай драўляных шкатулак і куфэркаў, дэкаратыўных пано. Прыёмы дэкаратыўнага вырашэння дэталей у выглядзе вытачаных вітых пляцёнак, разетак і выпуклых ромбападобных уставак выкарыстоўваліся майстрамі яшчэ XVIII—XIX стагоддзяў. А такія мастакі, як Рыгор Мамаеў і Майсей Кулак, карыстаюцца гэтымі метадамі і сёння, асабліва калі яны ствараюць залацістыя шкатулкі з саломкі. І зусім па-свойму ўжываюць іх Кацярына Арцёменка, Вера Гаўрылюк, Алена Лось. Тут саломка сцягнута тугім жгутам, звіліны, якія раптам ствараюць нечаканыя тонкія пералівы залацістага колеру, спалучаюцца роўнымі рэльефнымі плоскасцямі з прыгожай пляцёнкай; іншы раз пераліўныя сцябліны, разыходзячыся паўкругам у выглядзе бліскучага арэола, ствараюць незвычайны дэкаратыўны эфект (грывы коней у творах «У бой за Радзіму» і «Тройка» Кацярыны Арцёменка).

Распрацоўка новых дэталей у арнаментальных кампазіцыях назіраецца і ва ўзорным ткацтве.

Далейшае развіццё народных традыцый назіраецца і ў разьбе па дрэву. Значнае нахіленне плоскасці, абагульненне формаў з'яўляецца ў працах Дзмітрыя Сталярова «М. Горкі», «Перад боем», Івана Лукі «У пушчы», Міхаіла Івінскага «Беларускія партызаны». Спакойны светла-ценявы малюнак, якому, аднак, не цяжка надаць і моцнае вобразна-драматычнае гучанне, дазваляе аўтарам найбольш поўна высветліць дэкаратыўныя ўласцівасці матэрыялу.

І ўсё ж, адзначаючы цікавыя работы майстроў народнай творчасці, іх прызнанне і папулярнасць, заўважаеш і трывожныя сімптомы. На выстаўках нямала прысутнічае слабых, стандартных твораў, падчас наіўна-бездапаможных, а іншы раз проста дрэнна скапіраваных з прафесійнага мастацтва.

Сутыкаючыся з падобнымі з'явамі, міжволі задаеш пытанне: чаму? Ці не ўстарэлі формы работы з майстрамі народнага і самадзейнага мастацтва, дзе і як мастаку-аматару вучыцца, павышаць свае майстэрства? І калі дэталёва ўсё ўважыць, атрымліваецца неадпаведнасць: колькасць аматараў выяўленчага мастацтва, асабліва сярод моладзі, расце з кожным годам, а колькасць гурткоў, студый, творчых клубаў застаецца на ранейшым узроўні. Часам бывае і наадварот. Невядома, чаму спынілі сваё існаванне студыі выяўленчага мастацтва ў Баранавічах, Навагрудку, Пінску, Оршы, Жлобіне, Наваполацку і Мазыры. Другі год не працуюць яны ў Маладзечна і Барысаве, хаця для іх дзейнасці тут ёсць усе ўмовы.

Нядаўна пры Мінскім абласным доме народнай творчасці адкрыўся творчы клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў, у ім разгорнуты экспазіцыі народнага мастацтва вобласці. У 1970 годзе пачаў працаваць музей народнага мастацтва ў Гродна. Гэта ўжо з'явы прыкметныя. Але ці дастаткова іх? Творчыя клубы, несумненна, ажывяць, адновяць самадзейнае мастацтва, стануць асновай яго творчых аб'яднанняў. Аднак цалкам не змогуць замяніць сабой планамерную мэтанакіраваную працу студый і гурткоў.

Адмоўна сказваецца на развіццё самадзейнай творчасці і адсутнасць у рэспубліцы адзінага метадычнага цэнтра. Толькі карысць прынеслі б разгорнутыя экспазіцыі твораў майстроў народнага мастацтва ў сталічных і абласных музеях. Яны неабходны, як паветра.

Сёння народная і самадзейная мастацкая творчасць знаходзіцца на новым уздыме. Аднак яна патрабуе не толькі арганізацыйна-метадычнай дапамогі, клопату, стымулаў, накіраваных на яе пастаяннае абнаўленне, але і ўсталявання цеснай сувязі праз музейныя экспазіцыі паміж старыной і сучаснасцю. Гэта адна з важнейшых умоў не толькі абнаўлення, але і адраджэння забытых відаў народных вырабаў.

Ф. ВАЛАДЗЬКО,
намеснік дырэктара
Рэспубліканскага дома
народнай творчасці.

МАЙСТЭРСТВА НАРОДНЫХ УМЕЛЬЦАЎ

на фабрыку. Тэмай яе дыпломнай работы была «Вышыўка золатам». Дзяўчына марыла ўпрыгожваць касцюмы, сукенкі. А тут давялося ствараць узоры для наваляч, чахлоў на коўдры. Але яна захапілася работай. Шмат давялося перачытаць кніг, прагледзець альбомаў, каб па-сапраўднаму зразумець характар беларускай народнай творчасці.

Часта бывае Святлана ў вёсках Аршаншчыны. Цікавіць яе тут не толькі вышыўка і карункапляценне. Цікава і з захапленнем расказвае яна пра майстэрства Мікалая Іванавіча Сімянкова з вёскі Дуброўка, які вырабляе на ганчарным станку на дзіва прыгожыя вырабы чорнай керамікі, аб лыжачніках вёскі Марковічы і аб самым умелым з іх — Леанідзе Спірыдонавічы Бераснёве, аб каруначніцы Марыі Аляксандраўне Рылько, залатыя рукі якой ствараюць тонкай прыгажосці ажурныя каўнерыкі, манжэты, прошвы, дарожкі.

Нядаўна прадпрыемства справіла наваселле. Яно размясцілася ў светлым высокім будынку з прасторнымі вытворчымі цэхамі. Самы вялікі з іх — цэх машыннай вышыўкі. Сто дзесяць вышывальшчыц, сорак краўчых вырабляюць за змену сотні ўпрыгожаных вышыўкай навалачак, чахлоў на коўдры, якія ахвотна купляюць у Грузіі, Азербайджане, Малдавіі, Літве, Казахстане. Ствараецца на фабрыцы цэх керамікі, наладжваецца вытворчасць драўляных лыжак.

Сёлета калектыў фабрыкі плануе распрацаваць і ўкараніць у вытворчасць шмат новых карункавых вырабаў. Тут добра разумеюць, што творы народнага мастацтва — гэта больш, чым проста ўпрыгожванні, і беражліва захоўваюць тое, што перадаецца з пакалення ў пакаленне, што з'яўляецца неад'емнай часткай самабытнай культуры народа.

Л. ВОЛЬСКАЯ.

На здымках: 1. Галоўны мастак фабрыкі Святлана Аўраменка.

2. Драўляныя конаўкі, зробленыя аршанскімі майстрамі.

3. Каруначніцы Наталля Грыгаровіч (злева), Валянціна Пілюшкіна, Людміла Ласмакова, Ніна Кандраценка, Валянціна Яскевіч і Валянціна Кулік за работай.

Фота Г. УСЛАМАВА.

(БЕЛТА).

Весела пашчоўкваюць каклюшкі. Спрытна перабіраючы іх, дзяўчаты хутка плятуць карункі. Здаецца, што нараджаюцца яны проста на вачах, перадаючы настрой каруначніц, іх характар, іх разуменне прыгожага. Галоўны мастак прадпрыемства Святлана Аўраменка стварыла для вязальшчыц дзесяткі ўзораў каўнерыкаў, манішак, сурвэтак.

Чатыры гады назад па накіраванню Маскоўскага прамыслова-мастацкага вучылішча імя Калініна прыехала Святлана

ЗМАГАР ЗА МІР

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЫДАТНАГА ФРАНЦУЗСКАГА ПІСЬМЕННІКА АНРЫ БАРБЮСА

Сусветная грамадскасць адзначае 100-годдзе з дня нараджэння выдатнага французскага пісьменніка і грамадскага дзеяча, палымянага публіцыста і змагара супраць імперыялістычных войнаў, вернага друга Савецкага Саюза Анры Барбюса. Яго кнігі «Агонь» і «Яснасць», у якіх ярка і пераканаўча было паказана абуджэнне рэвалюцыйнай свядомасці салдат у першай сусветнай вайне, высока цанілі У. І. Ленін і М. Горкі.

Творчасць Анры Барбюса шырока вядома ў нашай краіне. На Беларусі — упершыню ў Савецкім Саюзе —былі выдадзены яго кнігі «Розныя факты» (1929) і «Расія» (1931). І Анры Барбюс ведаў Беларусь — яго паездкі па Савецкаму Саюзу пачыналіся з Негарэлага і Мінска. Ён не аднойчы сустракаўся з беларускімі пісьменнікамі, сведчаннем чаго засталася адна з яго фатаграфій, падпісаная: «Таварышам і прыяцелям на Беларусі. З братэрскім прывітаннем Анры Барбюс».

Нашу даніну шчырай павагі і любві да цудоўнага пісьменніка і чалавека Анры Барбюса прыносім мы і сёння, у яго соты дзень нараджэння.

Сцяпан ЛІХАДЗІЕЎСКІ

ЛЯ МАГІЛЫ АНРЫ БАРБЮСА

...І перад поглядам
Паўстала
Магіла творцы і байца.
Яму рабочыя Урала
Узнеслі помнік з арляца.
Ад праўды жорсткае,
Нятленнай
Ён меў надзейныя ключы.
Ён той,
Каго таварыш Ленін
«Вялікім голасам» лічыў.
Ён знаў «агонь» у розным сэнсе:
Агонь вінтовак і гармат,
Што сэрцы рве —
З ім толькі стрэнься —
Агонь,
Што скошвае салдат,
Агонь,
Што свет наш зробіць чыстым,
Рэвалюцыйнасці агонь,
Агонь нянавісці к фашыстам,
Агонь нянавісці да войн.
...Ён у Маскве страчае ранне.
Вагон зашмат гасцей сабраў.
Партрэт надпісвае,
Вітанне
На Беларусь ён шле сябрам.
Ён на кангрэсах Камінтэрна
Таварышам жаданым быў.
Хоць смерць абмежавала тэрмін
Яго жыцця і барацьбы,
Ён прыклад пакаленням новым,
Гарэнне — ўсё жыццё яго.
Бушуе ў арляцы вішнёвым
Агонь,
Барбюсаўскі агонь.

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА ПІСЬМЕННІКА

Вечар, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння выдатнага французскага пісьменніка Анры Барбюса адбыўся ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцягу Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Адкрыў яго народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі Іван Мележ.

З дакладам аб жыццёвым і творчым шляху Анры Барбюса выступіў загадчык кафедры зарубежнай літаратуры Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Барыс Міцкевіч.

ЧЭХАСЛАВАКІЯ НАЗЫВАЕ ЛЕПШЫХ СЦЭНАРЫСТАЎ

У чэхаславацкім горадзе Пльзень адбыўся шосты фестываль чэшскіх і славацкіх фільмаў. Журы фестывалю прызнала найлепшымі сцэнарыстамі 1972 года Мілаша Крно і Анатоля Дзялендзіка, фільм якіх «Заўтра будзе позна» дэманструецца на экранах Чэхаславакіі.

РАДАСЦІ І ТУРБОТЫ СТАРШЫНІ КАДЛУБОВІЧА

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.).

таў, — дальбог, свежая, як толькі згатавалі. Цяпер падлічы, колькі ўсяго тая машына сэканоміла. Каб 700 тон бульбы забуртаваць, колькі трэба людскіх рук, колькі саломы! А ўлічы яшчэ, што 10—15 працэнтаў бульбы ў бурце згніе абавязкова, гэта нават норма дазваляе. Летась была ў нас адна такая машына, а нядаўна, бачу, старшыня купіў другую. Думаюць сёлета зварыць паўтары тысячы тон. Ён, старшыня цяперашні, наконт тэхнікі, скажу табе, надта заўзяты.

КОЖНЫ ДЗЕНЬ а сёмай гадзіне вечара ў канторы збіраецца ўсё калгаснае начальства на чале са старшынёй. Удакладняецца, што каму рабіць заўтра, каб з раніцы не бавіць часу на размовы і адразу прыступаць да работы.

На гэты раз, перш чым пачаць нараду, старшыня паведаміў, што ёсць магчымасць купіць польскі аўтакран. Усе ажывіліся.

— Калі добры кран, трэба абавязкова купляць, — сказаў інжынер калгаса Уладзімір Алімпіевіч Васіленка.

У вачах старшыні хітрынка.

— А ведаеш, колькі каштуе машына? Дваццаць тысяч!

— Нічога сабе, — чухае патыліцу інжынер. — Так, відаць, не пойдзе...

— Дарагавата, — падтрымлівае яго нехта са спецыялістаў.

— А мы свой прададзім, — раптам прапануе Леанід Іванавіч, — а новы купім. Дадуць за наш тысяч дзесяць?

— Павінны даць, — згаджаецца інжынер.

— Значыць, купляем, — падводзіць рысу старшыня.

Шчыра кажучы, гэтае рашэнне (абмазгоўвалася яно літаральна дзве мінуты) падалося мне крыху лёгкадумным. Не сотню ж другую рашылі вылажыць — дваццаць тысяч.

Помню ў Мінскім раёне калгас, які па колькасці тэхнікі ў вобласці займаў ледзь не першае месца. І вось, аднойчы, калі пачалі лічыць сабекошт прадукцыі, аказалася, што ў гэтым калгасе ён мала не ўдвая большы, чым у іншых гаспадарках. Што за ліха, столькі машын, а кожны кілаграм бульбы каштуе сабе ўтрыдарага? Потым расчухаліся. Аказалася, што тая ж самая тэхніка гэты сабекошт і падагнала. Ад кожнай машыны ідуць так званыя амартызацыйныя адлічэнні, якія разносяцца на сабекошт прадукцыі. Чым эфектыўней выкарыстоўваецца тэхніка, тым, натуральна, больш прадукцыі і тым ніжэйшы працэнт адлічэння кладзецца на яе. Але ж не ўсе любяць лічыць. А таму старшыні тэхніка была больш для форсу. Як потым даведаліся, купіў ён нават лёнацерабілку, хоць ніколі ў калгасе тым не сеялі ільну.

Расказваю пра гэтую гісторыю Леаніду Іванавічу, расказваю асцярожна, каб не пакрыўдзіць. Ён усміхаецца:

— Нам гэта не пагражае. У калгасе зараз сорак адзін трактар ды паўтара дзесятка аўтамашын, не лічачы іншай тэхнікі, — ледзь не ўдвая больш, чым было пяць гадоў назад. Але думаем яшчэ прыкупіць. Калі б спыталі ў мяне, што дало ў апошнія гады магчымасць узняць сельскую гаспадарку, адказаў бы: у першую чаргу, тэхніка. І за гэта — наша вялікае дзякуй дзяржаве. Хаця лічыць, вядома, трэба. Вунь, калі куплялі машыну для прыгатавання бульбянога корму, той сёй вагаўся, маўляў, працаваць яна будзе толькі два—тры тыдні ў годзе, ці апраўдае грошы? Селі, падлічылі. Аказалася, за два гады машына сябе поўнасцю акупіць. Тое самае і з іншай тэхнікай. Скажам, камбайны для ўборкі цукровых буракоў. Раней жа ўсё рукамі, рукамі. Да снегу ўбіралі. Купілі тры камбайны — вочы адкрыліся. Ну, а пра бульбу і казаць няма чаго. Толькі за кошт механізацыі — а гэта і своечасовая пасадка, догляд, і, галоўнае, уборка — маем прыбаўку ўраджаю цэнтнераў у 40—50 на кожным гектары.

Што і казаць, адметная рыса сённяшняй вёскі — поўнае тэхнічнае пераўзбраенне. Лічба, калі не бачыш увачавідкі, што за ёй стаіць, не ўражвае. Звыклым вокам прабягаем мы газетныя паведамленні пра новыя дзесяткі тысяч трактараў, камбайнаў і іншых машын, выпушчаных айчыннымі заводамі. І толькі тут, у вёсцы, пабачыўшы гэты магутны тэхнічны арсенал у дзеянні, пачынаеш разумець, як многа зроблена ў апошнія гады дзяржавай для сельскай гаспадаркі.

Радуецца старшыня Кадлубовіч вялікім зменам на вёсцы і шчыра рупіцца, каб з кожным днём яны былі яшчэ больш значнымі.

Дзяржынскі раён.

Прэзідыум Цэнтральнага савета Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры выказвае глыбокае спачуванне члену Прэзідыума Цэнтральнага савета таварыства прафесару Чантурыя В. А. у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю маці.

СІМФОНІЯ БАРАЦЬБЫ І ПЕРАМОГІ

На пражскую вясну гэтага года жыватворчы ўплыў аказала святкаванне 25-годдзя Пераможнага Лютага, якое шырока адзначалася па ўсёй Чэхаславакіі. Традыцыйны мітынг на Старамесцкай плошчы, на якім выступіў Л. І. Брэжнеў, яшчэ больш узняў значэнне важнай гістарычнай даты, напоўніў новым сэнсам размах сацыялістычнага будаўніцтва ў ЧССР.

Гэта адчуваеш і сёння на кожным кроку, у прыватнасці, у культурным жыцці краіны. У пяці вялікіх выставачных залах Прагі на працягу доўгага часу працавала выстаўка «Дзеячы выяўленчага мастацтва да 25-годдзя Пераможнага Лютага», у манежы Пражскага Крамля — выстаўка «Мастацтва і сацыялізм», а ў палацы «Гібернаў» — «Перамога народа». Здаецца, сталіца Чэхаславакіі прывітала вясну 1973 года тысячамі фарбаў гэтых мастацкіх выставак. Ды і чэшскае «яро» — вясна — не паскупілася: сонца шчодра разліло цёплыя праменні, запрашаючы мастакоў з атэлье на пленеры. І на Карлавым мосце з'явіліся выстаўленыя на продаж першыя эцюды.

З усіх пражскіх выставак гэтай вясны, бадай, найбольшую ўвагу прыцягвае сваёй незвычайнасцю тая, што ў палацы «У Гібернаў». І задумваешся, ці правільна будзе называць яе выстаўкай? Бо таго, што мы звычайна разумеем пад словам «выстаўка», тут няма. Ні стэндаў, ні фатаграфій, ні дакументаў як асобных экспанатаў. Тут зліліся ў адно і музыка, і малюнак, і святло, і фарбы. І гэта вельмі ўздзейнічае на пачуцці.

Першы паверх. Наведвальнік нібы трапляе ў далёкую гісторыю чалавецтва. Святло і фарбы змяняюцца і змяняюцца. Падзеі за падзеямі, стагоддзі за стагоддзямі. Як само жыццё.

Гучаць рэвалюцыйныя песні, і перад наведвальнікамі разгортваецца панарама барацьбы працоўнага люду за свае правы, за свабоду і шчасце. Музыка даносіцца з усіх куткоў залы, яна то замірае, то імкнецца ўвысь, каб выліцца ў магутны гімн.

Нельга не здзівіцца ўсяму таму, што зроблена творцамі выстаўкі, таму, на што здольна сучасная тэхніка ва ўмелых руках. Самыя разнастайныя сродкі выкарыстаны тут: аўдыявізуальная тэхніка, камбінацыі фарбаў і святла, малюнкаў і гукаў. Ілюстрацыі дэманструюцца адначасова на некалькіх экранах з дапамогай дыяпраектараў, транспарантных эфектаў на пранікальных і паўпранікальных люстрах. Уся гэтая складаная апаратура працуе ў адпаведнасці з адзіным сцэнарыем і падпарадкавана цэнтру кіравання з вылічальнай тэхнікай.

Падаюць троны, народ перамагае... І раптам усталёўваецца цішыня, такая глыбокая, што яе не толькі адчуваеш, а перажываеш... І задумваешся над жыццём, над сваім месцам у шэрагах будаўнікоў сацыялізму. І тады ў цішыню ўліваецца да болю знаёмае «Гэта ёсць наш апошні і рашаючы бой»... Як заклік быць заўсёды на перадавой лініі барацьбы.

Другі паверх — другая частка сімфоніі барацьбы і перамогі. У ёй — спеў міру, прыгажосць кветак, горных схілаў і шырокіх далін, пацалункі маладосці, бестурботнасць дзяцей, іх радасныя твары з непаўторнымі смяшынкамі і спакой мудрай старасці. Гэта і ёсць тая краіна, той «домаў мой», пра які спяваецца ў дзяржаўным гімне Чэхаславакіі.

Фінал музыкі — радасны, на мелодыі Дворжакавых «Славянскіх танцаў», ён падкрэслівае чалавечае шчасце.

Генеральны сакратар ЦК КПЧ Густаў Гусак запісаў у памятнай кнізе: «Цаню працу стваральнікаў гэтай выстаўкі. Я хачу, каб іх уменне, густ і мастацкае пачуццё дапамаглі нашым людзям яшчэ больш даведацца пра сябе і пра сваю перамогу».

Ул. КАЛІНОЎСКІ.

Прага.

«КАМЕННАЯ КВЕТКА»

НА СЦЭНЕ БАЛОНСКАГА ТЭАТРО КАМЮНАЛЕ

Створаны ў XIX стагоддзі балонскі оперны Тэатро Камюнале заваяваў у Італіі шырокую папулярнасць дзякуючы сваім смелым пастаноўкам цяжкіх у выканаўчых адносінах твораў. Яшчэ ў мінулым стагоддзі ўпершыню на італьянскай сцэне опера Вагнера прагучала ў Тэатро Камюнале. У апошнія гады, нягледзячы на асобныя няўдачы, тэатр прыцягвае да сябе ўвагу ўсёй Італіі, выклікаючы часам бурную палеміку, як гэта было, напрыклад, з мінулагодняй пастаноўкай «Атэла».

І вось упершыню ў краіне, як, між іншым, і ва ўсёй Заходняй Еўропе, на сцэне Тэатро Камюнале пастаўлены балет Сяргея Пракоф'ева «Каменная кветка». Пастаноўка гэтага балета, як лічаць спецыялісты, звязана з вялікімі цяжкасцямі і вядомай рызыкай. Аднак рызыка аказалася апраўданай, і поспех спектакля перавысілі ўсе чаканні. Крытыкі асабліва адзначаюць арыгінальную харэаграфію Лорыса Гэя, высокае выканаўчае майстэрства Карлы Фрачы (Гаспадыня Меднай гары), Аніты Кардас (Кацярына) і Джэймса Урбэна (Даніла), а таксама віртуознае суправаджэнне аркестра пад кіраўніцтвам дырыжора Пьерлуіджы Урбіні.

Тэатро Камюнале збіраецца выступіць з балетам Пракоф'ева і ў іншых гарадах Італіі, у тым ліку ў Венецыі і Фларэнцыі.

Пастаноўка балета «Каменная кветка» з'явілася першым крокам на шляху да стварэння ў Балоньі першай у краіне самастойнай балетнай трупы, якая будзе танцаваць толькі ў балетах, а не ў операх.

АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАСКОПКІ Ў ПАРЫЖЫ

«Зямля — гэта кніга для тых, хто ўмее яе чытаць». Гэтыя словы Тэадора Вакера, які ў мінулым стагоддзі на працягу 50 гадоў вёў у Парыжы раскопкі для аднаўлення антычнай тапаграфіі горада, адкрываюць выстаўку «Археалогія ў Парыжы», што праходзіць цяпер у Атэль дэ Віль — будынку гарадскога савета французскай сталіцы.

Шматлікія экспанаты, прадстаўленыя на выстаўцы, — зброя, прылады вытворчасці, прадметы хатняга ўжытку, жалезны і бронзавы посуд, старажытныя ўпрыгожанні і ювелірныя вырабы, вазы, статуэткі — даюць уяўленне аб багацці археалагічных знаходак, зробленых пры раскопках у XIX—XX стагоддзях.

Большасць наведвальнікаў бачаць экспанаты выстаўкі ўпершыню, таму што раней азнаёміцца з гэтымі археалагічнымі калекцыямі, якія, пачынаючы з 1925 года, захоўваліся ў сховішчах, маглі толькі спецыялісты.

Даследаванні Вакера былі працягнуты Камісіяй старога Парыжа, створанай у 1898 годзе, аднак многія археалагічныя адкрыцці былі зроблены пасля 1955 года, калі ў горадзе пачаліся вялікія будаўнічыя і рэканструкцыйныя работы.

На выстаўцы, у прыватнасці, прадстаўлены прадметы, знойдзеныя нядаўна ў час рэканструкцыйных работ, якія праводзіліся ў Люксембургскім садзе, у царкве Сен-Жэрмен-дэ-Прэ, саборы Парыжскай багамацеры, пры ўзвядзенні падземнага гаража на вуліцы Суфло.

Нядаўнія раскопкі, хоць яны не прывялі да такіх значных адкрыццяў, якія былі зроблены ў мінулым стагоддзі, тым не менш далі магчымасць скласці больш поўны малюнак жыцця Парыжа ў галарымскую эпоху, а таксама ў сярэдзіне стагоддзя.

Матэрыялы раскопак былі апублікаваны Камісіяй старога Парыжа, якая выдала таксама першы том археалагічнай карты Парыжа.

24 мая — Дзень балгарскай асветы, культуры і славянскай пісьменнасці. У гэты дзень балгарскі народ аддае даніну пашаны стваральнікам славянскай азбукі і пісьменнасці братам Кірылу і Мяфодзію.

Рыльскі манастыр — адзін з найбольш каштоўных помнікаў балгарскай культуры — пабудаваны ў X стагоддзі. У 1961 годзе манастыр ператвораны ў нацыянальны музей.

Самабытная архітэктура, цудоўныя фрэскі, непаўторная разьба па дрэве — усё гэта робіць Рыльскі манастыр адным з цікавейшых помнікаў балгарскага мастацтва.

На здымку — пакой для гасцей у Рыльскім манастыры, упрыгожаны майстрамі Трэўненскай школы.

Агенцтва «Сафія — прэс».

«КЛУБ ЧАТЫРОХ»

Мікола Ваданосаў

ІХ МОЖНА было бачыць заўсёды, штодня, з сямі гадзін вечара і да позняй ночы ў альтанцы, што пад вішнёвым старой бярозы. Імёны ў іх, як і характары, і знешні выгляд, розныя.

Гардзей — тоўсты мужчына гадоў пад сорак, жартаўнік і весялун — іх галоўны завадатар. У двары яго завуць «Маргуновым». Іван, хударлявы і даўгалыгі, крыху старэйшы за Гардзея, — гэта «Філіпаў». Яшчэ яго завуць Муха-Цвік. Андрэй, бурклівы і вечна незадаволены, досыць яшчэ малады чарнявы мужчына, лічыцца «панам дырэктарам», бо вельмі ж падобны да артыста Мішуліна. І чацвёрты — «Віцын», гэткі ж наіўны, дабрадушны і нездагадлівы, мае гэткую ж, як і ў артыста Віцына, гогалеўскую грыву. Толькі вось імя і прозвішча ў яго неадпаведныя, проста несумяшчальныя, — Апалон Качарга.

Калі ў Гардзея, скажам ёсць свой «Масквіч», то Апалон вечна трасецца на сваім старэнькім матацыкле з даволі пагнутай каляскай.

Жонка яго неяк паскардзілася суседкам:

— Які аболтус выдумаў такое прозвішча і такое імя?!

— Казлы няшчасныя! Ніякай помачы ад іх дома... — вапікнула другая.

Адным словам, жонкі скардзіліся на сваіх мужыкоў. А тыя, гуляючы ў альтанцы ў даміно, часам казалі:

— Харошыя ў нас кабеціны, дружныя, усё, бач, разам збіраюцца, як і мы...

Гаварылі і пацягвалі піва з воблай, якую заўсёды недзе даставаў усемагутны дырэктар магазіна «Маргуноў».

— Наш клуб чатырох, відаць, хутка стане клубам васьмі! — дабрадушна зазначыў «Віцын».

Але ён глыбока памыліўся: кабеціны, нарэшце, згаварыліся і дружнай калонай рушылі да альтанкі. Іх вочы жыхалі маланкамі, а з языкоў, як з гаўбіц, што б'юць прамой наводкай, ляцелі цяжкія снарады:

— Досыць! Нацярпеліся! Самі пасля работы ў магазіны хадзіце, у чарзе пастойце...

Вэрхалу нарабілі, і сябрукам ганьба была на ўвесь двор. Пасля гэткага артналёту «клуб чатырох» закрыўся. Удзень у альтанцы гулялі дзеці, а ўвечары збіраліся даўгагрывыя бэйбусы з гітарамі і да паўночы галёкалі на адной ноце нешта накшталт «...бэй-бэй, гай-ду-дзі-ду-у».

Ды вось неяк Гардзей, сустрэўшы сяброў у магазіне з авоськамі, загадкава сказаў:

— Айда да мяне ў гараж! Пагуляем! Халодненькага піва пап'ем...

У гаражы было ўтульна, гарэла электрычная лямпка, паціху гуў у куце невялікі халадзільнік, уступіўшы ў кватэры месца новаму. Пад самай лямпкай стаялі складны паходны столік і чатыры крэселцы са спінкамі.

— Прашу, падпольшчыкі, пару гадзінак пасядзім! — «Маргуноў» дастаў з халадзільніка чатыры пляшкі піва, залацістую рыбіну. — Ганіце па рублю, каб было на што і заўтра пасядзець... Падпольны «клуб чатырох» аб'яўляю адкрытым!

І яны, гэтыя заядлыя «казлы», зноў павесялелі, ажылі. Грукалі костачкамі, булькалі півам і грызлі воблу. А пасля Гардзей даў усім па пакунку, дзе былі свежанькія кураняты і па кавалку адменнай бараніны. На паліцы, што вісела пры сцяне, быў невялічкі «сейф» — бляшанка з-пад селядцоў, куды Гардзей склаў атрыманыя за прадукты грошы.

— Заўтра пасля работы зайду да цябе, Іван, што скажу — адмаўляйся! Уразумеў?

— А чаму адмаўляцца?

— Не твая справа. І вы — таксама... Уразумелі?

— Так точна! — адказалі разам Іван і Андрэй.

Назаўтра, а шостай гадзіне, як і дамовіліся, Гардзей зайшоў да Івана. Прычыніўшы за сабою дзверы, спытаў з парога:

— Вам свежамарожаныя судакі не трэба?

— На ліха яны нам! — гучна, каб пачула жонка, адказаў Іван.

І тут з кухні, нібы за ёю хто гнаўся, выскачыла Іванава кабеціна.

— Табе вечна нічога не трэба! Ён, бачыце, святым духам жыве, фаршыраванага судака і на зуб не возьме! Вось грошы, вось сумка... — забегала, заспяшалася яна.

— Дык там жа... чарга, — запярэчыў Іван, надзяючы на доўгі нос акуляры і разглядваючы рублі і траячкі, што дала жонка.

— Нічога, пастаіш, ногі не адваляцца...

Такая сцэна адбылася і ў дзвюх другіх кватэрах. Жанчыны былі рады, што іх мужыкі нарэшце пры справе, што яны пачалі даставаць такія прадукты, якіх у магазінах не кожны дзень знойдзеш. Разы два «падпольшчыкі» прыносілі вэнджаных вугроў і асятровы балык, прагуляўшы ў Гардзеевым гаражы чатыры гадзіны і выпіўшы пры гэтым па тры пляшкі піва.

Вось гэта, мабыць, іх і падвяло.

Як раней жанкі залішне сварыліся на сваіх мужыкоў, так цяпер пачалі залішне хваліць іх і выхвалялася перад суседкамі: маўляў, якія яны ў іх паслухмяныя ды лоўкія.

— Добра вам, калі гэны дырэктар магазіна «Маргуноў» кожны дзень на сваім «Масквічы» па чатыры клункі возіць у гараж, — як стрэліла рудая Кацька, жанчына адзінокая, дапытлівая і вострая на язык.

І пайшло... І дайшло да адпаведнай установы. Рэвізія выявіла вялікую нястачу ў «Маргунова» і шмат розных злоўжыванняў на рабоце. Такім сумным быў канец «клуба чатырох».

ВЯСНОВЫ ПЛАГІЯТ

Мал М. КАРАБКО.









Міхась СКРЫПКА

АХВЯРА МАСТАЦТВА

Здароўем я не аварыйны.
Пайшоў на фільм.
На шматсерыйны.
Гадзіну я глядзеў з ахвотай,
Другую — ваяваў з
дрымотай,
На трэцяй нёс свой крыж
у сне,
З чацвёртай — вынеслі мяне.

ПА СВЕТУ ДОБРА ПАХАДЗІЎШЫ...

ТАЛЕНТЫ І ПАКЛОННІКІ

□

Гаспадыня стукае ў пакой кватаранта і абурана пытае:

— Што вы там робіце?

— Нічагусенькі, я проста іграю на скрыпцы.

— Дзякуй богу, — кажа гаспадыня, — а я думала, вы адпілоўваеце ножкі ложка.

□

— Што вы чулі ўчора на канцэрце?

— Многае: Сяргея звольнілі з працы, дачка Задарожных канчаткова выгнала свайго мужа, а Марына стала бабуляй.

□

— Дзе газета?

— Навошта яна вам? Вы ж усё роўна ніколі не чытаеце газет.

— Хацела б даведацца, ці добра быў пастаўлены спектакль, які я ўчора глядзела.

«Літаратура и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

Індэкс 63856 АТ 05754